# ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

Культурна-асветніцкі праект Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў»

Выпуск №2–3 (ліпень)


**Анонс**


Галоўныя літаратурныя падзеі і навіны месяца ..... с. 2
«Што з намі дзеецца?»: артыкул Алеся Рыбака ..... с. 3
«Бібліятэка» «Літаратурнай Беларусі» ..... с. 4
«Фактаслоў»: канферэнцыі, прэзентацыі, прэміі ..... с. 5
Барыс Пятровіч пра сучасны літаратурны працэс ..... с. 6
Новыя вершы Рыгора Барадуліна ..... с. 7
Апавяданне Вінцэся Мудрова ..... с. 8–9
Апавяданне Жаны Капуста ..... с. 10
«Рэспубліка анёлаў»: пераклад паэмы Рамана Лубкіўскага ..... с.11
«Рэакцыя»: чытацкая думка пра кнігі ..... с.12
Гутарка з інакам Мікалаем (паэтам Зьнічом) — пра духоўнасць, уладу і дзяржаву ..... с. 13
«Не допускать употребления»: пра знішчэнне беларускай кнігі ..... с. 14
Навіны з літаратурнага замежжа і «Рэтрадрук» ..... с. 15
Анонсы новых кніг, літакцыя ..... с. 16


ЮБІЛЕІ

# ЗЯМЛЯ І НЕБА ЯКУБА КОЛАСА

**Гісторыяй ім — Янку Купалу і Якубу Коласу — было наканавана стаць спарышамі-блізнятамі, «арлом» і «арэшкам» нацыянальнага літаратурнага медаля, падвойнымі сімваламі нацыянальнага творства. Дзесяцігоддзямі літаратуразнаўства замацоўвала іх у гэтай ролі. Хоць паміж Купалам і Коласам — як паміж агнём і вадой — прамежак не ў адну постаць. Паміж народнымі Купалам і Коласам мог бы ставіцца «народны» Цішка Гартны, маглі б стаяць нацыянальны Вацлаў Ластоўскі ці народны Максім Гарэцкі. Але ў медаля — толькі два бакі. І калі летуценны «арол» Купала прыходзіў і прыходзіць да нас у некалькіх іпастасях («нашаніўскім», «бэнээраўскім», «бэсэсэраўскім»), Колас выглядае арганічным і аднатварым маналітам. Ён — найдасканалае і найтыповае выяўленне нашай нацыянальнай ментальнасці, нашых дасягненняў і хібаў, нашага і першага, і другога Я.**



Якуб Колас (справа) і Янка Купала

Якуб Колас у сусветнай літаратуры займае месца «беларускага Гамера» — стваральніка паэтычнага эпасу, найлепшымі ўзорамі якога сталі паэмы «Новая зямля» і «Сымон-музыка». Але да іх творцу вялі няпростыя, пакручастыя шляхі-дарогі. Нарадзіўся Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч у сям'і малазямельных сялянаў. Культ лесу і кнігі былі першымі, затым — Нясвіжская настаўніцкая семінарыя «на казённы кошт». Пасля расійскамоўных вершаваных спробаў пачаў упарта пісаць па-беларуску — з адчуваннем горкай наканаванасці. «Я перажываў цяжкія горкія хвіліны горкага ўсведамлення, — прызнаваўся ён пазней, — што мае творы не будуць мець ходу і беларуская мова не будзе мець прызнання».

Затым — настаўніцтва на Піншчыне, смерць бацькі. І першы «грамадскі» званок: па просьбе сялянаў склаў петыцыю да пана Скірмунта, пасля чаго губернатар загадаў арыштаваць настаўніка. Абышлося пераводам у іншае месца. А вось настаўніцкай сходкі яму не даравалі. Коласа звольнілі з працы. У ягоным жыцці пачаўся шчымлівы перыяд, які ў будучым праграмаваў паводзіны і ўчынкі песняра.

Жыццё на паўлегальным становішчы адукаванага інтэлігента ў братавай лесніцоўцы, спробы «заваяваць» Вільню, праца ў «Нашай Ніве» і выгнанне, крыўда на жыццёвыя парадкі, на тое, што «Бог няроўна дзеліць», — усё гэта выльецца на старонкі хрэстаматыйнай Коласавай трылогіі «На ростанях». Не лепшага твора пісьменніка, у якім — асабліва ў апошняй кнізе — не толькі ў негатыве паўстае Віленскае адраджэнне, але і ягоныя апосталы: браты Луцкевічы, Ластоўскі…

Тры наступныя гады зняволення ў Мінскім астрозе сталі для маладога Коласа гадамі «старэння» і сталення. Там у затворніка-паэта ўзнікла задума ягоных лепшых тэкстаў: паэм «Новая зямля» і «Сымон-музыка». Дагэтуль у сваіх вершах Колас паэтызаваў беларуса-селяніна, рыфмаваў матывы тугі, суму, жаху перад таямніцамі быцця, звяртаўся да палітсатыры («Мікалаю ІІ», «Канстытуцыя»), абуджаўся гімнамі:

*Я — мужык, а гонар маю,*
*Гнуся, але да пары.*
*Я маўчу, маўчу, трываю,*
*Але скора загукаю:*
*«Стрэльбы, хлопчыкі, бяры!»*

Сваё адрознение ад Купалы Колас-паэт выявіць у вершы «Водгулле», дзе праманіфестуе думку аб тым, што паэт павінен быць рэхам падзей. Паэт жа паводле Купалы — звон, які тыя падзеі прадчувае і прадвяшчае…

Колас-празаік таго часу задавольваўся бытавымі замалёўкамі, адмаўляў прыўзнятае, рамантызаванае, перадаваў характво прастаты і псіхалагічную праўду. І — спляю сябе для большага, асноўнага — сваіх песняў песняў.

А свет раздзіралі войны і рэвалюцыі. Колас «ужываецца» з імі. Жэніцца, у званні прапаршчыка камандуе ротай, працуе…

Вяртанне на радзіму ў 1921 годзе супала ў яго з выхадам кнігі «Казкі жыцця» — кнігі, якую ён дапісваў усё жыццё. Колас знаходзіць такія суадносіны паміж рэальным і казачным, што алегорыі захоўваюць жыццёвую праўдападобнасць. «Казкі жыцця» — гэта Коласаўская мастацкія пропаведзі, якія пасля яго ў беларускім пісьменстве будзе стварваць Васіль Быкаў і называць «Байкамі жыцця».

На Беларусі, прайшоўшы выпрабавальныя лёсавыя кругі, Колас завершыць «Новую зямлю» і «Сымона-музыку». Дзве сістэмы касмічных каардынатаў укрыжаваліся ў гэтых творах: гарызанталь і вертыкаль, вектар быцця (цела, зямля) і вектар духу (душа, неба).

Колас-рэаліст і Колас-рамантык арганічна паядналіся ў гэтых паэмах. Уся Беларусь — са сваімі бедамі, радасцямі, песнямі, настроямі, думкамі, марамі — увекавечана ў «Новай зямлі», — «старым запавеце» нацыянальнага літаратурнага летапісу. Якраз біблейскасці Коласа ў «Новай зямлі» аніяк не хацела заўважаць савецкае літаратуразнаўства. Не магло яно зразумець і Коласавага «новага запавету» — «Сымона-музыку». «Зямны» Колас дасягнуў свайго неба. Як і «Новая зямля», «Сымон-музыка» надзіва аўтабіяграфічная рэч. Але тая аўтабіяграфічнасць — рамантычная, сімвалічная. Біяграфічнасць, якая і па сёння даспеўваецца нашымі паэтамі (згадайма паэмы Уладзіміра Някляева «Прошча» і «Паланэз»). Праблемы таленту і ўлады, асобы і сацыяльнага асяроддзя на генетычным узроўні закадаваныя ў беларускай паэзіі — на вечнасць уперад.

*Гудам-звонам срэбна-медным*
*Звоняць звоны на званіцы.*
*Звоняць звоны ў час дзянніцы,*
*Надвячэр'ем ясна-бледным*
*Звоняць звоны галасныя…*
*Брацце мае, беларусы!*
*Ў страшнай кнізе людскіх спраў*
*Мусіць, сам Бог для спакусы*
*Гэты край наш адзначаў…*
*Тут на нашых станавішчах*
*Польшча білася й Літва,*
*Каб на гэтых пажарышчах*
*Узмацнялася Масква…*
*Родны край, ты разарваны,*
*Паабапал ад мяжы*
*Лях ліхі, Маскаль паганы*
*Моцна сцягваюць гужы…*
*Дык хіба ж мы праў не маем,*
*Сілы — шлях свой адзначаць*
*І сваім уласным краем*
*Край свой родны называць?*

А пасля «Новай зямлі» і «Сымона-музыкі» (з якой папярэднія цытаты, частка з якіх цэнзурай перароблена і ў сённяшніх школьных выданнях) Коласу ўжо заставалася адно — проста быць. Быць літаратурным патрыярхам, быць у адной асобе і Коласам, і Купалам (пасля смерці апошняга), гадаваць дзяцей і ўнукаў, прадстаўляць краіну-Беларусь, заступацца і асцерагацца. На ягоных вачах бальшавіцкай уладай знішчаліся цэлыя літаратурныя пакаленні, нявоіліся і расстрэльваліся ягоныя сябры. Ён дапамагаў, чым мог, а не мог, шчыра ў тым прызнаваўся (да прыкладу, так у адным з лістоў і паведаміў вязню-драматургу Францішку Аляхновічу: не пішы мне болей).

Ён закрываўся ў сваім менскім доме і ў бязбожнае ліхалецце іграў на скрыпцы ды прачула спяваў біблейскія псалмы. А пасля гэтага мог паставіць подпіс пад некім падрыхтаваным для яго тэкстам — банальнай агіткай ці паклонам партыі.

Такім ён бачыцца і праз 125 гадоў ад свайго нараджэння: зернейкам ад зернейка, крывёю з крыві, косткай з косці тысячагадовага беларуса. І поўная разгадка Коласа — наперадзе. У нашай адвечнай мастацкай спрэчцы паміж «каласкамі» і «васількамі» ён, нібыта, цалкам за першых. Аднак колас — гэта ж таксама кветка…

**Алесь Пашкевіч**

## МЕСЯЦАСЛОЎ

### НЕЗАЛЕЖНАСЦІ МЕСЯЦА

Сучасны ліпень распачынаўся Днямі незалежнасцяў: Беларусі, ЗША, Летувы. 3-га маршыравалі-гулялі-спявалі-таньчылі беларуская сталіца ды абласныя гарады. 4-га ў Раўбічах у рэзідэнцыі амбасадаркі ЗША Карэн Сцюарт адбыўся ўрачысты прыём (на якім не выступіў ніводзін чыноўнік з МЗС РБ і дзе таксама гучаў дзяржаўны гімн). 6-га ў Летуве адзначаўся Дзень дзяржавы, звязаны з каранацыяй вялікага князя Міндоўга. У гэты дзень у 1253 годзе ў сваёй рэзідэнцыі ў беларускім Навагрудку (тагачаснай сталіцы Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага) Міндоўг прымаў тытул караля. 10 ліпеня 1994 года Аляксандр Лукашэнка быў абраны прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. 27 ліпеня 1990 года Вярхоўны Савет прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце Рэспублікі Беларусь. Гэты дзень адзначаецца з мінімальным размахам.

Кароль ад караля, як і незалежнасць ад незалежнасці, розняцца...

### ЛІТДЭСАНТ МЕСЯЦА

1 ліпеня ў чэшскім Брно пачаўся VIII фестываль «Месяц аўтарскага чытання». Яго ганаровымі замежнымі гасцямі сталі беларускія літаратары. Штодня цэлы ліпень на сцэне тэатра «Husa na provázku» («Гусь на канаце») адбываліся літаратурныя чэшска-беларускія сустрэчы. З 60 аўтараў 30 былі запрошаныя з Беларусі і Беласточчыны: Уладзімер Арлоў, Алесь Разанаў, Уладзімір Някляеў, Леанід Дранько-Майсюк, Пятро Васючэнка, Ігар Бабкоў, Барыс Пятровіч, Андрэй Хадановіч, Альгерд Бахарэвіч, Андрэй Курэйчык, Ільля Сін, Вольга Гапеева, Джэці, Віктар Жыбуль, Надзея Артымовіч, Міра Лукша, Міхась Андрасюк, Макс Шчур, Аляксандар Лукашук, Ян Максімюк, Сяргей Абламейка, Лявон Вольскі, Віктар Шалкевіч....

Сярод чэшскіх удзельнікаў былі Яхім Топал, Міхал Вівэг, Віёла Фішарава, Арношт Голдфлам, Павал Когаўт, Марцін Райнэр, Богдан Трояк і інш.

### «ДЫВЕРСІІ» МЕСЯЦА

5 ліпеня ў вялікай канцэртнай зале Белдзяржфілармоніі адбыліся «Дыверсіі ў класіку»: унікальнае злучэнне смелай і арыгінальнай інтэрпрэтацыі фартэпіяннай класікі з нечаканымі, парадаксальна скла- дзенымікантрапунктамі... Музычная вечарына была прымеркаваная да 15-годдзя дыпламатычных стасункаў паміж Літоўскай Рэспублікай і Рэспублікай Беларусь. Выступоўцамі сталі лаўрэат Нацыянальнай прэміі Летувы Пятрас Генюшас (фартэпіяна) і легенда джазавай музыкі Уладзімір Чэкасін.

### ПРЭЗЕНТАЦЫЯ МЕСЯЦА

6 ліпеня у Мінску ў Беларускім ПЭН-цэнтры адбылася прэзэнтацыя паэтычнай кнігі Зьніча (Алега Бембеля) «За мурам». Новая кніга паэта — погляд інака на свецкае і рэлігійнае жыццё. Гучалі вершы ў аўтарскім выкананні, спяваў бард Андрэй Мельнікаў. «У Жыровічах абсалютна ўсе размаўляюць са мной па-беларуску, — прызнаўся Зьніч (інак Мікалай). — Духавенства вельмі добра ставіцца да беларускай мовы. Калі зайшла гаворка пра выданне гэтай кнігі, то яны дапамаглі ўсім, чым маглі».

Напрыканцы паэт-манах заклікаў прысутных прыехаць да яго ў Жыровічы.

### ЦЫТАТА МЕСЯЦА

Кіраўнік Беларусі Аляксандр Лукашэнка 7 ліпеня павіншаваў суайчыннікаў са знамянальнай датай — 125-годдзем з дня нараджэння народнага паэта краіны Янкі Купалы. «Сённяшняя суверэнная Беларусь з высокім узроўнем эканамічнага, навуковага і культурнага развіцця з'яўляецца ўвасабленнем мар вялікага песняра, — адзначыў у віншаванні А. Лукашэнка. — Няхай і ў далейшым творчая спадчына Янкі Купалы будзе для нас прыкладам сапраўднага патрыятызму і самаадданага служэння Радзіме».

Мары вялікага песняра ўвасобіліся? А як жа з Купалавай мовай, свабодай, гімнамі, сімваламі?..

### ДЗЯРЖПОСТМАДЭРН МЕСЯЦА

**У распушчанай прэзідэнтам Украіны Вярхоўнай Радзе быў зарэгістраваны, паведаміла «proUA», праект закона «Аб Дзяржаўным Сцягу Украіны».**

Некаторыя парламентарыі прапанавалі змяніць размяшчэнне колераў на Дзяржаўным Сцягу, бо менавіта жоўта-блакітная каларыстыка, паводле іх і іхніх спасылак на кітайскія (?!) вучэнні, трактуецца як прагрэсуючы ўпадак, няшчасце: сіні колер, маўляў, сімвалізуе Неба, а жоўты — Зямлю). «Супрацьлеглае размяшчэнне гэтых колераў уседамляецца як найбольш гарманічнае спалучэнне Неба і Зямлі, мужчынскага і жаночага пачаткаў і мае супрацьлеглае трактаванне — шчасце. Адсюль вынікае, што ў светаўспрыманні больш чым аднаго мільярда насельніцтва Зямлі ўзняты над Украінай жоўта-блакітны сцяг, вобразна гаворачы, пазначае тое месца на планеце, дзе людзі абвесцілі панаванне «Закона Упадку», — гаворыцца ў тлумачальнай запісцы да згаданага законапраекта.

Праектам Закона прапануецца зацвердзіць Дзяржаўны Сцяг Украіны, які сімвалізуе пазітыўныя памкненні краіны, а менавіта: размяшчэнне жоўтай стужкі ў верхняй частцы сцягу, блакітнай — у ніжняй.

Са змены «з ног на галаву» нацыянальнай сімволікі пачынаўся росквіт і сучаснай Беларусі...

## ЛІТНАВІНЫ

# БЕРАСЦЕЙШЧЫНА ЛІТАРАТУРНАЯ

**Пасведчанне аб рэгістрацыі арганізацыйнай структуры грамадскага аб'яднання атрымала Брэсцкае аддзяленне Саюза беларускіх пісьменнікаў (налічвае 23 пісьменнікі).**

23 чэрвеня 2007 г. у Брэсце адбылося чарговае паседжанне абласной філіі СБП, на якой абмяркоўваліся праблемы і клопаты творчай суполкі. Да ўступлення ў шэрагі СБП былі рэкамендаваны Аляксей Белы і Кастусь Жмінько.

Днямі выйшаў з друку сумесны бюлетэнь творчага інтэлектуальнага клуба «Муза» і Брэсцкага аддзялення Саюза беларускіх пісьменнікаў «Выток».



Брэсцкае аддзяленне СБП на сустрэчы ў Белаазёрску

# ДЛЯ ТЫХ, ХТО ЛЮБІЦЬ ВУШАМІ

Цягам трох дзён — з 27 па 29 чэрвеня — у фальварку «Добрыя мыслі» адбывалася прэзентацыя мультымедыйнага дыску «Начная чытанка», выдадзенага «Радыё Свабода».

У складанцы — рэчы на любы густ і розных жанраў. Да прыкладу, Лявон Вольскі і Адам Глобус чыталі свае казкі, Віктар Шалкевіч — мініп'есы, Альгерд Бахарэвіч, Ева Вежнавец і Югася Каляда — апавяданні. Ёсць таксама і пераклады — Сяржук Мядзведзеў чытаў урыўкі з пакуль што не надрукаванай па-беларуску кнігі амерыканца Чака Паланюка «Байцоўскі клуб», Вераніка Бялькoвіч — з першай кнігі серыі сучаснай чэшскай літаратуры раману Ганы Андранікавай «Гук сонечнага гадзінніка».

А найбольш у «Начной чытанцы» паэзіі: свае вершы чыталі паэты розных пакаленняў. Сярод іх Рыгор Барадулін, Уладзімір Някляеў, Алесь Разанаў, Міхал Анемпадыстаў, Віктар Жыбуль, Вольга Гапеева, Вальжына Морт, Сяргей Прылуцкі, Джэці, Анатоль Івашчанка, Андрэй Хадановіч.

Для тых, хто не патрапіў у першы зборнік, абяцаецца працяг.

# МАЕМ ДОБРУЮ НАВІНУ

**Шаноўныя сябры! Маем добрую навіну: Берасцейская філія Саюза беларускіх пісьменнікаў паспяхова перарэгістравана, што засведчана афіцыйным дакументам і змацавана адпаведнай пячаткай Брэсцкага аблвыканкаму.**

Віншуем! Чыноўнікаў: ім хапіла здаровага сэнсу і мудрай развагі больш не ствараць праблемаў на пустым месцы. Кіраўнікоў навучальных, культурна-асветніцкіх устаноў ды прадпрыемстваў: яны могуць ужо не баяцца запрашаць нас дзеля ўдзелу ў афіцыйных культурніцкіх мерапрыемствах і зычліва спрыяць у наладзе аўтарскіх літаратурных чытанняў. Кожнага берасцейскага літаратара, хто ў зламысную пару змусовага расколу яшчэ нядаўна адзінай пісьменніцкай арганізацыі адмовіўся «жертвовать лицом ради положения» (Барыс Пастарнак) і працягвае з годнасцю слугаваць духоўным ідэалам беларускага народу.

Творчай інтэлігенцыі даўно ўжо вельмі няпроста і жыць, і працаваць: дзяржава адхіснулася ад нас. Гісторыя ж чалавецтва, як і ўласна шматвяковая гісторыя Беларусі, сведчыць: там, дзе вычэрпваецца святло, гусцее цемра, і туды, скуль выцясняецца Бог, прыходзіць д'ябал. Найактыўней процістаць гэтаму, нароўні са святарамі, могуць хіба толькі пісьменнікі («напачатку было Слова!»): верай у вяршэнства Любові, самаахвярным творчым духам і непадкупным сумленнем. Вось чаму праўдзівае, вольнае слова павінна мець як мага шырэйшы розгалас падупаданым усякім разбуральным спакусам грамадстве. Аднак... Нашая мара наладзіць сталы выпуск уласнай літаратурнай газеты пакуль так і застаецца прывіднай марай: няма грошай. Дасць Бог, можа, калі-небудзь хто-небудзь і падасць нам руку дапамогі. А пакуль — шчыра падзякуйма лунінецкай «Музе» за прапанову супрацоўніцтва і пагуртуймася вакол гэтага сціплага самвыдатнага бюлетэня. Дасылайма сюды, з улікам плошчы, свае творы — вершы, нататкі, замалёўкі, кароткія эсэйкі. І, канешне, інфармацыю пра цікавыя кніжныя навінкі, пра свае сустрэчы з чытачамі. Разгортвайма далей гісторыю нашага творчага «берасцейскага вогнішча», як пра тое рупіўся незабыўны Уладзімір Андрэевіч Калеснік.

**Ніна МАЦЯШ,**
**старшыня Брэсцкага аддзялення Саюза беларускіх пісьменнікаў**

**АД РЭДАКЦЫІ.** Правялебная спадарыня Ніна, дарагія літаратары Берасцейшчыны! Шчыра віншуем усіх вас з тым, што вы годна прадстаўляеце нацыянальную творчасць, яе традыцыі і сучаснасць. Мы радуемся, што мы ўсе — разам, і нас — не адолець!

Мара наладзіць сталы выпуск уласнай літаратурнай газеты, пра якую згадвае спадарыня Ніна ў сваім кранальна-сардэчным звароце, ажыццяўляецца. «Літаратурная Беларусь» — наш супольны праект. Будзем ствараць яго разам!

# АДКРЫЦЦЁ САКРАТА

**У беларускай дыяспары разгарэўся скандал.**

Адзін з лідэраў беларускай нацыянальнай меншасці ў Польшчы пісьменнік, публіцыст і выдавец (тры гады таму прэзідэнт Польшчы ўручыў яму прэстыжную міжнародную літпрэмію)




Сакрат Яновіч у люстрацыйнай анкеце прызнаўся, што ў 1958–1970 гадах быў супрацоўнікам польскай службы бяспекі (тамтэйшае КДБ). Па сведчанні пісьменніка, ён вёў назіранне за супрацоўнікамі беларускага штотыднёвіка «Ніва» і членамі Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Польшчы. Сакрат Яновіч сцвярджае, што рабіў усё магчымае, толькі б спецслужбы адчапіліся ад яго, і не браў за «працу» грошай...

**БОЛЬ**

# ШТО З НАМІ ДЗЕЕЦЦА?

**Алесь РЫБАК**

*Не прабачаюць здраду нашы зоркі.*
*Ніна Мацяш*



Класікаў і сучаснікаў нацыянальнай літаратуры выганяюць з Дома літаратара. Мінск, лета 2006 г.



Я часта думаю пра свой лёс, лёс калегаў па пяры. І калі начамі не спіцца (не ведаю, старасць таму прычына ці сённяшнія рэаліі так даймаюць), да спазмаў у горле гняце клопат, як быць творчаму чалавеку ва ўмовах дзікага наскоку на ўсё святое, чым жыў не адно дзесяцігоддзе. Гэтым святым для мяне было і, пакуль яшчэ дыхаю, застаецца літаратура і служэнне ёй. А з пісьменнікамі, творцамі літаратуры, маладымі ці досыць ужо сталымі, Бог ведае што сёння дзеецца. Перш за ўсё маю на ўвазе тых, хто не вытрымаў прэсінгу ўладаў і ці застаўся ў чаканні лепшых, шчаслівейшых дзён для сваёй творчасці, ці, яшчэ горш, падаўся ў прочкі, г. зн. пайшоў служыць парабкам за тую ці іншую падачку ад пана. Панам тым з'яўляецца новаствораны саюз-клон, які адабраў ад ранейшага Саюза спрадвечны яго назоў, паспрыяў у пазбаўленні ягонай маёмасці, карацей кажучы, пусціў па ветры. І рабілася гэтае беззаконне рукамі ці патураннем, цынічным, з самазадаволенай ухмылкай «А ту іх» тых, хто яшчэ нядаўна лісліва стаяў перад Броўкам, Танкам, Шамякіным, стаяў перад Радай Саюза пісьменнікаў, абранай з лепшых прадстаўнікоў творчай арганізацыі, і кляўся сумленна служыць літаратуры, быць праўдзівым і справядлівым. І яго прымалі ў суполку пабрацімаў, робячы скідку на нярэдкую і відочную часам слабіну ягоных літаратурных памкненняў. І ужо ў гэты ці на наступны дзень ён, новаспечаны член, на законных падставах нёс другую заяву, каб яго зафіксавалі ў дакументах як сябра Літаратурнага фонду з усімі вынікаючымі адсюль наступствамі: правам на кватэру, набыццё машыны, таннай пуцёўкі ў Дом творчасці, на хутчэйшае прасоўванне ў друк сваёй прадукцыі.

Я пішу гэтыя радкі з чыстым сумленнем адносна сябе: ніякіх з пералічаных даброт я не скарыстаў, хоць працаваў у апараце Саюза пісьменнікаў сем гадоў з ранку да позняга вечара. Калі ж адыходзіў на рэдактарскую пасаду ў выдавецтва «Мастацкая літаратура», многія ўдовы памерлых пісьменнікаў групкай прыйшлі ў Дом літаратара і па-свойму дзячылі мне за клопат пра іх слязамі шкадавання, а адна з іх падпісала на двухтомніку мужа не толькі маё прозвішча з вялікай літары, але і слова чалавек. І гэта было для мяне самай высокай ацэнкай.

Зараз многія, хтоў тыя гады наведваў Саюз пісьменнікаў толькі дзеля таго, каб парагатаць ці так памянціць языкамі, гэтай лайдацкай звычкі не пазбавіліся і сёння. Пры сустрэчы адзін з адным, сытна ікаючы, разважаюць: «Ат, што яны, штатнікі тыя, рабілі? Балаўство адно...» І не бачылі ці не хацелі бачыць, што ў Доме літаратара, які падпарадкоўваўся Саюзу пісьменнікаў, няспынна, зімой і ўлетку, віравала жыццё, праводзіліся сотні розных мерапрыемстваў мясцовага і ўсесаюзнага маштабу, працавалі секцыі, абмяркоўвалася творчасць маладых празаікаў і паэтаў, арганізоўваліся паездкі пісьменнікаў на выступы ў калектывах працоўных, пісаліся віншавальныя адрасы юбілярам і пісьмы-хадайніцтвы аб іх узнагароджанні... Карацей кажучы, не было продыху ад працы. А яшчэ ж па покліку душы хацелася і пісаць сваё, на што вельмі і вельмі не ставала часу.

Сёння ў Доме літаратара (хаця які гэта Дом літаратара, хутчэй я назваў бы нядаўна святы для нас будынак, які ўзводзіўся для пісьменнікаў, домам бессаромных пагулянак усялякай чыноўнай і іншай грашовай публікі), дык вось у гэтым доме зараз рэдка калі ступае нага творцы. Нас выжылі з нашае хаты, не даўшы нічога ўзамен, выжылі нахрапіста і цынічна, нават не дазволілі захаваць мемарыяльны кабінет Максіма Танка. З гэтага кабінета партрэты Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, іншых класікаў беларускай літаратуры выносілі, як на пахаванні, толькі не на цырымонію развітання з нябожчыкам, а ў халодныя і змрочныя сутарэнні падвалаў (з якіх у хуткім часе іх таксама выгналі).

А бібліятэка, з сотнямі аўтографаў самых славутых пісьменнікаў не толькі Беларусі, але і ўсяго былога Савецкага Саюза, іншых краінаў свету. Такой бібліятэкай магла б ганарыцца любая цывілізаваная нацыя. Улады змусілі яе раскурочыць, каб вызваліць плошчу ўсё для тых жа пагулянак, на якіх можна зарабляць немалыя грошы. Не вызвалілі б, дык тысячы каштоўных тамоў трапілі б на сметнік.

Вы, члены іншай «клонавай» суполкі, прыйшлі ў тыя маркотныя хвіліны ў Дом літаратара, запалалі праведным гневам супраць такога кашчунства? Не, ніводзін з вас не паказаў носа, нібы ўсё гэта вас не тычылася. Божа праведны, няўжо так астылі вашыя сэрцы, а на вочы апусцілася імгла? А многія з вас быццам і неблагія людзі, і прыстойныя пісьменнікі. Але я, ведаючы ўсё гэта, зараз не паверу ніводнаму вашаму радку, дзе гаворыцца пра справядлівасць, чуласць, любоў да чалавека. Думаю, калі-небудзь адвернуцца ад вашых няшчырых твораў і чытачы, якія любяць беларушчыну і дзеля яе гатовыя нават ісці за краты. Ці знойдзецца сярод вас хто такі смелы і справядлівы і скажа вашаму куміру, уладальніку «залатога пяра», які і гаварыць саромеецца, а мо і не ўмее, па-беларуску: «Што ж вы, шаноўны і ўладалюбівы, робіце з нашымі калегамі па пяры? Апамніцеся, пакуль не позна! А не, дык мы пакідаем вас». Упэўнены, наўрад ці хто скажа такое свайму шэфу. Многія найперш думалі, як бы лаўчэй уладкаваць свой быт, прасунуцца ў кар'еры, таксама стаць уладальнікам «залатога пяра». (На здароўе, як кажуць, калі яно сапраўды залатое, а не з іржавай жалязякі.) тады, маўляў, маё карытца будзе з беражкамі.

Я зусім не супраць іншага саюза, іншага стылю працы, іншых ідэалагічных догмаў. Кожнаму, як кажуць, сваё. Але быць чалавекам чулым і справядлівым, спачуваць чужой бядзе, – ці не ў гэтым прызванне пісьменніка, калі ён лічыць сябе сапраўдным. Аднак пра якія спачуванне і чуласць можна казаць?

Мяне да глыбіні душы ўразіла і здзівіла, што нават на пахаванне народнага пісьменніка Беларусі, усімі бясконца любімага намі Янкі Брыля прыйшлі лічаныя члены новастворанага саюза. Ды і тыя, што трапілі на жалобу, неяк туліліся па завуголлі, некага ці то баючыся (бронь бог калі ўбачаць і данясуць каму трэба, што ты быў на пахаванні «няправільнага» пісьменніка, «уладара чалавечых дум», – развітацца з класікам не прыйшоў аніводзін дзяржаўны чыноўнік!), ці то саромеліся апошні раз глянуць яму ў твар, сустрэцца позіркам з многімі сваімі былымі паплечнікамі-саратнікамі па літаратурнай справе. А яны ж, «клонаўцы», многія з іх, вучыліся ў Янкі Брыля майстэрству (ці навучыліся, не бяруся меркаваць, а вось брылёўскай чуласці, сардэчнасці, урэшце, грамадзянскасці не перанялі ад яго ні на макавае зернетка), пісалі па ягонай творчасці навуковыя працы, зараблялі званні і грошы.

Забыліся гэтыя людзі Бога. Але хай ён ім даруе. Толькі ці даруе ім гісторыя, урокаў якой яны не спасціглі і, аслепленыя часовым сваім «трыумфам», не хочуць вучыцца? Сёння многія з тых, хто пайшоў ці збіраецца ісці ў новы саюз, слёзна апраўдваюцца, што, маўляў, ім на шыі ледзьве не пельку зацягвалі, пагражалі выкінуць з выдавецкага плана, выкрэсліць з тэатральных афішаў такое дарагое іх воку і слыху іхняе прозвішча, не працягнуць кантракту на працу, хоць чалавек той даўно пенсійнага ўзросту...

Яно і праўда, ізуверскіх метадаў уздзеяння на хісткія душы ва ўладаў больш чым дастаткова. Але ж бальшыню, самую свядомую і таленавітую бальшыню, на сённяшні дзень 550 членаў «старога» Саюза беларускіх пісьменнікаў, не зламалі, не запалохалі ніякія рэпрэсіўныя меры. Вядома ж, гэтым «няправільным» пісьменнікам таксама хочацца і працаваць дзе-небудзь, карміць сябе і сям'ю, і выдавацца, і рухацца ўверх па службовай лесвіцы. Невыносна цяжка ім, абкладзеным чырвонымі сцяжкамі. Але яны трываюць і будуць трываць, чаго б гэта ім ні каштавала. На здзелку са сваім сумленнем яны не пойдуць.

У нечалавечых умовах, без аніякага памяшкання, без капейкі грошай, на адным толькі энтузіязме і веры ў праўду працуе сёння Саюз беларускіх пісьменнікаў. Яго душаць штрафамі, судамі, закідваюць паперамі з новымі і новымі пагрозамі, ён адбіваецца ад шматлікіх санкцый з боку суровых уладаў. Але і ў такіх дзікіх варунках ён не падае духам, трымаецца і дзейнічае, плануе сваю працу на сённяшні дзень і на бліжэйшую перспектыву, праводзіць вечарыны і сустрэчы, займаецца кнігавыданнем, арганізоўвае працу секцый, ладзіць сустрэчы ў розных калектывах рэспублікі, прымае ў свае шэрагі новых і новых сяброў. А тых, хто жадае стаць членам нашай творчай арганізацыі, больш чым дастаткова. Вось толькі нядаўна Рада Саюза беларускіх пісьменнікаў ухваліла, пасля папярэдняга разгляду на секцыях і ў прыёмнай камісіі, чатырнаццаць членаў нашай пісьменніцкай суполкі, у кожнага з якіх за плячыма цікавы і творчы, і жыццёвы багаж. А на чарзе – новыя і новыя кандыдатуры творцаў, якія жадаюць уступіць у саюз пісьменнікаў не дзеля ўласнай выгады, а каб служыць літаратуры і свайму люду.

**Чэрвень 2007 г.**

▸ РЭЦЭНЗІЯ

# ШЭДЭЎР ПРОСІЦЬ ПЕРАКЛАДУ ШЭДЭЎРАЛЬНАГА

**Якуб Колас. Нова земля: Поема / Пер. з білорус. В. Стрілка; Передм. А. Вертинського; Післямова, комент. Я. Янушкевича. — Київ: Український письменник, 2006. — 302 с.**




Прэамбулы да майго асноўнага сцвярджэння не будзе, і вось яно — маё асноўнае сцвярджэнне: з'яўленне ў Украіне перакладу паэмы Якуба Коласа «Новая зямля», учыненага Валерыем Стралком, — падзея з прыемных, значных, вялікіх, падзея не толькі ў Украіне і ў нашай Беларусі, бо несумненна ўсеславянскага маштабу. Вядома, веліч твора найперш абумоўлівае веліч яго перакладу, як і значэнне арыгінала яго значэнне абумоўлівае. Усеславянскасць жа маштабу мастацкага перакладу В. Стралка звязаная яшчэ і з тым, што ён сваім вельмі высокім узроўнем стане зіхоткай з'явай у сям'і перакладаў паэмы Якуба Коласа на расійскую і польскую мовы. Нас усцешваў нядаўні пераклад яе на польскую Чэславам Сенюхам, і як бы з ім напару пайшоў пераклад украінскі, які не выпадкова выйшаў з-пад пяра В. Стралка — не навічка ў мастацкім перакладзе. У цэлым увогуле сённяшні поспех у перакладзе Коласавай паэмы не толькі ад вопытнасці В. Стралка, мэтанакіраванасці, працавітасці, але і ў залежнасці ад высокай культуры ўкраінскай перакладчыцкай школы, нацыянальнага ўкраінскага перакладу. I тут, не вельмі апошнюю дужку разгортваючы, давайце ўспомнім адно пераклад «Пана Тадэвуша» Адама Міцкевіча Максіма Рыльскага, пераклад Максіма Багдановіча Рамана Лубкіўскага.

Пераклад «Новай зямлі» выйшаў напрыканцы мінулага года ў Кіеве, у выдавецтве «Украінскі пісьменнік». Мушу сказаць, што ўражвае само яго выданне, афармленне кнігі перакладу. Хораша гучыць прадмова да яго Анатоля Вярцінскага, звернутая да шаноўнага ўкраінскага чытача, з вымоўнаю назвай «Новае жыццё «Новай зямлі»». Пераклад яе В. Стралка сапраўды даў Коласавай паэме новае жыццё. Несумненна ўспрыманню перакладу ўкраінскім чытачом дапаможа і сціслы «Каментарый» да яго Язэпа Янушкевіча, як і ягонае ж пасляслоўе «Рапсодыя беларускай зямлі», як і заўвагі самога перакладчыка, дадзеныя ў канцы кнігі. Загаловак жа пасляслоўя Я. Янушкевіча асабліва шматзначны тым, што роўна адносіцца як да самой паэмы Якуба Коласа, так і да яе перакладу В. Стралка, які з поспехам перадае само настраёвае гучанне, саму музыку верша, якім «Новая зямля» беларускім народным песняром напісаная.

Чым жа вымяраецца культура перакладу? Можа, перш за ўсё менавіта перадачай прасодыі арыгінала як адной з асноўных ягоных рысаў. Каб пераканацца ў чуйнасці перакладчыка да Коласаўскіх тону, настрою, музыкі, думаецца, хопіць пачуць украінскае гучанне так шырока ў нашым народзе вядомага зачыну паэмы: «Мой родны кут, як ты мне мілы…»

*Мій куте рідний, серцю милий!..*
*Тебе забуть не маю сили!..*
*Частенько, втомлений шляхами,*
*Весни убогої літами,*
*В думках до тебе запливаю*
*І там душею спочиваю…*

Эквіліярнасць — яна таксама адзін з найпершых крытэрыяў перакладу, які, вядома, крута абавязвае паэзію малых формаў: трыялет — трыялет: восем радкоў; санет — санет: чатырнаццаць радкоў. Пераклады буйных паэтычных формаў больш вольныя ў эквіліярнасці. Успомнім, што, напрыклад, пераклад паэмы «Пан Тадэвуш» Язэпа Семяжона быў з нарошчваннем яе радкоў, больш, чым на тысячу, і гэта — сам перакладчык тлумачыў — рабілася ім свядома: дзеля захавання паўнаты жывапіснасці арыгінала. З іншым Якуб Колас сутыкнуўся, калі ягоную «Новую зямлю» на расійскую мову перакладаў Я. Гарадзецкі: больш тысячы радкоў паэмы ім было апушчана па прычыне нібы іх непаэтычнасці. Пераклад жа «Новай зямлі» В. Стралко — пераклад радок у радок, і гэта несумненна заслуга перакладчыка. Можна, канешне, знайсці ў яго дзе-што крышку неўпапад, як, напрыклад, радок пра блінцы, у якім Міхалавы дзеці «хоць геаметрыі не зналі, іх на квадраты разразалі». У перакладзе дзеці не рэжуць аладкі на квадраты, а рвуць іх. Рваць на квадраты, канешне, — не вельмі парвеш, але вось гэткія «зрывы» ў перакладзе вельмі, вельмі рэдкія… Дух Якуба Коласа, яго маляўнічасць пануе спрэс!..

I што яны пануюць, на гэта ёсць прычыны, і, пэўна, найпершая — роднасць, блізкасць моваў — беларускай і ўкраінскай. Поспех В. Стралка чакаў і дзякуючы гэтай блізкасці — асабліва ў дзеясloўным свеце, у дзеясловах, якія як у беларускай, так і ва ўкраінскай мовах адначасова маляўніча-эмацыйныя, жывапісна-экспрэсіўныя. Расійскі глагол, залежны ад царкоўна-славянскай кніжнасці, такой інварыянтнасці дзеяслова, звязанай з экспрэсіўнай выразнасцю, не мае. I, пэўна, таму ў расійскіх перакладчыкаў стыль, прасодыя «Новай зямлі» не так ажывалі, як яны жывуць у перакладзе ўкраінскай мовай. I каб быць тут больш зразуметым, прывяду некалькі прыкладаў:

*Межи двох лав під образами*
*Тулився стіл…*
*І ополоник час від часу*
*В ній бовтав тісто і щоразу*
*Шпурляв того на сковородку.*
*— Сідай, Язепе! — Хай сідають,*
*А я приткнуся потім скраю…*

Як бачым, і ў Якуба Коласа, і ў перакладчыка «стол туліцца», апалонік боўтае, сусед да стала прытыкаецца. У Якуба Коласа, праўда, «апалонік… кідаў цеста ў скавародку», а ў перакладчыка ён яго шпурляе. Атрымліваецца, што перакладчык яшчэ выразней, багацей учыняе традыцыю Якуба Коласа ў выкарыстанні маляўніча-экспрэсіўнай дзеяслоўнай палітры.

Скажам яшчэ, што сцвярджае Коласаву народнасць, беларускасць. Поўніцу яе, вядома, шчыра ў перакладзе «заакругляюць» і ўкраінскі паказ беларуска-побытавага, ад беларускіх нораваў:

*І ось нарешті час прощання,*
*Останні цмокі, побажання…*
*– Ну, не кривдуйтеся… Бувайте!*
*Коли не так що, вибачайте!*

Увогуле і змест, і форму Коласавага шэдэўра перакладчыку ўдалося перадаць, можна сказаць, шэдэўральна. I спецыяльна вылучу ўдаласць перакладу фінальных мясцінаў Коласавай эпапеі, яе трагічнай завостранасці сюжэта, кульмінацыі канцэпцыі, ідэйнай накіраванасці. Даўно мінуў час, калі вульгарызатарская крытыка 30-х гадоў мінулага стагоддзя аб'яўляла паэму «Новая зямля» паэтызацыяй кулацтва, дробна-буржуазнага ўласніцтва. У залежнасці ад яе аказаліся расійскія перакладчыкі даваеннага і пасляваенна часу. Іх праўкі канцоўкі Коласавага эпасу як нібы паэтызацыі новага калгаснага ладу, заклікі да яго не абышлі і Коласавага арыгінала паэмы, і першыя пасляваенныя трактоўкі яго беларускай крытыкай. У крытыцы 60-70-х гадоў, дзякуючы даследаванням Ю. Пшыркова, А. Адамовіча, праўда ідэйнага зместу велічнай паэмы Якуба Коласа была ўсталявана. I гэта натуральна, што яе падтрымаў сваім перакладам украінскі сённяшні перакладчык — натуральна і ўхвальна. Больш таго, менавіта Коласаву задуму «Новай зямлі» як паэмы біблейнага пафасу, пошуку зямлі абяцанай перакладчык вельмі выразна яшчэ і падкрэсліў.

Чытаем Якуба Коласа, пасмяротныя словы асноўнага героя «Новай зямлі» Міхала, звернутыя да Антося:

*– Антоська!.. Родны мой! Канаю…*
*Бог не судзіў мне бачыць волі,*
*I кідаць зерне ў свае ролі…*

Чытаем пераклад гэтых радкоў у В. Стралко:

*– Антоську!.. Рідний мій! Канаю…*
*Господь не дав діждатись долі…*
*Ростити хліб на власнім полі…*

У Якуба Коласа «свае ролі», у перакладчыка «ўласнае поле», і гэтым якраз выразней выяўляецца ідэя Якуба Коласа аб пошуку ў дарэвалюцыйным часе беларускім сялянствам зямлі як уласнасці, як апоры, якая не здрадзіць.

Думаецца, што падобныя ў перакладзе Валерыя Стралко ўвыразненні асноўнай думкі Якуба Коласа як творцы вялікага нацыянальнага эпасу ўкраінскі яго пераклад хораша ўпякняюць. Удачы ўкраінскага перакладчыка не могуць нас не радаваць. Верыцца таксама, што і ўкраінскі чытач будзе ўдзячны яму за ягонае зблíжэнне з веліччу і хараством паэмы Якуба Коласа.

**Алег Лойка,**
**член-карэспандэнт НАН Беларусі**

▸ ДРУК

# ДВАЦЦАЦЬ ВОСЬМЫ «ДЗЕЯСЛОЎ»

**У падпісчыкаў і ў продажы з'явіўся новы нумар (па агульнай перыядызацыі — 28-ы) літаратурна-мастацкага часопіса «Дзеяслоў».**




Адметнасць выдання — у ягонай анталагічнасці. «Дзеяслоў» упершыню прапануе мініанталогію сучаснай шведскай паэзіі (у перакладзе на беларускую Дзмітры Плакса). Гэта першае набліжэнне літаратурнай Беларусі да творчасці скандынаўскай суседкі. Да ўсяго, на старонках новага «Дзеяслова» апублікаваная і своеасаблівая анталогія сучаснай маладой беларускай літаратуры, — творы пераможцаў конкурсу, прысвечанага 100-годдзю «Нашай Нівы».

Гурманам паэзіі розных густаў будуць даспадобы паэзія Васіля Зуёнка, Сяргея Законнікава, Леаніда Дранько-Майсюка, у прозе раўнадушнымі не пакінуць містычная аповесць Людмілы Рублеўскай «Ночы на Плябанскіх Млынах», апавяданні Сяргея Рублеўскага, Алеся Аркуша і Віктара Ледзенева.

«Дзеялоў» друкуе біяграфічны нарыс Уладзіміра Някляева «Шлях», прысвечаны 125-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і ў якім асвятляецца загадка смерці паэта, а таксама старонкі кнігі эсэ Ніла Гілевіча «Пры крыніцах гаючае вады», бібліяграфічныя нарысы Сяргея Шапрана пра лёс і творчасць Васіля Быкава.

У раздзеле «Крытыка» — штрыхі да партрэту пісьменніка Юры Станкевіча, зробленыя Сяргеем Грышкевічам. У «Інтэрв'ю» — гутаркі з празаікам Уладзімірам Сцяпанам і скульптарам Гэнікам Лойкам. «Дзеяслоўная» бліц-крытыка падае размовы пра новую кнігу з бібліятэчкі «Нашай Нівы» «Жанчыны выходзяць з-пад кантролю».

Аператыўна пазнаёміцца з новымі нумарамі «Дзеяслова» можна праз афіцыйную падпіску (у любым паштовым аддзяленні, падпісны індэкс 74813). Прачытаць «Дзеяслоў» можна ў Інтэрнэце на сайце www.dziejaslou.by.

ПАМЯЦЬ

# МІНУЛАПРЫСУТНАСЦЬ

## ДА 95-Х УГОДКАЎ З ДНЯ НАРОДЗІНАЎ І 30-ГОДДЗЯ З ДНЯ СМЕРЦІ УЛАДЗІМІРА КАРПАВА

**Ёсць такі феномен — мінулае: чалавек парываецца з часу, а мінулае наганяе яго… У прадмове да збору твораў Уладзіміра Карпава, якія ў пяці тамах выйшлі з выдавецтва «Мастацкая літаратура» ў васьмідзесятыя гады, Іван Шамякін напісаў: «Мінулае жыве ў чалавеку або як гонар і слава, або як пракляцце. Ад мінулага залежыць, хоча таго чалавек ці не, яго сённяшняе жыццё». Словы катэгарычныя, але яны яскрава выяўляюць фенаменальны свет літаратуры і эпохі франтавых беларускіх пісьменнікаў. У аснове гэтага неразгаду — унутранае часазлічэнне творцы, незагойны псіхічны час, ператвораны праз ахвярнасць і страты ў славу і гонар; прамінулыя хвіліны і гады маладосці як бы адбываюцца паўзбежна з сучаснасцю, уплываюць на яе, прадвызначаюць… і даўнія падзеі наканавана, абвострана жывуць у душы лёсаўтваральнай мінуўшчынаю.**



Уладзімір Карпаў 9 траўня 1975 г. падчас запісу тэлеперадачы. Фота з сямейнага архіву.

Уладзімір Карпаў — адзін з яскравых прадстаўнікоў гэтага жывога і неўміручага часу душы. Ужо само ягонае з'яўленне ў беларускай прасторы — фенаменальная акалічнасць і дзіўная загадка. У маленстве, у дванаццаць гадоў ён патрапіў у Беларусь з Расіі. На Гомельшчыну, у прыдняпроўскую вёску Ёлча, яго прывезла маці, ратуючыся ад голаду на Паволжы. Беларусь сталася ягоным лёсам, а беларуская мова роднай стыхіяй і мовай ягоных мастацкіх і літаратуразнаўчых твораў. Жывапрысутныя даўніна, маленства зрабіліся лёсавым стрыжнем пісьменніка. У сваіх успамінах ён напісаў: «Пасля я жыў і працаваў шмат у якіх вёсках Камарыншчыны, ды павага і любоў да людзей, якія прытулілі нашую сям'ю, ідуць усё-такі з Ёлчы. І тут я, у свае дзесяць год, прысягнуў аддзячыць ім, чым толькі будзе ў маіх сілах».

Адметнасць творчасці пісьменнікаў ваеннае пары — і ў асабістай чыннай прылучанасці да драматызму свае літаратуры, лёсаў герояў, сюжэтных калізіяў. На старонках кніг — сапраўдныя людзі, насамрэчныя падзеі, гісторыя... Гэта літаратура мужнасці і праўды, творчасць чулае супрысутнасці з рэальнасцю. У той пары няма літаратара, які б не трымаў у руках зброю; тут кожны лёс — легенда. Творы Уладзіміра Карпава, як і творы ягоных сучаснікаў, поўныя яскравых і трагічных фотаздымкаў памяці, у якіх адлюстравалася жорсткая рэчаіснасць вайны; аднак кожны здымак — гэта і ўласны адбітак творцы на гістарычнай аснаведзі, ягоныя асабістыя ўражанні й перажыванні. Партызанскі рух на Беларусі, мінскае падполле, мінскае гета... — пабачанае Уладзімірам Карпавым у сапраўднасці і наноў перажытае ім у літаратуры. У складзе разведгрупы ён двойчы дэсантаваўся на акупаваную немцамі тэрыторыю, удзельнічаў у баёх, у барацьбе мінскіх падпольшчыкаў, вызваляў Мінск, у які ўвайшоў сярод першых... Спрадвечны змрочны беларускі вобраз — крывавыя берагі Нямігі — жывою мінуўшчынай скрозьпрысутнічае ў творчасці й лёсе пісьменніка.

Літаратура франтавікоў адметная сваёй гуманістычнай ідэяй. Іх гуманізм — то не абстрактны пафас; гэта гуманізм ваяроў — ідэя, знойдзеная ў жорсткасці й самаахвярнасці, здабытая ў бязлітасным змаганні, дзе на кон перамогі пастаўленае ўласнае жыццё. У гэтай бескампраміснай ідэі дабра не існуе згодніцтва, няма паўколераў і палёгкі самому сабе... — тут усё падпарадкаванае чысціні, усё святапрынесенае на ейны алтар. Кнігі Уладзіміра Карпава прасякнутыя гэтым дзівосным і ясным святлом дабра. Героі ягоных твораў — будаўнікі гораду. Гэта ўчарашнія салдаты; яны падымаюць з попелу Мінск, будуюць дамы і заводаўскія цэхі на разбураным і замініраваным гарадзішчы...

Уладзімір Карпаў — бадай што першы, хто ў роднай літаратуры шырока звярнуўся да гарадское тэматыкі. Аднак, як адзначаў Іван Шамякін, ягоная проза вельмі адрозніваецца ад «індустрыяльных» раманаў тагачаснае эпохі; ягоныя творы шматпланавыя, яны складзеныя з няпростых лёсаў людзей, натхнёных жыццём і творчасцю, і напісаныя ў найлепшых традыцыях рэалізму беларускае савецкае прозы: гэта высокая, крайнальная літаратура, якая сягае за межы схематычных азначэнняў. Шмат якія персанажы Уладзіміра Карпава паланяюць сваёй адкрытасцю і самаадданасцю, здольнасцю з мужнасцю прымаць усе нястачы і жорсткія выпрабаванні лёсу ды годна процістаяць ім. Адметная рыса гэтых людзей — высакародства, жаданне будаваць сваё жыццё не абы якім коштам, а на падставе ўзвышаных ідэалаў. Сёння, калі Менск усё яшчэ знаходзіцца ў пошуках уласнае душы, раманы Уладзіміра Карпава вельмі надзённыя, — яны загадкава сувязаныя з гэтай таемнай душою гораду. Рэха галасоў ягоных герояў яшчэ чуваць сярод прысадаў пракладзеных вуліц, у дварах пасталелых школ і дамоў; цеплыня рук гэтых людзей яшчэ не астыла ў мурах узведзеных імі будынкаў, а ператвораныя ў дрэвы, у паркі, у будыніны іхнія пачуцці, позіркі й жыцці зрабіліся кравяноснай сістэмаю сталіцы й Беларусі... І — проза Уладзіміра Карпава за гадам год містычна аштадж ае гэтую слаўную лёсатворную мінуўшчыну, разам з вясеннімі жывіннымі ліўнямі яна скрозьчас тайнічапрысутнічае ў паветры гораду жыццясцвярджальнай менскай сагаю.

Цяпер, з імклівым сыходам старэйшага пакалення беларускіх пісьменнікаў, з'явілася ў літаратуры пачуццё разгубленасці і асірацеласці. Краснае пісьменства, развітаўшыся з прамінулаю эпохай, апынулася на ростанях, перад чыстым аркушам паперы, сам-насам з сумненнямі, пошукамі, нявыказанасцю, а часам проста і з уласнымі слабасіллем і бяздарнасцю; і творчасць франтавікоў уражвае недасяжнасцю. Гэтую творчасць немагчыма дапоўніць — яна напоўненая да краёў. Яе немагчыма аспрэчыць — яна самабытная, самапраўдная, самадастатковая. Яе немагчыма паўтарыць ці з'імітаваць — яна непаўторная, бо дадзеная апакаліпсісам часу. Гэтая творчасць вымыкае з нягодаў і подзвігу, яна здабытая за межамі магчымага, у змрочнай зоне жыцця ай часе вялікіх азарэнняў вечнаісцінаю. Каб стварыць гэткую літаратуру, трэба ступіць у тыя поцемкавыя абсягі й выжыць... — і ўсё роўна паўтарыць атрымаецца наўрад: чарадзейства здараецца толькі аднойчы...

Пра сваю літаратурную працу Уладзімір Карпаў некалі напісаў простыя шчырыя словы: «Вялікая радасць — працаваць». У гэтым сказе — сутнасць ягонае творчасці ды філасофія ўсёй літаратуры франтавога пакалення пісьменнікаў: нязможаная прага жыцця нязможаных ваяроў.

**Лявон Вашко**

## ФАКТАСЛОЎ

### ЧЫТАННІ, ПРЭЗЕНТАЦЫІ

**У Кішынёве ў бібліятэцы імя М. Ламаносава прайшлі літаратурныя чытанні, прысвечаныя творчасці Васіля Быкава.**

У іх прынялі ўдзел прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі, Саюза ветэранаў Рэспублікі Малдова, беларускай і іншых дыяспар Малдовы. Выступоўцы адзначалі выбітную ролю пісьменніка ў сучаснай літаратуры, на творах якога выхавана не адно пакаленне, падрабязна спыніліся на такіх кнігах пісьменніка, як «Трэцяя ракета», «Альпійская балада», «Пастка» і іншых, падкрэсліваючы адмысловы талент Васіля Быкава ў перадачы псіхалагічнага стану і перажыванняў сваіх герояў.

**У Сыктыўкары і Варкуце адбыліся прэзентацыі зборніка «Высокие широты. Воркута литературная: 1937–2007 годы» (укладальнікі Марк Каганцаў, Андрэй Папоў, Вольга Хмара, Зміцер Сіроцін).**

Кніга складаецца з трох частак: «Мая муза была катаржанкай», «Гэты белы боль не пройдзе ніколі», «На баку расстання». Адмысловую цікавасць выклікае першы раздзел, у якім прадстаўленыя літаратурныя творы вязняў Варкутлага. Публікацыя кожнага аўтара суправаджаецца біяграфічным матэрыялам аб ім.

### ПРЭМІІ, КОНКУРСЫ

**Журы літаратурнай прэміі «Рускі Букер» абвясціла доўгі спіс прэтэндэнтаў на ўзнагароду.**

У яго ўвайшлі 33 раманы 33 аўтараў. У ліку намінаваных апынуліся ўжо вядомыя творы: «ЖД» Дз. Быкава, «Даніэль Штайн, перакладнік» Л. Уліцкай, «Ампір У» У. Пялевіна, «Калі падаюць горы» Ч. Айтматава. Імёны шасці фіналістаў абвесцяць 4 кастрычніка, а 5 снежня 2007 года назавуць уладальніка галоўнага прызу — 20 тысяч еўра. Астатнія аўтары з шорт-ліста атрымаюць па дзве тысячы даляраў.

**Названыя лаўрэаты конкурсу «Лепшая ўкраінская кніга: шэсць твораў — лідэраў чытацкага і экспертнага галасавання».**

Пераможцам у намінацыі «Белетрыстыка» стаў раман «Танцы ў масках» Ларысы Дзянісенка. Другое месца атрымаў раман «Я, Перамога і Берлін» Кузьмы Скрабіна. «Дзікая энергія. Лана» Марыны і Сяргея Дзьячэнкаў заваявала трэцяе месца. У намінацыі «Дакументалістыка» перамагла біяграфія Івана Франка «Прарок у сваёй айчыне» Яраслава Грыцака. Другое месца прысудзілі тэксту Юрыя Андруховіча «Д'ябал хаваецца ў сыры». Трэцяе месца — «Порт Франкоўск» Тараса Прахаські. Тройку лідэраў чытацкіх сімпатый склалі «Дзікая энергія. Лана», «Рэмінісцэнцыі, або Занатоўкі сівога мерына» Станіслава Канстанцінава і «Гісторыя аднаго інцэсту» Аксаны Веліт. У намінацыі «Дакументалістыка» сімпатыі чытачоў вывелі на першае месца «Д'ябал хаваецца ў сыры», на другое — «Вялікія загадкі гісторыі» Юрыя Пярнацьева, а «Крымскі Гамбіт» Барыса Пенчука і Алены Кочкінай — на трэцяе.

### МІЖНАРОДНЫ КАНГРЭС ПЭН-ЦЭНТРА

**Адбыўся Міжнародны кангрэс ПЭН-цэнтра, на якім былі разгледжаны шматлікія пытанні, звязаныя з жыццём і працай творцаў у сучасным свеце.**

На форуме быў агучаны даклад і пра стан літаратурнай свабоды ў Беларусі. Яго падрыхтаваў кіраўнік Расійскага Пэн-цэнтра Аляксандр Ткачэнка. У прыватнасці, ён распавёў пра нядаўняе ліквідаванне грамадскага аб'яднання «Беларускі літаратурны фонд», пра перашкоды дзейнасці Саюза беларускіх пісьменнікаў, а таксама аб тым, што ініцыятар і кіраўнік праекта па выданні Поўнага збора твораў Васіля Быкава экс-кандыдат у прэзідэнты Беларусі Аляксандр Казулін знаходзіцца ў турме.

Тэзісы даклада А. Ткачэнкі адносна Беларусі былі адлюстраваны ў агульнай рэзалюцыі Міжнароднага кангрэса ПЭН-цэнтра.

ТРЫБУНА

# Барыс Пятровіч: «АД ПАКАЗУ РЭАЛЬНАСЦІ — ДА ПЕРААСЭНСАВАННЯ»

**У падмаскоўным Доме творчасці «Перадзелкіна» адбылася сустрэча рэдактароў літаратурна-мастацкіх часопісаў, якую арганізавала «Дружба народов» пры падтрымцы Федэральнага агенцтва па справах друку (Расія). У сустрэчы браў удзел і галоўны рэдактар часопіса «Дзеяслоў» Барыс Пятровіч, з выступам якога — пра сённяшні дзень нацыянальнай літаратуры — мы вырашылі пазнаёміць і беларускага чытача.**



Бываючы на захадзе ці ўсходзе ад Менску, я заўважаю, што стаўленне да сітуацыі ў сённяшняй Беларусі моцна адрозніваецца. Адны гавораць: у вас дыктатура. І шкадуюць нас. Іншыя, наадварот, зайздросцяць нам, мяркуючы, што ў нас ледзь не камунізм. І першае, і другое, мякка кажучы, не зусім праўда. Не трэба нас шкадаваць — мы самі вінаватыя ў тым, што адбываецца, і самі знойдзем выйсце. Але не варта і ідэалізаваць сітуацыю ў Беларусі, яна ў нас сёння зусім не такая, якую можна сабе ўявіць, мяркуючы па друку і тэлеперадачах. Яе аніяк немагчыма параўнаць з тым, што было ў СССР, ці з тым, што адбываецца ў іншых краінах на постсавецкай прасторы. Усюды, уключна з Расіяй, не гаворачы ўжо аб рэспубліках Прыбалтыкі ці Сярэдняй Азіі, падабаецца гэта каму ці не, але будуецца нацыянальная дзяржава. А што будуецца ў Беларусі?.. Гэта вялікае пытанне. За апошнія дванаццаць гадоў сфера ўжывання нацыянальнай мовы і элементаў нацыянальнай, г. зн., натуральна, беларускай культуры планамерна звужалася. У краіне практычна не засталося беларускамоўных школ — толькі малакалькасныя і ў вёсках, няма ніводнай беларускамоўнай ВНУ, радыё і тэлебачанне працуюць па-расійску…

Але не буду гаварыць пра ўсё. Скажу толькі пра літаратуру і пра стаўленне дзяржавы да яе.

Падчас сустрэчаў з нашымі сябрамі з краінаў СНД часта даводзіцца чуць: як вам пашанцавала, вашая дзяржава так клапоціцца пра… вас. Скажу адразу: гэта — блеф. Саюз беларускіх пісьменнікаў пачынаючы з 1994 г. пераж ыў з боку ўладаў толькі ганенні і ні меў ніякай падтрымкі. Больш за тое, у 1997 г. па распараджэнні прэзідэнта ў пісьменнікаў быў адабраны іхні дом — Дом літаратара (падкрэслю: нідзе на прасторах СНД дзяржава гэтага не зрабіла), у 2002 г. у СБП былі забраны ўсе часопісы і газета, якія да таго з'яўляліся органамі СБП, быў створаны так званы холдынг. Рабілася тое з мэтай увядзення жорсткай дзяржаўнай цэнзуры ў тых выданнях, усе галоўныя рэдактары былі звольненыя, на іхняе месца прызначаны лаяльныя ўладам людзі.

Апошнім часам мы перажываем толькі страты. З былых шасці дзяржаўных літаратурных часопісаў засталося чатыры: два на беларускай мове, два на расійскай. Адзін з самых папулярных — элітарны — беларускамоўны часопіс «Крыніца» спачатку ператварылі ў расійскамоўны «Славянский свет», а потым і зусім закрылі. Часопіс «Беларусь» захаваў назву, але стаў грамадска-палітычным і літаратуру не друкуе…

Завяршыўся раскол у пісьменніцкім асяродку (ініцыяваны, падкрэслю, і падтрыманы дзяржавай) стварэннем напрыканцы 2005 г. «Саюза пісьменнікаў Беларусі» на чале з сенатарам Мікалаем Чаргінцом. Новы Саюз атрымаў падтрымку дзяржавы. Яму вылучаны памяшканні, стаўкі супрацоўнікам з дзяржбюджэта, пад ягонае крыло фактычна перайшлі ўсе дзяржаўныя літаратурныя выданні. Уціск жа на стары Саюз (СБП) і ягоных членаў працягваецца. СБП прайшоў праз некалькі судоў і ў выніку страціў усе свае памяшканні ды апынуўся на вуліцы, фактычна ў падполлі. Хоць у яго сёння ўваходзяць больш 500 членаў, у тым ліку большасць вядомых у Беларусі ды свеце пісьменнікаў, гонар сучаснай беларускай літаратуры, пісьменнікаў, якія цяпер знаходзяцца практычна ва ўмовах унутранай эміграцыі…

Беларуская літаратура, незалежна ад таго, якой пазіцыі прытрымліваецца пісьменнік, непапулярная ў сённяшніх уладаў. Гэта не спорт, не хакей…

З недзяржаўных беларускамоўных літаратурных часопісаў перыядычна выходзіць толькі «Дзеяслоў». Таму што ўжо гаварыць пра тое, чым ёсць сёння для большасці беларускіх пісьменнікаў адзіны часопіс — люстэркам літпрацэсу, клубам для інтэлігенцыі, пляцоўкай для дэбатаў, школай літаратурнага майстэрства? І першым, і другім, і трэцім… Пасля стварэння «холдынгу» большасць вядомых беларускіх пісьменнікаў у знак пратэсту супраць звальнення галоўных рэдактараў і членаў калектываў рэдакцый далі слова не друкаваць свае творы ў дзяржаўных выданнях. А гэта — і Васіль Быкаў, і Янка Брыль (якіх ужо няма сярод нас), і Ніл Гілевіч, Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін, Святлана Алексіевіч, Алесь Разанаў, Сяргей Законнікаў, Уладзімір Някляеў, Уладзімір Арлоў… І многія, і многія іншыя. І слова сваё яны трымаюць. Да іх далучыліся найбольш вядомыя і таленавітыя пісьменнікі сярэдняга і малодшага пакаленняў. Спецыфіка нашага часопіса ў тым, што там друкуецца не толькі паэзія і проза, у кожным нумары ёсць рубрыка «Дэбют». Мы хацелі б, каб у пачаткоўцаў была магчымасць выбару, дзе друкавацца: у падцэнзурным дзяржаўным выданні ці ў свабодным. Таму адной з мэтаў стварэння нашага часопіса была і — даць трыбуну не толькі старэйшым пісьменнікам, але і маладым. Акрамя таго, у кожным нумары друкуюцца пераклады на беларускую сучаснай замежнай літаратуры. Зразумела, значнае месца займае эсэістыка, публіцыстыка, крытыка. І яшчэ: улічваючы тое, што сёння ў нас няма беларускамоўных часопісаў пра музыку, кіно, тэатр, драматургію — мы абявязкова змяшчаем артыкулы на гэтыя тэмы.

Не ўяўляю сітуацыі, калі не было б нашага часопіса. І, напэўна, не адзін я. Дзе тады публікаваць свае творы жывым класікам сучаснай беларускай літаратуры? Ды што жывым… Васіль Быкаў пакінуў агрмадную неапублікаваную спадчыну. На працягу чатырох гадоў пасля смерці Васіля Уладзіміравіча мы, з падтрымкі ўдавы пісьменніка Ірыны Міхайлаўны, апублікавалі невядомую аповесць «Афганец» (іншая назва — «Час шакалаў»), няскончаную аповесць «Бліндаж», некалькі апавяданняў, прыпавесцяў, невялікіх навэлаў, запісы розных гадоў, дадаткі да «Доўгай дарогі дадому»… Больш анідзе, ні ў адным часопісе Беларусі творы Быкава не друкаваліся. Збор ягоных твораў на беларускай мове — выходзіць у Маскве…

Гэта адзін бок пытання. Другі: адкуль, калі не з часопіса, чытачы могуць чэрпаць інфармацыю аб сітуацыі ў літаратуры, дзе яны могуць знайсці навінкі сучаснай літаратуры? Асабліва ў нашай сітуацыі, калі дзяржава падзяліла пісьменнікаў на сваіх і чужых…

Ды няма ліха без дабра. Так, нас не друкуюць (існуюць так званыя «чорныя спісы» пісьменнікаў, якіх не тое што друкаваць, імёны іх нельга згадваць у дзяржвыданнях), забараняюць сустрэчы з чытачамі, кнігі не выдаюць…

Але дзякуючы гэтаму мы вучымся жыць без дапамогі дзяржавы. Большасць пісьменнікаў не чакае і не спадзяецца дачакацца часу, калі іх кнігі надрукуюць у дзяржвыдавецтве. Яны самі шукаюць магчымасць выдаць іх. І знаходзяць. Хай і без ганарару, але кнігі выходзяць. У незалежных выдавецтвах сёння выходзіць у некалькі разоў больш беларускамоўных кніг, чым у дзяржаўных. Калі ў «Мастацкай літаратуры» (адзіным выдавецтве, якое спецыялізуецца на выданні мастацкай літаратуры) выходзіць у год да 30 назваў кніг (у савецкі час выходзіла да 300 і больш), дык у недзяржаўных — больш 600…

На жаль, нашыя чытачы — самая бедная частка насельніцтва Беларусі. Гэта інтэлігенцыя, настаўнікі, выкладчыкі, студэнты… Але, на радасць, гэта і самая адукаваная частка насельніцтва, самая актыўная. Нягледзячы на забароны, яны арганізоўваюць сустрэчы з намі, яны цікавяцца праблемамі і навінкамі сучаснай літаратуры. На такія нефармальныя сустрэчы прыходзяць 200–300 чалавек — столькі, колькі змяшчаюць невялікія залы… Так адказваюць нашыя чытачы на ўсемагчымыя забароны…

Як любы часопіс, які паважае сябе, мы маем свой сайт. І ён — наш памочнік. У Беларусі сёння, калі пра навіны літаратуры, пра творчыя вечары і сустрэчы з чытачамі практычна немагчыма даведацца з дзяржаўнага тэлебачання і афіцыйных газет, адзінай аддушынай застаецца Інтэрнэт.

Думаю, што аснова літаратурнага часопіса не ўласна літаратура, а публіцыстыка, эсэістыка, крытыка. Без добрай крытыкі, вострай, надзённай — чытача не разварушыць. Сёння ў нас няма праблемаў з прозай і паэзіяй, пішацца дабротная публіцыстыка і эсэістыка, аднак, на жаль, усё больш крытыкаў перастае пісаць — няўдзячная іхняя праца не толькі ў маральным сэнсе, але і ў матэрыяльным — і тыя, хто пачынаў як крытык, пераходзяць у іншыя жанры.

Сяргей Дубавец, які заявіў пра сябе як крытык, стаў выдаўцом, Сяргей Кавалёў — драматургам, Пятро Васючэнка — празаікам, дзіцячым пісьменнікам, Галіна Тычка, Ірына Багдановіч — літаратуразнаўцамі… На жаль, у нас крытыка як прафесія паміpae. І не ратуе павышэнне ганарараў. Спрацоўвае тое, што сябром сваёй прынцыповасцю не нажывеш, а вось ворагаў… Даводзіцца самой рэдакцыі займацца крытыкай, каб хоць адсочваць літаратурны працэс, паспяваць знаёміць чытачоў з найбольш цікавымі кнігамі, публікацыямі. Даводзіцца, але ўсё ж — гэта справа прафесіяналаў…

Мы толькі-толькі пачынаем наладжваць страчаныя кантакты. Беларускай літаратурай пачалі цікавіцца ў Еўропе. Нашая галоўная бяда — мала перакладчыкаў, якія ведаюць нашую мову. Аднак толькі за два апошнія гады выйшлі анталогіі беларускай літаратуры на балгарскай, чэшскай, польскай мовах, часопісы Аўстрыі, Славакіі, Польшчы, Швецыі прысвячалі свае нумары беларускай літаратуры. Асобныя кнігі беларускіх аўтараў выходзілі ў Нямеччыне, Балгарыі, Польшчы, Украіне і, канечне ж, у Расіі.

У Расіі ж, на жаль, сучасную літаратуру па ранейшаму ведаюць кепска ці не ведаюць наогул… З савецкіх часоў памятаюць Быкава, Алексіевіч, можа, яшчэ Барадуліна, Бураўкіна… Але ж за апошнія пятнаццаць гадоў у літаратуру прыйшло цэлае пакаленне маладых, цікавых аўтараў. Гэта людзі, якія ў школу пайшлі ўжо не ў СССР ды вучыліся ў першыя гады незалежнасці ў беларускамоўных класах. З'яўленне гэтага пакалення я лічу знакавай і значнай падзеяй і з ім звязваю будучае беларускай літаратуры. Маладыя аўтары смела эксперыментуюць, у іх папулярныя ганімыя раней верлібры, белы верш. З новых імёнаў магу назваць Андрэя Хадановіча, Віктара Жыбуля, Вальжыну Морт, Джэці, Анатоля Івашчанку, Цемрыка Велета, Віку Трэнас, з паэтаў сярэдняга пакалення — Леаніда Дранько-Майсюка, Алеся Бадака, Эдуарда Акуліна, Ігара Бабкова, Славаміра Адамовіча, Міхася Скоблу, Віктара Слінко, Віктара Шніпа. У прозе з маладых вылучаюцца Адэля Дубавец, Міраслава Шавыркіна, Павел Свярдлоў, з сярэдняга пакалення назаву Людмілу Рублеўскую, Кастуся Тарасава, Юрыя Станкевіча, Уладзіміра Сціпана, Андрэя Федарэнку, Алеся Наварыча. Цікавыя празаічныя вопыты паэтаў Леаніда Дранько-Майсюка і Уладзіміра Някляева. Варта звярнуць увагу на гістарычную прозу Кастуся Тарасава, Вольгі Іпатавай і асабліва Людмілы Рублеўскай: яе раманы «Золата забытых магілаў» і «Танцы смерці» напісаныя ў працяг традыцый, закладзеных Уладзімірам Караткевічам…

Як публіцысты і эсэісты цікава працавалі ў апошні час Віктар Казько, Уладзімір Арлоў, Валянцін Акудовіч… Канечне ж, вельмі пладавіта працуе старэйшае пакаленне літаратараў, сярод якіх асабліва я хацеў бы вылучыць Алеся Разанава — мала вядомага ў Расіі, але папулярнага цяпер на Захадзе.

Былі цікавыя публікацыі ва ўжо не раз названых і неназваных Рыгора Барадуліна, Ніла Гілевіча, Анатоля Вярцінскага, Генадзя Бураўкіна, Святланы Алексіевіч… Усіх не пералічыш…

Што паказальна: у апошні час проза і паэзія ў Беларусі, як гэта ні парадаксальна выглядае на фоне апошніх падзеяў у краіне, сталі менш палітызаванымі, а больш, калі так можна сказаць, уласна літаратурнымі. Літаратура адыходзіць да метафізікі, філасофіі, а значыць ад простага паказу рэальнасці — да пераасэнсавання яе, ад крытыкі ў лоб — да аналізу. Аўтараў цікавіць не сам факт, а яго адлюстраванне праз лёс героя, праз ягоныя думкі, пачуцці…

Думаю, у гэтым сёння ўсе мы, выхадцы з СССР, падобныя. «Вытворчая» тэматыка пайшла ў глыбокае мінулае, і, спадзяюся, нават у нас звароту да яе ўжо не будзе…

# РЫГОР БАРАДУЛІН

**Рыгор Барадулін — народны паэт Беларусі, грамадскі дзеяч. Аўтар шматлікіх кніг паэзіі і эсэ. Апошні па часе зборнік вершаў «Ксты» вытрымаў некалькі перавыданняў. Намінант на атрыманне Нобелеўскай прэміі.**



## НЕБАВЫ СНЫ

### Аж пакуль…

*Мінулае*
*Шматгулае,*
*А цішыня скупая.*
*Наступнае*
*Наступае —*
*На ўзгадкі наступае.*

*Сум радуецца рэшце*
*У радасці ў кішэні.*
*І цішынёю ўрэшце*
*Разменіцца цярпенне.*

*…Аж покуль не значэе*
*слоў ранішніх значэнне.*

### Радовішчы радасці

*Радовішчы радасці знайсці*
*Нялёгка,*
*Бо іх ахоўвае гора.*
*Жарынкі жарсці*
*Зграць на лісці –*
*На лістах, што ў заўтра*
*Напіша учора.*

*Радовішчы радасці, яны*
*Невычэрпныя,*
*Таму анікому*
*Не ўцячы ад сваёй маны,*
*Што разгубленасць*
*Верне дадому.*
*Жаху ані ў галаве,*
*Дзе ходзіць нявестка –*
*Вестка благая.*
*Гора ў харомах жыве.*
*Радасць пад зямлёй*
*Залягае…*

### Але…

*Непрыручаных пнуцца карміць*
*З рукі*
*Усе вякі*
*Дарагімі прысмакамі.*
*Бываюць з ашыйнікамі ваўкі.*
*Але*
*Яны завуцца сабакамі…*

### А там…

*Жыву не тут,*
*Дзе пражываю дні,*
*А там, дзе дні мае*
*Раслі са мною,*
*Атуленыя шчырай гаманою*
*Расчуленай зялёнай цішыні.*

*Імкнецца ўсё маё*
*Штодня туды,*
*Дзе зябне ў ноч завейную*
*Падпечнік.*
*Дзе Хатнік*
*Свой бярозавы падсвечнік*
*Нясе на кут,*
*Каб бачылі Дзяды,*

*Што ў хаце ён –*
*Рупліві гаспадар.*
*Чакае. Не спяшаецца.*
*Трывае.*
*Тут халадаецца душа жывая,*
*Забыць баіцца*
*Нетутэйшы сквар.*

*Тут мамін сум*
*Глядзіць яе вачыма.*
*Тут дні ў нябыт ідуць,*
*Каб па вясне*
*Нанова зарунець,*
*Але не мне,*
*А на мяне падобнаму,*
*Магчыма…*

### Падзеліцца…

*Штоначы засынаем*
*У беспрабудным наіве,*
*Што неба падзеліцца з намі*
*Снамі сваімі.*

*А небавы сны –*
*Зніклыя аблачыны*
*Плывуць*
*Да ветрам акрэсленай старыны,*
*Да сваёй незямной айчыны…*

### Маладыя дровы

*Світанне і змярканне*
*Хмураць бровы.*
*Аб лоб нябёс*
*Пытанне хмарай трэцца:*
*А можа людзі –*
*Маладыя дровы,*
*Якія вечнасць паліць,*
*Каб сагрэцца?..*

### Родная Каменская вуліца

*Па яшчэ ацалелым бруку са мною*
*Ступаюць маладыя правіны.*
*Маркоце хапае спакою,*
*Пустазеллю — зямлі.*
*Да нябыту паварочваюцца спіною*
*Хаты –*
*Звечарэлыя дамавіны*
*Душаў,*
*Якія тут аднойчы жылі…*

### Традыцыйнае

*Плыт прыстаў у прымакі да мяжы,*
*І цяпер ён — плот.*
*Студня ў дрымотнай імжы*
*Пазяхае на повен рот.*
*Яна не паспела забыцца,*
*Што сястрою крыніца была калісьці.*
*Вечарэе лагода.*
*Да мяцеліцы чорныя шчокі гарод*
*Грэе азяблымі вяснушкамі жаўталісця…*

### Смелая пяшчота

*Вянкі цыбулі, як вянкі санетаў,*
*Сплятала мама ў чэсць крутой зімы.*
*Не рассакрэчвалі сваіх сакрэтаў*
*Апошнія ахрыплыя грамы.*
*Як слёзы выкрасаць з вачэй*
*планетаў,*
*Як з мройных хмар узводзіць церамы.*
*І смутны ветах ведаў сцежкі летаў,*
*Якімі йшлі начлежныя дымы.*
*Хоць пад страхой хапала ўсім*
*гаркоты,*
*Дык каб не зглоцілі наш нож сухоты,*
*Яго кармілі вострым, як ён сам.*
*Цыбулі спелай залатыя соты*
*Не шкадавалі смелае пяшчоты*
*Ні стомленым, ні маладым слязам.*

### Чорны дзяцел

*Чорны дзяцел*
*У заснежаным бары*
*Ціха лекуе сасонку маладую.*
*Маладая завіруха калядуе.*
*У застуджаных вятроў настрой сыры.*

*Чорны дзяцел*
*У наснежаным бары*
*Да таемнасці жывіцы дападае.*
*Хоць гадоў не лічыць*
*Скруха маладая,*
*дачакалася зіма сваёй пары.*

*Пра чарэнь*
*І пра ката на каптуры*
*Снам на вуха*
*Шэпча згадка маладая.*
*Беспрытульнаму маўчанню*
*спагадае*
*Чорны дзяцел*
*У заснежаным бары…*

### Кусман сну

*Вягарыць на вятры*
*Пыхаю парусіна.*
*Ціхая ласка сына –*
*Газаю ў ліхтары.*

*Будзеш прасіць: паўтары*
*Цень ад крыла жураўліны,*
*Дотык халоднай гліны.*

*Выраю востры локаць*
*З тога зялёны,*
*Калі*
*Ён упіраўся ў лотаць*
*На веснавое зямлі.*

*Вецер як гаспадар…*
*Дол падмяце слата.*
*Прагтлыне ліхтар*
*Язык дагарэлы кната.*

*Сцюжаю нагадаецца сквар.*
*Занядужае вечар-ліхвяр…*

*Імжа-хуткацечніца*
*Вечніца…*

### Не дарадца

*І малому сучку*
*На крамяным ствале*
*Ліставейнай хапае працы.*
*Я хачу цябе з сэрца прагнаць,*
*Але*
*Сэрца — розуму не дарадца.*
*Парасчуліцца хочацца*
*Часам скале,*
*Вогнішчу з туманом пабрацца.*

*Думкі хочуць забыцца цябе,*
*Але*
*Напамін — забыццю не дарадца.*

*Не панура*
*Віну й на жалобным стале,*
*Не самотна віне дакарацца.*

*Я хачу цвярозым пабыць,*
*Але*
*Я шаленству свайму не дарадца…*

### Палон

*Усе мы ў мілосці ў палоне.*
*І ў нашых адзіных для нас*
*Аблокамі пахнуць далоні,*
*На міг запыняецца час.*

*Да радасці ломімся ў госці,*
*Сячэм пад сабою сукі.*
*Мы ўсе ў ягамосці мілосці*
*Напрошаныя жабракі.*

*Пярун у раскацістым тосце,*
*Да зор свой паслаўшы дазор,*
*У гонар крыўдлівай мілосці*
*Падыме прадонне азёр.*

*І космас брыво небакраю*
*Нахмурыць, як горды сусед.*
*Каб выдыхнуць слова к а х а ю,*
*Аднойчы прыходзім на свет.*

*І слухае рэўнасць глухая,*
*Як блытае вернасць сляды.*
*Былосць звечарэла ўздыхае.*
*У згоды настрой малады.*

*Прачнуўшыся з зоркаю ранняй,*
*І цень свой не ўбачыць спакой.*
*Паненка знайменіцца паняй.*
*Мілосць не бывае ўдавой.*

*Ні кпінаў, ні позіркаў косых*
*Мілосць не баіцца нідзе.*
*Каб толькі не гнуўся той посах,*
*Што юнага ў сталасць вядзе.*

*Мілосць — і лагода й карыда,*
*Рака, дзе не спяць берагі.*
*І самая лютая крыўда*
*Ад тых, хто табе дарагі.*

*Такое надумае штосьці*
*Настрой, што самога сябе*
*Пачне раўнаваць да мілосці*
*Абдзелены ў шчодрай дзяльбе.*

*І моцы не хопіць зайздросці*
*Халоднай пабыць хоць у снах.*
*І вочы ў галоднай мілосці*
*Пазычыць баіцца манах.*

*Шануе мілосць аблачынку,*
*Што жарсці аценіць чало,*
*Каб неба здалося ў аўчынку,*
*З якой жыць усё пачало.*

*Мілосць — гэта шчырасць і праца,*
*Акшчоны набёсамі рух.*
*І мусяць жывыя старацца,*
*Каб вечны агонь не патух!*

### На сустрэчу

*Заплюшчыўся,*
*І на мяне зірнулі*
*Далёкія мае былыя вочы.*
*Яны мяне, вядома, не пазналі.*
*А я ўгадаў, ажно памаладзеў.*
*… Глядзелі на здарожаную стому,*
*Як чорныя агеньчыкі, гарэлі*
*Мае калісьці, нейчыя цяпер.*
*І не было ў іх, чыстых, ні папроку,*
*Ні шкадавання, ні цяжкога смутку.*
*Ды штосьці скіравала іх, відаць,*
*Вясёла развітацца*
*На сустрэчу…*

# РАНІЦАЙ, КАЛІ

Вінцэсь МУДРОЎ

На апошнім павароце перад школаю Змітрок спыняецца і доўга глядзіць з-пад рукі на агромністае, ружовай імглой ахутанае неба. Каторы дзень хлопец прагне ўбачыць — як тухне апошняя, самая зыркая зорка, і кожнага разу, пакуль ідзе ад Мартулёвай хаты да павароткі, тая без следу знікае. Сёння ён нават спрабаваў ісці, не адрываючы вачэй ад неба, ды ўзбіўся на сумёт і набраў у валёнак снегу. Дарогу звечара перамяло, таму трэба глядзець пад ногі й ступаць у санную каляіну.

— Што... самалёт ляціць?! — гукае стрыечны брат Чэсь, таксама зірнуўшы на неба.

Чэсь, не патрапляючы нагой у каляіну, бяжыць насустрач. На ягонай галаве летняя канфедэратка, і адтапыраныя вушы малінавыя ад марозу.

— Самалёт?! — задыхана пытаецца Чэсь, але Змітрок у адказ толькі ўздыхае — казаць пра зоркі, ды яшчэ на марозе, няма ахвоты.

З гасцінца да школы бягуць западзіны прыбітага снегу — некалькі чалавек прайшлі тут, ступаючы нага ў нагу.

— А я думаў — мы першыя, — падае голас стрыечны брат, і Змітрок, не азіраючыся, прамаўляе: — Першая Цыба прыходзіць.

Цыбаю хлопцы называюць сваю высакарослую, прысланую з усходу настаўніцу. Цыба тая жыве ў Мартулёвай хаце і прыбягае ў школу дасвеццем.

Прамерзлыя завесы жаласна стогнуць, хлопцы разам пераступаюць парог, кідаюцца да гарачай галянкі, ды іх, як заўсёды, спыняе незадаволены воклік цёткі Агаты:

— Доконд?

Цётка — яна ўжо гадоў дваццаць жыве пры школе — торкае ў Чэсевы рукі паскубаны дзяркач. Абабіўшы снег з валёнак, хлопцы бягуць да печкі, ляпаюць па ёй збялелымі далонямі, і міжволі наструньваюць слых.

— Так ровно? — пытаецца за сценкаю Цыба; цётка Агата, керхануўшы, спявае: — Ву-унь той краёчак — чу-уць угору, — потым, ужо адрывіста, гукае: — Добжэ, — і падлога злёгку страсянаецца — настаўніца штосьці ва на сценку і цяпер саскочыла долу.

Цыба ляпае далонямі, а цётка Агата нясмела прамаўляе:

— Пані наўчыцелька... дроваў... адзін абярэмак застаўся.

Хвіліну пануе цішыня.

— Агата Ивановна, не называйте меня так. Я не пани, а простая советская учительница. А что касается дров... — у класе гучна рыпае масніцына, — я подумаю над этим вопросом.

Змітрок з Чэсем пераглядаюцца. Пані Яблоньска, што вучыла іх летась, з усімі размаўляла па-польску, настаўнік Скочык — таксама. А вось Цыба на ўроках гамоніць па-беларуску, а з цёткай Агатай размаўляе па-расейску, і гэта дзівіць хлопцаў.

Завесы зноў стогнуць, і ў парнай ад марозу пройме з'яўляюцца Лена Патыка й Дана Кур'янка. Дзяўчынкі, не абабіўшы валёнак, бягуць да галянкі.



Мудроў Вінцэсь – празаік, публіцыст. Аўтар кніг «Жанчыны ля басейна», «Гісторыя аднаго злачынства», «Зімовыя сны», «Пераўтвораныя ў попел» і інш.
Сябар Саюза беларускіх пісьменнікаў. Жыве ў Полацку.

— Доконд? — жартам гукае Чэсь, раскрыльвае рукі, не падпускаючы дзяўчынак да печкі, і Лена хвацка б'е яго спачатку па плячы, а потым па брыльку канфедэраткі.

— Чаго гэта ты зіму пужаеш? — выдыхае дзяўчына, прыціснуўшы далоні да печкі, — глядзі, каб вушы не адваліліся, — сьмяецца Лена, і хлопец адразу хмурнее: летнюю шапку ён носіць дзеля форсу, і пасля такіх смешкаў вушы Чэсевы яшчэ больш пунсавеюць.

Праз латку незацярушанага інеем акна зыркае, працінаючы пунсовыя Чэсевы вушы, сонечны прамень.

— Дзеці, заўтра кожны мусіць прыхапіць з дому палена, — вітаецца з вучнямі настаўніца, потым глядзіць на Чэся й незадаволена заўважае: — Пераступаючы школьны парог, трэба здымаць галаўныя ўборы.

Хлопец няўцямна лыпае вачыма, і Цыба стоена дадае:

— Шапку здымі.

Клас поўніцца сонечным святлом. Шэрань на вокнах вясёлкава блішчыць, а на пашарпанай падлозе дрыжаць рознакаляровыя плямы.

— Што, фарсун, ва ўсіх шапкі, а ў цыбе галаўны ўбор? — гукае Лена Патыка, дзяўчынкі пырскаюць смехам і раптам аціхаюць, пазіраючы паўзверх шышкаватай Чэсевай галавы. Там, над класнай дошкай, з'явіўся партрэт вусатага дзядзькі. Адбітак сонечнага святла дрыжыць на глюгастым носе, кранаецца ваяўнічых вусоў, і гэта стварае ўражанне, што дзядзька залівіста смяецца.

«На солтыса падобны», — думае Змітрок. У солтыса Брошкі таксама быў глюгасты нос і такія ж густыя, пракураныя вусы.

— Дзеці, сталі роўна! — прамаўляе настаўніца, ляпае ў ладкі і прыкметна суравее з твару.

— Чалавек, якога вы бачыце на партрэце — Іосіф Вісарыёнавіч Сталін! — Цыба вытрымлівае паўзу, гнеўна глядзіць на Чэся, які пацірае гарачыя пасля марозу вушы, і працягвае: — Таварыш Сталін — правадыр працоўных нашай краіны і ўсяго свету, вялікі друг савецкіх дзяцей. Ён думае пра кожнага з вас, думае пра тое, каб... — настаўніца трасе рукамі, падбіраючы патрэбныя словы, і Лена Патыка, лыпнуўшы вачанятамі, уражана пытаецца:

— Ён штосьці... і пра мяне думае?

Настаўніца праводзіць далонню па дзявочай галаве, парывіста ўздыхае:

— Думае, Леначка: і пра цябе, і пра Дану, і пра... — рука цягнецца да Чэся, ды той гучна чхае, і Цыба незадаволена хітае галавою...

На другім уроку Зьмітрака цягне на сон. Хлопец сядзіць, прыкрыўшы рот — Цыба не любіць, калі хто пазяхае — і асавела глядзіць на мапу Савецкага Саюза, па якой шнарыць канец настаўніцкай указкі. Да вушэй далятаюць толькі асобныя сказы.

— ...А там, за бацюхнам-Уралам, ляжыць суворы і казачна багаты край — край вячыстых лясоў, магутных рэк, высокіх гор, якія хаваюць у сваіх нетрах незлічоныя багацці...

Змітрок употай пазяхае, і зялёная, пакрытая атожылкамі рэк Заходне-Сібірская раўніна паволі расплываецца ўваччу.

— ...Сталінскія пяцігодкі непазнавальна змянілі гэты край... Там, дзе зусім нядаўна шумела тайга і блукалі непалохаваныя мядзведзі, сёння паўсталі новыя гарады і пасёлкі, леглі сталёвыя рэйкі чыгунак, загулі турбіны заводаў і фабрык... Пройдзе зусім няшмат часу, вы станеце дарослымі і, магчыма, хтосьці з вас паедзе ў далёкую Сібір працаваць на будоўлях камунізму...

У калідоры грукаюць дровы — гэта цётка Агата прынесла да печы апошні абярэмак; дзесьці знадворку, нібыта абуджаныя грукатам дроваў, пырхаюць коні, і Змітрок з Чэсем прыбіваюць насы да марознай шыбы.

Па вуліцы едзе абоз. Схуднелыя коні цягнуць шырокія развалкі, на якіх сядзяць людзі ў спічастых шапках.

— Жаўнеры, — выдыхае Чэсь, і настаўніца, адсунуўшыся ад акна, папраўляе:

— Не жаўнеры, а байцы Чырвонай Арміі.

Цыба стукае ўказкай па падаконніку, заклікаючы вучняў сесці, ды тут брынкае званок — цётка Агата чамусьці зазваніла раней часу.

За палякамі ўсе вучыліся разам, у школе-сямігодцы. Цяпер малечу адасобілі; школка, дзе займаюцца Змітрок з Чэсем, называецца пачатковай і месціцца на ўскрайку мястэчка, у былой габрэйскай краме. Да сямігодкі паўвярсты хады, аднак хлопцы маюць завядзёнку: бегаць туды пад час вялікай пярэрвы. Цікава ж пакруціцца сярод старэйшых мальцаў, паслухаць іхнія размовы. Ну а сёння і пагатоў: абоз з жаўнерамі прыехаў... Ці ўседзіш тут у школе.

Цётка Агата яшчэ бомкала званком, а Змітрок з Чэсем, на хаду насоўваючы кажухі, ужо бухнулі плечукамі ў дзверы. Бухнулі раз, другі, і толькі тады зразумелі, што дзверы зачыненыя.

— Мароз... на вулку ніхто не пойдзе, — азвалася Цыба. Распіхваючы вучняў, што высыпалі з класу, настаўніца падбегла да вакна ў канцы калідору. З дапамогаю цёткі Агаты ўзлезла на падаконнік, расчыніла фортку.

— Товарищи, куда поехали красноармейцы? — крыкнула, пусціўшы марозную аблачынку, Цыба, і ў гэты момант у дзверы пастукалі.

Цётка Агата хуценька іх адчыніла, хлопцы памкнуліся скочыць на двор, ды ўбачылі на парозе заінелага вайскоўца.

— Младший политрук Сергиеня, — адрэкамендаваўся вайсковец, пераступіў парог, і цётка Агата — ці то з перапуду, ці то з якой іншай прычыны, ізноўку дачасна бомкнула званком.

Настаўніца таропка пісала на дошцы. Крэйда крышылася, сыпалася долу, і літары атрымліваліся пахілымі і нязграбнымі. «Да 17 верасня 1939 года беларускія сяляне... — слова «сяляне» атрымалася зусім нечытэльным, таму Цыба сцерла яго і напісала па-новай, — ...сяляне... стагналі ў ярме польскіх паноў і капіталістаў».

Дрогкая рука кранулася лобу, пазначыўшы яго белай мецінай.

— Перапішыце сказ, запісаўшы лічэбнікі прапісам, — настаўніца перавяла дыханне, падышла да класных дзвярэй і ўжо з калідору задыхана прамовіла: — Сядзець ціха, я зараз прыйду.

«Да сямнаццатага... — напісаў Змітрок, тыцнуў асадку ў каламар. «Сямнаццатага ці семнаццатага?» — падумаў хлопец, скасіў вока ў Ленчын сшытак, але суседка закрыла сшытак бібулай. Чэсь таксама памкнуўся зірнуць цераз Ленчын плячук, але атрымаў чытанкай па галаве.

— Выдатніца сраная, — буркнуў Чэсь, а Ленка, не азіраючыся, выдыхнула яшчэ больш абразліва: — Асаднік недабіты.

У Чэся па пісьму адныя двойкі: беларуская мова яму даецца цяжка.

Рыплівае пёрка выводзіць слова «стагналі», і на паперы расплываецца невялічкая клякса. Змітрок незадаволена крывіцца, прыкусвае ніжнюю губу, міжволі задумваецца над сэнсам напісанага. Цыба піша, што сяляне стагналі, але ж гэта лухта. Стагнала толькі іхняя бабця Наста. Паўгода адляжала, хворая, на печы і памерла на яблычны Спас.

Пад драбы тыцнула асадка, і Змітрок азірнуўся. Чэсь, што сядзеў за ягонай спінай, шматзначна таргануў галавой. Пудка ступаючы па рыплівай падлозе, хлопцы выслізнулі з класу, агледзеліся. Цётка Агата, відаць, выйшла на падворак: калідор быў пусты, і браты, не чуючы ўласных ног, падкраліся да дзвярэй настаўніцкай.

— Вы тут всех знаете, а потому должны нам помочь, — басіў за дзвярыма малодшы палітрук. У настаўніцкай чыркнулі запалкай, аддзьмуліся, і вайсковец, нібыта згадаўшы пра штосьці, спытаў: — Да, кстати, сколько у вас детей осадников?

— Двое: мальчик и девочка, — адказала Цыба, — мальчик трудный... демонстративно ходит в польской шапке...

У настаўніцкай затупалі, дзверы тузануліся (вайсковец, відаць, хацеў пераканацца — ці шчыльна яны зачыненыя), і хлопцы, страпянуўшыся, на цырлах пабеглі ў клас.

Неўзабаве вярнулася і настаўніца. Была яна расчырванелая і ўсхваляваная.

— Заўтра, у сувязі з моцным маразам, заняткі адмяняюцца, — з робленай весялосцю абвясціла Цыба. Вучні радасна загарлалі, заляпалі вечкамі партаў, і толькі Чэсь не выказаў радасці: сядзеў, наструнены, з трывогаю пазіраючы на настаўніцу.

Ля мястэчковага клуба, які па старой памяці называюць Народным домам, — поўна народу. Гукае п'яныя песні Яська Хадаронак — адзіны на ўсю акругу апівуда; гергечуць, збіўшыся ў кучу, старыя габрэі; пырхаюць на марозе коні. Ля плота трашчыць сухімі карчагамі вогнішча — яго, відаць, распалілі вайскоўцы, а поруч з вогнішчам, аточаная з усіх бакоў цікаўнымі жанкамі, мазоліць язык Наста Амяльянчык — мястэчковая балаболка.

— Будзе як летась: усіх мужыкоў пабяруць і на хронт адправяць, — сакатала Наста асіплым голасам.

— А куды ж гэта адправяць? — улякнута запыталіся ў натоўпе.

— Ну ў гэную... як яе...

— У Фінляндыю! — падказаў Чэсь, і цёткі разам азірнуліся.

— Чаго бабіны плёткі слухаеце, вушы марозіце?! — адбіўся ад хлапечых спінаў звяглівы голас Насты, — хлопцы ўжо беглі да траскучага вогнішча, і Чэсь, тузануўшы брата за рукаво, каротка выдыхнуў:

— Глянь!

Да клуба бойкай хадою ішоў малодшы палітрук Сергіеня, а

Цікава ж пакруціцца сярод старэйшых мальцаў, паслухаць іхнія размовы. Ну а сёння і пагатоў: абоз з жаўнерамі прыехаў...

# ПАТУХАЮЦЬ ЗОРКІ

следам за ім, цiснучы да грудзей нейкiя паперы, няўпэўненым крокам тэпала Цыба.

— Па хатах ходзяць, падсабачнікаў збіраюць, — прасіпеў Яська Хадаронак, смачна плюнуў, і ўсе, хто стаяў поруч, знямела аціхлі.

Падсабачнікамі ў мястэчку называлі савецкіх актывістаў.

Палітрук з настаўніцай увайшлі ў клуб, і ў той жа міг на адкрытай клубнай верандзе паўстаў чырвонаармеец з даўжэзнай вінтоўкай у руках. Чырвонаармеец хукнуў у далонь, ускінуў вінтоўку на плячо, і востры багнет мякка ўехаў у нізкую столь. Уехаў даволі глыбока, бо ваяку давялося прысядаць, тузаць за руль, і гэта выклікала вясёлы смех дзятвы.

— Вот... щас яйцы вырежу! — крыкнуў ваяка, адкінуў крысо шыняля, і падшыванцы — а іх было вакол як мурашак, — кінуліся ўроссып.

Змітрок з Чэсем таксама адбеглі, але недалёка. «Пужае, а ў самога, відаць, і ножыка няма», — падумаў Змітрок, сціснуўшы рукою тронкі сцізорыка. Трохлязовы, са штопарам і шылам, сцізорык ён знайшоў летась на дарозе, і цяпер з ім не развітваўся. Нават ноччу клаў пад падушку.

— Ну што, падшыванцы, змерзлі? — пачулася з-за спіны, і паветра скалануў хваравіты кашаль.

Дзед Мартуль, у хаце якога кватаравала настаўніца, доўга, з усхліпам кашляў, нарэшце сумеўся, страсянуў галавою:

— Чаму не ў школе?

— Адпусцілі... з-за марозу, — адказалі падшыванцы, і дзед дакорліва хмыкнуў.

— Хэк-х... за партай сядзець — холадна, а па вуліцы гойсаць — цёпла?

Дзед ізноў кашлянуў, падчапіў кульбой змерзлы конскі яблык.

— Ну, а дзе лепей вучыцца — у польскай школе, ці ў гэнай... савецкай?

— У по-ольскай! — парна выдыхнулі хлопцы, — там каву давалі.

Хлопцы ўжо рушылі ўпрочкі, ды дзед Мартуль ізноў падаў голас:

— Ад бацькі нічога няма?

Чэсь на імгненне запыніўся і, замест адказу, панурыў долу заінелыя вейкі.

Мінулым летам тутэйшых асаднікаў пабралі ў польскае войска, і ніхто з іх назад не вярнуўся. Згінуў недзе і Чэсеў бацька — шыракаплечы й віславусы пан Станіслаў. Чэсю цяпер даводзілася дапамагаць маці па гаспадарцы, таму, пагрэўшыся ля вогнішча, ён рушыў да хаты, а Змітрок яшчэ доўга марозіў нос і дамоў заявіўся сінім адвячоркам.

Кінуўшы ля рукамыйніка кайстру з кніжкамі, хлопец доўга піў квас з гладыша, потым, не зняўшы шапкі, куснуў салёнага гурка і пачуў здушаны матчын шэпт:

— Ой, баюся я гэных Саветаў. Людзі надоечы казалі: леснікоў і асаднікаў высяляць будуць... А куды ж Куліна паедзе... з Чэсем на руках?

Бацька штосьці прабурчэў у адказ і, падвысіўшы голас, запытаўся:

— Змітрок, ты?!

— Я-а, — азваўся хлопец, чмякаючы на ўсю кухню й расшпільваючы азалелымі пальцамі кажух.

— Чаму так позна? — запыталася ў сваю чаргу маці, і сын, зноў прыклаўшыся да гладыша, прагугнеў:

**Чырвонаармеец хукнуў у далонь, ускінуў вінтоўку на плячо, і востры багнет мякка ўехаў у нізкую столь**

— Пяць урокаў было.

Маці дастала з печы чыгунок з капустай, накроіла хлеба.

— Ну... што там людзі кажуць?

Перад тым, як есці капусту ці полiўку, Змітрок звычайна кроіў сцізорыкам хлеб на дробныя кавалкі, а тут адразу куснуў самую тоўстую скібу і, жуючы, няўцямна прамармытаў:

— Казалі... мужыкоў на фронт адпраўляць... у Фінляндыю.

— Авохці мне! — прашаптала маці, адкаснулася ад стала, а бацька, кінуўшы на падлогу штосьці мяккае і важкае, наструнена запытаўся: — А дзе пачуў?

— Наста Амяльянчыкава казала.

— О-от! Знайшоў, каго слухаць...

На падворку здаволена брахнуў Жук, хтосьці здушана войкнуў, і бацька, з хамутом у руках, кінуўся ў прысенак.

— Куля?! Ты?!

— А людцы мае... а што ж гэта... а пранясі, Госпадзь... — цётка Куліна, Чэсява маці, убілася ў кухню, тройчы перахрысцілася на абраз.

— Ды скажы ты... што здарылася? — прасіпеў бацька, адкінуўшы ўбок хамут.

— Патыкаў высылаюць! Прыйшлі во зараз з вучыцелькай... Тры гадзіны на зборы... Патычыха самлела, снегам адціраюць.

На ганку бомкнулі вёдры — маці хадзіла да студні — і ў пройме наросхліст адчыненых дзвярэй матлянулася ейная сутулая постаць.

— Пра Стася што ўведала?!

— Патыкаў высылаюць, — выдыхнула цётка Куліна, а бацька, незадаволена крэкнуўшы, пайшоў зачыняць уваходныя дзверы.

У хату белым туманком уварваўся мароз, скалыхнуў фіранкі на вокнах.

— Як ты, Куля, мяне напужала, — маці прыпала на калена, укінула ў печ пару бярозавых аскабалкаў.

— А як і мяне высяляць?.. — цётчын голас сарваўся, і хата напоўнілася здушанымі ўсхліпамі.

— Ды хрысціся ты, далібог... Патыка палясоўшчыкам быў, са стрэльбаю хадзіў. Брошка ў солтысах круціўся... А ты што? — бацька падхапіў хамут: — Усё жыццё ў зямлі адпрацавала.

— Дык асаднікі ж... — усхліпнула цётка Куліна і зноўку, аж дзевяць разоў запар, перахрысцілася.

Цётка Куліна брала шлюб у касцёле і ў сваёй хаце жагналася па-польску. Калі ж завітвала да сястры, дык хрысцілася па праваслаўнаму, спехам прамаўляючы доўгія малітвы і нізка ківаючы галавой.

Маці з цёткаю пашапталіся аб нечым на кухні і неўзабаве, не сказаўшы ні слова, падаліся на двор. У хаце стала ціха, адно тахкалі ходзікі ды раз-пораз рыпела суровая нітка: бацька зашываў стары хамут.

Змітрок ляжаў на печы, салодка пазяхаў. Лагоднае цяпло і замарачныя зыкі кранаўся павекаў, рабілі іх цяжкімі; павекі пачалі зліпацца, і ўваччу заблішчэў снежны пыл. Пыл ападаў з высокага неба, казытліва кранаўся твару, і сярод мірыядаў бліскучых іголак дрыжэла, працінаючы нябесную яснату, апошняя зорка. Усё наўкол: высокае неба, неабсяжны, засцярушаны пульхнатым снегам абшар, і нават зорка над галавою здаваліся чужымі, нетутэйшымі; і велічная ціша панавала над светам, здушыўшы шорхат снежнага пылу і грукат сэрца ў грудзіне. І сярод гэтай велічнай цішы прагучалі, немаведама скуль узяўшыся, сабачы брэх ды ўладны воклік:

— Эй, хозяин, запрягай лошадь!

На падворку кашлянулі, мацюкнуліся на Жука, які захадзіўся ад брэху, і, крыкнуўшы «Подъезжай к клубу!», патупалі да весніц.

Змітрок са смяшком на вуснах назіраў, як бацька падхапіўся на ногі, войкнуў, пачаў дзьмуць на палец — укалоўся, відаць, шаршаткай, — і, з хамутом на карку, прыпаў да акна.

— Во прынесла нячысцікаў, — прамармытаў бацька, углядаючыся ў цемру, потым уздыхнуў і, апрануўшыся, пайшоў запрагаць Зорку.

Страшна аднаму сярод ночы. Вецер гудзе ў коміне, у цёмным куце нехта пішчыць і шкрабецца, а на гарышчы чуваць стоеныя крокі ды парывістыя ўздыхі.

Газы ў бутэльцы засталося на палец, але Змітрок запаліў усе тры лямпы, а пачуўшы, як у коміне заенчылі, а потым заплакалі, упусціў у хату Жука — чорнага, з белай мецінай на шыі, дварняку.

Праз некаторы час дзесьці непадалёк — ці не на суседнім падворку — голасна крыкнулі, рыпнуў снег, і Жук, падляцеўшы да вакна, здаволена махнуў хвастом.

— А Змітрачок, а сыночак жа ты мой... адчыняй жа хутчэй, — ад самых весніцаў залямантавала маці. Змітрок пабег адчыняць, і зімовы холад, што вырваўся з прысенку, крануўся хлапечай грудзіны.

З таго самага імгнення, калі маці — расхлістаная, амярцвелая, з узбітымі на вочы валасамі, — уляцела ў хату, нібыта ліпкае павучынне завалакло вочы. Хлопец стаяў, няўцямна назіраючы, як маці зрывала з цвікоў старыя кажухі, скідвала на падлогу падушкі ды звязвала іх, прыдушыўшы каленам... Цяжка было зразумець — што здарылася, куды гэта збіраюцца гнаць Чэся («За свет, Змітрачок, гоняць нашага Чэську-у!»), і матчынае галашэнне сцюдзёным скавышом казытала пяткі.

Потым яны, не разбіраючы дарогі, беглі да клуба. Маці — яна цягнула на спіне аграмадны хатуль — колькі разоў падала, Змітрок, плаксіва шморгаючы носам, дапамагаў ёй падняцца; са спавітага анучкай сагана, які ён нёс, кожнага разу выплюхвалася гарачая капуста, і Жук, круцячы носам, падскокваў адразу на чатырох лапах і зморана дзяўкаў.

На чорным небе сноўдала палымніца, адбіваючыся на верхавінах высокіх хвояў, на спусцістым царкоўным даху, на рашотчатых вокнах. Яны абмінулі царкву, завярнулі направа і тут жа прыцішылі крок. На пляцы перад клубам злавесным барвовым агнём гарэлі вогнішчы, мільгалі чырвоныя людскія твары, плылі ў марозным тумане абынелыя конскія храпы; там бязладна гаманілі, крычалі, галасілі, і сярод гэтага вэрхалу прарываўся дрыготкі голас Цыбы:

— Граждане! Чего вы кричите?! Вас же не на тот свет отправляют, а переселяют в восточные районы страны. Советская власть о каждом из вас позаботится...

Цыба яшчэ нешта крычала, але словы ейныя патанулі ў немым жаночым плачы.

— А сястрыца ты мая родная!... А куды ж цябе пасылаю-юць?! — загаласіла маці, і ад таго ляманту заняло дыханне і сталі кісельнымі ногі.

Змітрок хацеў быў пасунуцца да вазоў, ды натыкнуўся на старога Мартуля. Стары стаяў, абапёршыся на кульбу, захлынаўся тытунёвым дымам, раз за разам паўтараў:

— Заўтра ж паганю з хаты гэтую сучку.

На першых санях, у якія быў запрэжаны худы чырвонаармейскі конік, сядзела Лена Патыка. Дзяўчынка была ўхутаная ў шэрую пуховую хустку, на свет глядзелі толькі затуманеныя дакорлівай слязінай вочы, і Змітраку падалося, што яны глядзяць аднекуль з недасяжнага прадоння.

— Трогай! — закрычалі з канца абозу; натоўп загарлаў, замітусіўся, пад нагою храснула грамафонная кружэлка, і перад вачыма паўстаў малодшы палітрук Сергіеня.

— Спокойно, граждане! Всем оставаться на своих местах!

Нейкая ашалелая цётка штурхнула ў спіну, Змітрок паваліўся, і ў твар яму горача дыхнулі: гэта Жук лыкаў праліту на снег капусту. Ад капусты падымалася падсветленая вогнішчам барвовая пара.

— А куды ж ты іх павязеш?! — маці тузанула крысо бацькавага кажуха, і бацька, з нейкім роспачным спакоем, тузануў лейцы.

Зорка пырхнула, прыўзняла пярэднія капыты, палазы натужліва рыпнулі, і Чэсь, які сядзеў на кучы майна, скаціўся з возу.

— Лена таксама едзе, — выдыхнуў Змітрок, тыцнуў у братаву руку сцізорык і застыў у непаразуменні. — Чэсь узняўся ў паветра, матлянуў нагамі, пляснуўся на кучу майна.

Малодшы палітрук схапіў яшчэ некага за каршэнь, ускінуў на воз, потым выхапіў з кабуры наган, стрэліў у паветра.

Ля царквы загарлалі вароны, небарака Жук, ужо дарэшты асіплы, кінуўся, падкурчыўшы хваста, да плоту, а ў аглушаных стрэлам вушах спачатку ледзь чутна, а потым усё гучней і гучней заспявалі палазы. Сані пралягалі міма, за імі беглі людзі, нейкая цётка — тая, што збіла Змітрака з ног, — хрысціла абоз святым абразом, нейкі дзядзька — ці не зяць зніклага Брошкі, — пнуўся, са швейнай машынкай на карку, дагнаць развалкі, на якіх ехалі Патыкі, а не дагнаўшы, ускінуў парэпаны «Зінгер» на апошнія сані. На тых санях, якія цягнула кульгавая, мышастай масці, кабылка, ехала цётка Агата. На струхлелай саломе ляжалі два саганы, а ў руках — цвёрда, як пахавальны крыж, цётка трымала закураны рагач.

Раніцою яго абудзіла тупаніна — гэта бацька абабіваў у прысенку ногі. Змітрок прыспана павёў вачыма, прымружыўся... Неба знадворку было бяздоннаружовым, і на ім паволі тухлі, патаналі ў ружовым бяздонні апошнія зоркі.

— Ну... як там? — змучана запыталася маці.

Бацька адказаў не адразу. Уздыхнуў, ляпнуў па стале закарэлымі рукавіцамі.

— Як... звезлі на станцыю ды ў «стальпіны» пасадзілі.

— Ну а потым куды?

— У Сібір... куды ж яшчэ...

Маці ціха, з усхліпам заплакала, а Змітрок салодка пацягнуўся. Адчуванне таго, што сёння не трэба ісці ў школу, і што Чэсь паехаў у Сібір — у гэты казачна багаты край, напоўніла душу маладой, як студзеньская раніца, празрыстай радасцю. Змітрок кульнуўся на бок, і на твар ягоны павеяла лёгкай прахалодай. Гэта іскрысты снег ападаў з высокага неба, кранаўся гарачага ілба, і сярод мірыядаў бліскучых іголак дрыжэла, працінаючы нябесную яснату, апошняя зорка. Змітрок зірнуў з-пад рукі на неба і пачуў раптам вясёлы смех. Чэсь — заружавелы, з кучмай снегу на шапцы, стукаў нагой па камлях высозных сібірскіх елак, спехам адбягаў, а следам за ім адбягаў, кожнага разу патрапляючы пад снежную лавіну, чалавек у даўгім шыняллі.

«Сталін», — прашаптаў Змітрок, і вусны ягоныя — у сне і на яве, — кранула трапяткая ўсмешка.

# ЛЁД

## СНЕННЕ

Жана КАПУСТА



### 1. КАЙ

Вы — хірург-фанатык. Вам здаецца, што скальпелем Вы лашчыце. Таму лічыце непатрэбным наркоз. Вы можаце прадугледзець зыход аперацыі. Але не можаце ведаць, што будзе думаць пацыентка падчас і пасля аперацыйных практыкаванняў.

Дык пра што ж я думала?

Пра сінтэз надзеі й немажлівасці? Не.

Пра няскончаны партрэт Вітаўта? Не.

Пра маё няіснае ўчора? Не.

Пра твой (надакучыла менавацьцябе ВЫ) боль?

Я прымала рухі скальпеля за тваю пяшчоту. Ты на гэта й разлічваў.

Мая смелая шчырасць (ці шчырая смеласць) сталася для нас абодвух гульнёй, але я змяніла правілы без твае згоды, а ты гуляеш па старых. Не дзеля пратэсту — проста, як заўсёды, ты нічога не заўважыў. І помсціш. Усё за тое ж. За разбурэнне твае ўладкаванае сапраўднасці.

Так, ты — хірург. Гэта прыдумала я. А ўвогуле ты мастак, мастак-аматар. Ты малюеш партрэты вялікіх князёў, але табе чамусьці ніяк не даецца партрэт Вітаўта. І ёсць у цябе ўжо колькі няскончаных Вітаўтаў, і ім страшэнна прыкра за свой няскончаны выгляд, а разам з імі – і табе.

Мы казалі адно аднаму нейкія пустыя й бязглуздыя словы, седзячы ў паўпрыцемку такой жа пустой і няўтульнай кавярні, на дзвярох якой ужо колькі месяцаў вісіць шыльда «РАЗВАЖАЦЬ ЗАБАРОНЕНА».

І ўсё было не так, бо мы абодва разважалі: я намагалася расчытаць твой боль, а ты занадта спяшаўся пакінуць яго ўва мне назаўсёды. Мой жа боль разгублена мітусіўся на маіх вейках і спешка хаваўся ў вачох, а пасля... туліўся да тваіх скроняў, калі мы развіталіся.

Ты не ведаеш, колькі разоў я марыла пра АПОШНЯЕ спатканне з табой, каб забраць усю тваю самоту цалкам і больш ніколі не бачыць, не чуць, не сніць цябе. Ты не быў бы супраць і не сказаў бы, што гэта немагчыма. Толькі я ведаю, што

ёсць людзі, якія сэнсуюць жыццё

ёсць людзі, якія йдуць поруч

ёсць тыя, пра каго памятаеш

і ёсць тыя, хто трапляецца па дарозе.

Ты – сэнсуеш маё жыццё.

Я – неяк не ў час напаткалася табе па дарозе.

Мы не ў розных светах, свет для ўсіх адзін. Мы на розных паралелях.

За намі была толькі тая кавярня з папададжальнай шыльдай. Перад намі... перад табой — утульная кватэра, дзе сярэднявечныя палацы й зазвычай спакойныя позіркі літоўскіх князёў штодня й штоночы ўсочваюць у сябе водар адзіноты. Перада мной — чыстыя аркушы паперы. НАС у будучыні, як і ў цяперашнім, не йснуе.

Я ў чарговы раз убачу шыльду «РАЗВАЖАЦЬ ЗАБАРОНЕНА» і раптам зразумею, што чытаць яе трэба не так... літары набрыньваюць сэнсам... «БЕЗ ДАЗВОЛУ». А ты кажаш:

– Глядзі, змянілі шыльду.

Крывадушым, Кай, брыдка крывадушым. Мы ад самага пачатку ведалі, што не маем дазволу. І гэтая кавярня не цяпер пераўтварылася для нас у сымбаль пакалечанае прышласці — яна сталася ім, калі мы ўпершыню адчынілі гэтыя дзверы. І шыльда заўсёды была такой, якой мы ўбачылі яе кагадзе.

Мажліва, калісьці я забудуся на цябе. Я не ведаю. Як не магу ведаць і таго, ці паўторыцца яшчэ раз мінулае.

Пакуль што я перажываю адаптацыйны перыяд пасля аперацыі.

### 2. ДОЖДЖ

Пайшоў дождж. Я вярталася ад цябе, пазычыўшы парасон у скрухі, і размаўляла з тваімі думкамі (якіх ты ніколі не выказваў мне, але якія я заўсёды магла прачытаць) — адказвала ім,

«БАШСЯ ВЯСНЫ,

МОЙ КАЙ»

Дождж пачаў абурацца, што я замінаю яму спяваць: быццам нехта не адчуе праз мяне ўсяе геніяльнасці яго экспромтаў. Як на маё, дык ён проста баіцца прызнацца, што ў яго вельмі ціхі голас.

(«НЕ Я ПАСТАВІЎ ГЭТУ ШЫБУ,

НЕ Я ПРЫДУМАЎ ГЭТЫ ДОЖДЖ»)

Гэта так жахліва — умець чытаць твае думкі, адгадваць твае асацыяцыі з кожным словам, тэмай, рэччу... Так жахліва, бо я не магу ў той жа момант сказаць табе пра гэта, бо я не павінна чытаць твае вочы тады, калі яны найвыразней чытаюцца.

«ЗВАНОЧКІ САНАК ЗІМЫ

ЦЯБЕ ТАК ЦЕШАЦЬ»

З дажджом ніколі нельга пагутарыць шчыра. Ён нізавошта не прызнае свае банальнасці, а часам, са злосці, хочацца яму гэта даводзіць. Ён такі смешны, калі пачынае злавацца: спачатку, ад абурэння не знаходзячы словаў, пырскае слінай, а пасля пачынае плакаць, як пакрыўджанае дзіця. І яшчэ хоча, каб пра яго пісалі вершы!

(«DIE EINSAMKEIT IST WIE EIN REGEN»)

Мне невыносна ведаць, што зараз цябе агортвае цішыня, якая пачынае напаўняцца сэнсам толькі тады, калі ты, спешка раскідаўшы ўспаміны пра мяне ў гармідары адчуванняў, нарэшце прызнаешся сабе, што сказаў мне нашмат больш, чым дазваляла тая адлегласць, якая ляжыць між намі, але недаравальна менш, чым хацеў бы.

«ІМКНЕННЕ ЗАМЫКАЕ ВУСНЫ»

Ты баішся шчырасці. Ты страшэнна баішся шчырасці, бо яе табе нестае найперш. Ты ўбачыў яе ўва мне, адчуў імгненна й адразу ж перанёс гэтую — маю — шчырасць на сваё жыццё. Але так жа ймгненна й амаль адначасна ты зразумеў, што яна немагчымая для цябе.

Ты ўдзячны лёсу за тое, што я трапілася табе па дарозе, але больш за ўсё ты хацеў бы, каб гэтага не адбылося. І ты пачаў ратавацца: усё рабіць дзеля таго, каб адлегласць між намі павялічвалася з кожным днём усё больш і больш. Я назіраю за гэтым моўчкі, бо ведаю, што ты нямоцна верыш свайму ратунку і разумееш, што адным толькі словам, адным дотыкам магу разбурыць тваю кволую, напалоханую шчырасцю рэчаіснасць, але я не зраблю нічога і ўсё з той жа суцішанай маўклівасцю буду проста назіраць, покуль ты не пакінеш шукаць мяне ў выпадковасці й не пачнеш шукаць насамрэч.

«ІГОЛАК ТЫСЯЧА

БЯЖЫЦЬ ПА ГОРЛЕ»

Кат. Я так прыдумала: ты — мой кат. Мой мозг шматкуецца марамі пра цябе, я жыву толькі ў тым злепку з тваёго позірку, які паспела зрабіць мая памяць.

Так, так, ты — мой кат. А кат мусіць караць смерцю. Аднойчы – я гэта ведаю – я пакладу на плаху сваё каханне, і ты лязом якога-небудзь жартаўлівага слоўца адсячэш яму галаву. Пастарайся, калі ласка, патрапіць удала, каб не засталося надзеі на выжыванне.

Зрэшты, кат можа й памілаваць. І толькі вельмі жорсткі дазваляе сабе марудзіць.

«КАЙ»

Дождж не ведае, што такое каханне, ён вечна пакрыўджаны і не ўмее любіць, таму не разумее таго, што я расказваю, і злуецца.

– Дзівак ты, – кажу, разблытваючы пальцамі ягоныя мокрыя касмылі, і пачынаю яму лесьціць – чытаць нейкія напаўзабытыя вершы пра нечыя шэра-блакітныя вочы. Ён думае, што гэта прысвячаецца яму. Хай думае. Насамрэч я ўжо даўно прысвячаю вершы толькі табе.

«НЯ БУДУ ЦЯБЕ ТРЫВОЖЫЦЬ

НЕ ПАЙДУ ЗА ТАБОЮ»

Я так доўга крочыла па тваёй дарозе — збірала твае каменьчыкі, сварылася з тваімі камянямі, шапталася з тваімі ваўкалакамі, запамінала пах пылу...

І пасля, стрэўшы цябе, зразумела, што ты мяне не клікаў.

Я шалёна бегла назад — няўцямна сціскала ў руках каменьчыкі, трывала кпіны камянёў і ўсё аніяк не магла ўзгадаць, куды трэ звярнуць, каб трапіць на сваю дарогу ці хаця б куды, абы сысці з тваёй...

І калі я вярнулася ў пачатак, я ўбачыла, што там ужо стаіць дарожны слуп з надпісам «НЕЗВАРОТНАСЦЬ».

«НА ПОЛЮС»

Урэшце дождж мне надакучыў. Ягоныя гісторыі скончыліся, мае вершы таксама, і я цвёрда вырашыла з ім развітацца. Думала, закрыўдуе, а ён ветліва пажадаў мне дабранач, хаця ў Менску ўжо пачыналася раніца.

«ДЗЕ ЗАМКІ З ІЛЬДУ

І СВЕЦІЦЬ ПАЎНОЧНАЕ ЗЗЯННЕ»

Мне вельмі часта сніцца гэты недарэчны сон: я сяджу ля высачэзнага цаглянага мура й прыслухоўваюся, ці не пачуюцца за ім — па той бок — твае крокі. А калі я стамляюся прыслухоўвацца, то пачынаю цябе клікаць. Толькі ты ані разу не адгукнуўся, і ані разу я не пачула тваіх крокаў.

(«НЯ МОЖА ЛІЧЫЦЦА ЖЫЦЦЁМ ТОЕ, ШТО НЕ ПЕРАЖЫТА»)

Я тады не магла дараваць табе, што ты не адштурхнуў мяне аднаназначна груба, што ты проста не сказаў «нічога-ніколі-бывай-забывай-як-хочаш».

Але ты не адштурхнуў мяне, і – пачалося: прымаць цябе, чытаць цябе й ведаць, што ніколі не быць для цябе той, якая мае на гэта правa.

«НЕ ПАЙДУ

НЕ ПАБЯГУ ЗА ТАБОЮ»

Золак! Гэй, Золак! Чуеш?! Я цяпер ведаю больш за цябе (вядома, пасля ночы, праведзенай з дажджом). Але я нікому не раскажу, калі ты пагодзішся выканаць адну маю просьбу. Згода? Ну, то падыходзь бліжэй, я скажу табе на вушка...

«МОЖА...

БАСАНОЖ...»

Я была пэўная, што адной волі дастаткова, што яна можа загадваць і прымушаць сабе падпарадкоўвацца. Але мая здрадлівая воля сарамліва апускае перада мной вочы й забіваецца ў самы цёмны кут майго кахання, калі я бачу цябе. Яна баіцца тваіх рук. Але больш за ўсё яна баіцца твайго голасу. Яна пачынае гістэрычна сціскаць скроні, калі ты вымаўляеш маё імя. І пасля мне самой даводзіцца адхайваць яе бездакорна лагічнымі высновамі.

«А КРОЎ ПАБЯЖЫЦЬ ЗА МНОЮ»

З першым позехам неба горад пачынае ляніва прачынацца. Два няўрымслівыя промні, весела перамаўляючыся, спяшаюць да вакна твае спальні. Перад халоднымі шыбамі яны спыняюцца на хвілю — раздумваюць, як патрапіць у пакой. І нарэшце знаходзяць у раме нейкую шчыліну...

Ты спіш.

Промні асцярожна, на дыбачках, падыходзяць да твайго ложка. Мо на нейкі момант ім нават робіцца шкада цябе будзіць... Спачатку яны змоўліва ўсміхаюцца адно аднаму... і раптам узлазяць па коўдры на ложак, пачынаюць гучна смяяцца, скакаць па тваіх плячох, казытаць тваю шыю, покуль ты не расплюшчваеш вочы. Тады яны змаўкаюць і, з цяжкасцю стрымліваючы смех, ляцяць навыперадкі да вакна.

Прачынайся, Кай, гэта чарговая раніца. Проста я папрасіла золак пабудзіць цябе як-небудзь незвычайна.

«НЕЦЯРПЛІВЫХ СЛЯДОЎ,

КАЙ, МАІХ ДА ЦЯБЕ»

Я таксама вінаватая перад табой. У мяне не хапіла цярплівасці чакаць, покуль ты мне паверыш. А ты мне не паверыў.

Так, я вінаватая перад табой. Твае споведзі прымушалі бачыць мяне за сабой пустату, перад сабой — бездань, і я не паспела зразумець усё ў час. І толькі цяпер, цяпер, калі

«АЛЕ, О КАЙ, МАЎЧУ»

хаця, зрэшты, цяпер не можа быць позна, бо позна было ўжо ад самага пачатку. І я ведала, іншая рэч — не верыла. А ты не нагадваў.

«А МАРОЗНЫЯ КВЕТКІ

РЫСУЮЦЬ МНЕ ВОЧЫ ДАЛОНІ»

І той свет, які я штодня ствярала сабе, штодня наноў, для таго, каб калі-небудзь ён нарадзіўся існым, для цябе гэты свет так і застаўся

«І ТОЛЬКІ КРОЎ РАСКВІТАЕ»

чужым

«ПАД БЕЛЫМ ЦЕСНЫМ БІНТОМ»

чужым.

### 3. НЕ ГЕРДА

Я ачомалася ад твае апошняе аперацыі і пачала азірацца наўкол: больнічны ложак ля высокае цаглянае сцяны і паўсюль раскіданыя аркушы, спісаныя маім почыркам.

Я пачала (Вы можаце прадугледзець зыход ап...) спешка (...расчытаць твой боль...) няўцямна перабіраць (...шыльда заўсёды была такой...) гэтыя (... парасон у скрухі...) аркушы (... быццам нехта не адчуе...) але я (...чытаць твае думкі...) нічога (...дазваляла тая адлегласць...) не магла зразумець (...калі мы развіталіся...) я не памятала (Ты страшэнна баішся шчырасці...) калі гэта пісала (...ты — мой кат...) вар'ятка вершы (...вершы толькі табе...) я разгублена (Мне вельмі часта...) разглядала (... цаглянага мура...)

І РАПТАМ

Мне вельмі часта сніцца гэты недарэчны сон: я сяджу ля высачэзнага цаглянага мура й прыслухоўваюся, ці не пачуюцца за ім — па той бок — твае крокі. А калі я стамляюся прыслухоўвацца, я пачынаю цябе клікаць. Толькі ты ані разу не адгукнуўся, і ані разу я не пачула тваіх крокаў.

... і за гэтым мурам не павінны былі пачуцца твае крокі, бо за ім ніколі не было цябе...

«МОЖА...

БАСАНОЖ...»

Я ведаю, Кай, што ты мог бы сказаць мне на развітанне: капрызнае дзіця, з часам ты зразумееш, што я ва ўсім меў рацыю.

Мажліва...

Але ж, Кай, бывае лёд, які ніколі не растае.

ПЕРАКЛАД

# РЭСПУБЛІКІ ЛІТАРАТУР

Няма ў свеце народаў з такімі блізкімі — узнёслымі і трагічнымі — лёсамі, як у беларусаў ды ўкраінцаў. Няма і раднейшых літаратур, спалучаных кроўна, сардэчна, духоўна. Нашыя дарогі — і мазольныя, і творчыя — нярэдка злучаліся і на ўсю сваю далеч торыліся паралельна. Ці не таму лепшыя здабыткі ўкраінскага мастацтва намі ўспрымаліся і ўспрымаюцца роднымі, як не чужыя і нашыя песні «з-над Нёмана і Дзвіны» Кіеўскім і Львоўскім абшарам.

Пачынальнікі ўкраінскага і беларускага адраджэння — браты-крэўнікі. Бо з грудзей мацярок-сясцёр пілі малако. Бо адных ворагаў у сваім жыцці мелі. Бо жылі і памiралі з аднымі і тымі ж марамі ды спадзяваннямі: бачыць свае народы ў вольных дзяржавах, чуць сваю мову на яе вуліцах і плошчах. Бо здзяйснялі, па сутнасці, адно і тое ж. Тарас Шаўчэнка (як і беларус Францішак Багушэвіч) тварыў народ, Іван Франко (як і Янка Купала) — нацыю.

Творы Шаўчэнкі для сучаснай Украіны — Стары Запавет, Франко — Новы (да прыкладу, ягоная паэма «Майсей» — на сто гадоў наперад прарочыць памаранчавую Украіну). А таму калі Шаўчэнка стаў для Украіны песняй, Франко зрабіўся гімнам.

Сярод сучасных гімнаспеўцаў Украіны — вартыя нашчадкі Шаўчэнкаўскай душы і Франкоўскага сэрца: Дзмітро Паўлычка, Іван Драч, Раман Лубкіўскі… Апошні спароднены з Беларуссю вялікай адраджэнцкай працай: і творчай, і асветніцкай. Дзякуючы яму паўкраінску выйшла годная кніга Максіма Багдановіча, загучалі на мове Кабзара вершы дзесяткаў паэтаў Беларусі. Ён рупіцца аб зборы ліставання Ларысы Геніюш, клапоціцца аб памяці Алаізы Пашкевіч, гасцінна прытуляе ў сваім львоўскім доме гасцей з Мінску…

Паэт, перакладчык, культуролаг, грамадска-палітычны дзеяч, ён нарадзіўся ў 1941 г. на Тэрнопальшчыне. Пасля вучобы ў Львоўскім дзяржаўным універсітэце працаваў літаратурным рэдактарам, доўгі час быў кіраўніком Львоўскай арганізацыі Саюза пісьменнікаў Украіны. Раман Лубкіўскі — адзін з заснавальнікаў Таварыства роднай мовы, прафесар Львоўскага універсітэта імя І. Франко, аўтар дзесяткаў кніг паэзіі, перакладаў, нарысаў, лаўрэат Нацыянальнай прэміі Украіны і многіх замежных літаратурных адзнак, ганаровы сябар Саюза беларускіх пісьменнікаў (з 2006 г.). Абіраўся народным дэпутатам Вярхоўнай Рады Украіны, ініцыятар падняцця над парламентам нацыянальнага — жоўта-блакітнага — сцягу (верасень 1991 г.). Працаваў Надзвычайным і Паўнамоцным паслом Украіны ў Чэхаславакіі, затым у Чэшскай Рэспубліцы. Цяпер ён ачольвае дзяржаўны Камітэт па Нацыянальных прэміях Украіны імя Т. Шаўчэнкі.

«Літаратурная Беларусь» сёння знаёміць з фрагментамі новай паэмы Рамана Лубкіўскага «Рэспубліка анёлаў» — паэтавай «майданнай» споведдзю, сучасным узорам Блокаўскай паэмы «Дванаццаць», сённяшнім Франкоўскім гімнам (пераклад зроблены паводле кнігі «Янгол у снігах», Львів: «Світ», 2005). …Калі Купала і Колас пачыналі пісаць, Франко ствараў «Майсея» (1905 год). Вось на столькі мы цяпер і адстаём ад Украіны: як «Мужык» ад «Майсея», як Плошча ад Майдана, як знак ад адкрыцця. Аднак адкрыццё ў літаратуры жыве па-за часам. Пра гэта, між іншым, таксама гаворыцца ў «Рэспубліцы анёлаў»…

**Алесь Пашкевіч**

# РЭСПУБЛІКА АНЁЛАЎ

**Раман ЛУБКІЎСКІ**



**Памаранчавая феерыя (фрагменты)**

I

*Майдан — бязмежжа паміж двюх эпох,*
*Што помняць здраду й бачаць волю.*
*Над намі Бог і паміж намі Бог –*
*Ды памаранец-німб над галавою.*

*Не вытрымаў сваволі, крыўды, зла,*
*Сыйшоў з нябёсаў да народнай дзеі.*
*Світальная зара Яго вяла –*
*І тое бачылі ахвяры і зладзеі.*

*Давалі людзі хлеба і вады,*
*А нехта напускаў сабак на Бога.*
*А хтосьці і шаптаў: «Не йдзі:*
*Бо не твая — хрышчацкая дарога».*

*Яшчэ бязвернік шчыра наракаў:*
*Тут бруд і маята. Праходзьце міма.*

*Ды крыжыкамі вышыты рукаў*
*Крануўся белакрылля серафіма.*

*Анёльскае зіхоткае крыло*
*Заціхла над намётам, як над скітам,*
*І шматгалосна мора загуло,*
*Запамаранчылася над блакітам, –*

*Не шэптам прамінулае журбы,*
*Не грукатам параду, бразгам зброі, –*
*Багаслаўленным клічам барацьбы,*
*Крывёю не заплямленых герояў.*

*І стыглі дыяменты шчырых слёз,*
*І радасцю спатольваліся людзі.*
*Чумацкім шляхам месяц ранак вёз:*
*Святло на даляглядзе правіць будзе!*

*І крочыць Бог па прамянях дарог*
*З аранжавым радком на белай рызе,*
*Што — як закладка ў патаемнай кнізе –*
*Нам сведчыць знак Яго пакут-даброт…*

II

*Наш Ойча нябесны! Паклікаў ясі*
*Народ, што шчаўрэў ад няпраўды,*
*як колас.*
*А ворагі ўкралі у нас галасы, –*
*Падай жа свой знак, і падай нам*
*свой голас!*

*Ад звадаў, няпэўнасці нас сцеражы*
*Ў дзяржаве, дзе правіць хлусня-замарока.*
*Мы ўсе, хто тут ёсць, — як і Ты,*
*— на крыжы.*
*Пашлі Украіне жывога прарока.*

*Гасподзь усміхнуўся, і змроку замест*
*Сонца-сланечнік заззяла ў зеніце.*
*І людзі знаходзілі стоены змест…*
*Між вамі — прадцеча. Наўкола зірніце!*

*І ўсе, хто прыйшоў, давалокся, даджгаў*
*У модным аўто, на маршрутцы, валамі,*
*На бліжняга глянуў — і праўду пазнаў:*
*Вышэйшую, без крывавае плямы.*

VI

*Хвалюецца, аранжам грае мора,*
*І коціць хвалю сонечна Майдан.*
*Усцешаны Грушэўскі і Багдан,*
*І звонам залатым гудзяць саборы.*

*«Я бачу ўсё: і гора, і няўроды*
*Наклікаць хоча нам варожы стан, –*
*Князь Уладзімір кажа. — Ды Майдан*
*Ад Бога даўся нашаму народу».*

*«Так! Юшчанка!» Як музыка атак,*
*Лунае гоман. Першы Прэзідэнт,*
*Зірні, што дзееца: вось студэнт,*

*Не слухаючы, як грыміць «Тартак»,*
*Шаўчэнкі і Франка суквецце лент*
*Павязвае і ўхвальна чуе: «Так!»*

XIV

*Час — без руху. У жаху й трывозе*
*Персанажы ва ўладным абозе*
*Чакаюць, шукаюць гаранта,*
*Галоўнага, заўваж, фігуранта.*
*Ну й кампанія: поп-выдзіжэнец,*
*Прафсаюзны дзяяч-мнагажэнец,*
*Дамарошчаны русіфікатар,*
*Яйцаносны няўдала-дыктатар,*
*Невядомы для ўсіх суразмоўнік,*
*Пан-прафесар (у адстаўцы палкоўнік).*
*Клацне ночы раззяўлена пашча,*
*Зіркне зорка іх цёмна-прапашча –*
*І паўстанне бяды навяшчуе…*

*І ніхто з іх не бачыць, не чуе…*
*І трымаюцца ўсе пакуль разам,*
*Хворым сказам, бязглуздым спецназам!*

XV

*Апоўначы было. Шыхты амону*
*Выходзілі з асенняе імглы,*
*Рыхтуючыся, сталі ў абарону.*

*Усе адчайна юнымі былі.*
*Усе ў насунутых — як панцыры —*
*шаломах;*
*Вачэй ня бачна: згасьлі, адцьвілі…*

*А цені мітусіліся ў разломах*
*Варот будоўлі, патаемных брам,*
*Чакалі ўладна-крывадушны помах.*

*Каманды не было. Крывавых драм*
*Адсоўваўся далей час — да сьвітанку,*
*Святло як блісьне з-за ваконных рам!..*

*І раптам — сцяг на грозна-цяжкім танку*
*Затрапятаў адчайна-клічна: «Так!»*
*Майдан уздрыгануўся. Ліхаманку*

*Адчуў амон — бо то быў іншы знак:*
*Надзей, паразумення, згоды, –*
*Перад бранёй паўстаў анёл-юнак.*

*Хлапчына нёс — як сонца — памаранч,*
*Худзенькі быў, ды незямной пароды,*
*Накульбаваў, — меў маленькі гандж…*

XXIII

*У небе над Кіевам ангел ляцеў,*
*Пасеяць любоў над крыжамі*
*хацеў.*

*Увесь прамяністы, як Божа раса,*
*Бязгрэшна ўзвышала нябёсы краса.*

*А тыя, што знізу, адсочвалі грэх –*
*Іх крыўда стаміла й зняважлівы смех.*

*Абрыдла нястача, няпраўда і зло,*
*Падняць захацелі свабодна чало.*

*Так вось і выйшлі з дамовак. Прыйшлі*
*На плошчу у Кіеў. Вочы ўзнялі*

*Да неба. Да Бога. Да вечных шчадрот.*
*Учора — насельніцтва. Сёння — народ.*

*Арханхеле-браце, ні з месца не зруш,*
*Пакуль не праясніцца зноўку наўкруж,*

*Пакуль і усходнік, заходнік, крымчак*
*Прысягаю-клятваю «Юшчанка! Так!», –*

*Вось тут усе разам не скінуць кайдан,*
*Асвецяць любоўю наш вечны Майдан!*

XXIV

*Сцягі — беларускі і сербскі,*
*Сімволіка Грузіі й Польшчы…*
*А гэта значыць: б'ецца сэрца*
*І той зямлі на нашай плошчы!*

*Саакашвілі ды Бжэзінскі,*
*Валенса, Гавел і Салана*
*Народ вітаюць украінскі,*
*Бо наша слава — нездоланна!*

*А вы, братове-беларусы,*
*Вышэй трымайце знак «Пагоні», –*
*Хай сонца ў белыя абрусы*
*Ўнітуе вам прамень чырвоны!*

*Пакутнікі-сябры: і сербы-брацця,*
*Браты-харваты і славенцы,*
*Прыйсці да нашага багацця*
*Вам дапамогуць украінцы.*

*…Сядайце грэцца каля ватры*
*І радавацца нашай волі.*
*Каўказ, Карпаты, Альпы, Татры*
*Каронай ззяюць шчаснай Долі!*

XXX

*…Нас многа — так! І ні арда Батыя,*
*І ні маскаль, і ні тэўтон*
*Ўжо не абразяць той бетон*
*Свяшчэнны, бы сталіца Кія!*

*Сыйдзі, Андрэю Першазванны. Стань*
*І асвяці вачэй людскія соты.*
*Багаславі — у раз дзесяты й соты –*
*Народны дух, які — ужо не твань.*

*Ператвары мільёністае Я*
*У Мы — у гэты час і ў гэтую гадзіну*
*Ўсю украінскую з'яднаную радзіну –*
*Што ўваскрасіла матчына імя.*

**Студзень — люты 2005**

**Пераклад А. П.**

РЭАКЦЫЯ

# «ЛЁСЫ Ў ГІСТОРЫІ» — ПАПЯЛУШКА ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСЬ»

**Старэйшыя памятаюць, наколькі маленькі быў спіс іменаў гістарычных дзеячаў, якія ў савецкія часы ведаў выпускнік сярэдняй школы. Нават гістарычны факультэт педінстытута, на жаль, вельмі няшмат дадаваў да гэтага спісу (а Магілёўскі педінстытут, па ўсім, яшчэ і стварэў у галовах сваіх студэнтаў кідкую блытаніну).**



Мініяцюра з «Ліцэвога Зводу». Літвінская дружына. XVI ст.

Пасля перабудовы і стварэння беларускай незалежнай дзяржавы сітуацыя палепшылася. Гісторыкі паведамілі грамадству аб шмат якіх таленавітых і адданых сынах нашае Радзімы. Надышла чарга літаратараў — адкрыць вочы сучаснікам на асаблівасці лёсу славутых продкаў і іх характараў. За справу ўзяўся, сярод іншых, Вітаўт Чаропка, і на паліцах з'явілася надрукаваная выдавецтвам «Беларусь» у 2005 г. яго тоўстая кніжка з ілюстрацыямі «Лёсы ў гісторыі».

Беларускія гістарычныя пісьменнікі трапляюць у няпростую сітуацыю: наяўнасць дыяметральна супярэчлівых ацэнак тых жа самых падзей (і людзей), ацэнак, што засталіся ў спадчыну ад расійскай і польскай навукі. Таленавітыя польскія і расійскія пісьменнікі і гісторыкі мінулага, як і сучасныя, спакушаюць абраць для сябе лепшае з іх набытку і спыніцца на гэтым, скарыстаць для беларускае гісторыі. Найвялікшая перамога — тая праца, якая не абмінаючы папярэднікаў-суседзяў прапануе свой адлік і памер, свой погляд на падзею і асобу.

Надзвычай важнымі робіцца і пытанні рэдактуры гістарычных тэкстаў. Упарадкаваць беларускі тэкст з цытатамі на польскай, славянскай і расійскай мовах надзвычай цяжка менавіта з-за блізкасці гэтых моваў, іх гістарычнай пераплеценасці. Раскрываецца неверагодная прастора для плённага напаўнення сучаснай беларушчыны архаічнай і іншаземнай лексікай, а з другога боку паўстае велізарная небяспека стварэння малачытэльных, з-за неадшліфаванай мовы, тэкстаў. Да малачытэльнасці даводзіць і неўнармаванасць напісання іменаў гістарычных дзеячоў і назваў паселішчаў, нягледзячы на пазітыўную ролю «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» і «Беларускай Энцыклапедыі». Бо як бы паслядоўна не пісалі энцыклапедыі «Трокскае княства» ці «Трокскае ваяводства», фанетычны прынцып патрабуе ўтварэння ад назвы гораду — Трокі — прыметніка «Троцкі». Троцкае ваяводства, Троцкае княства, троцкі ваявода. Некалі, у дрымучыя часы застою, філолагі-ленінцы баяліся зрабіць намёк на Льва Давыдавіча Троцкага, якога па загадзе Сталіна забіла НКВД, няўжо і цяпер той страх не прайшоў?

Для выдавецтва «Беларусь», у якім працуюць рэдактары кнігі В.Чаропкі, — не прайшоў. І ўвогуле — да рэдактуры такой тоўстай і важнай па змесце кнігі ў выдавецтве паставіліся без належнай увагі. Рукапіс аддалі людзям, якія «не пацягнулі» складанага тэксту. Атрымаліся прыкрасці. Рэдактары не «паразважалі» з аўтарам, ці варта адну і тую ж асобу (маскоўскага цара Івана IV) называць аж трыма розными варыянтамі: Іванам Тыранам (с. 121, 173, 174), Іванам Жахлівым (с. 145, 159) ды Іванам Грозным (с. 192, 193, 195). У выніку не вельмі дасведчаны чытач можа падумаць, што гутарка аб розных асобах. Калі рэдактары прынялі сумніўнае, на мой погляд, рашэнне пісаць прозвішча друкара-немца Схёнфэлс (с.198), а не Шёнфэлс (арыгінальнае «Schonfels»), гэта яшчэ можна прыняць, але калі расійская пасла ў Польшчы Отта Магнуса фон Штакельберга яны разам з аўтарам называюць альбо Стаукелберг (с.353), альбо Стацкелберг (с.345), то з гэтым ужо катэгарычна нельга пагадзіцца. Увогуле, хочацца запытацца аўтара і выдаўцоў: вы адну і тую ж асобу называеце па-рознаму таму, каб чытача заблытаць, ці проста вам усё роўна? Але ж чытачу не ўсё роўна, якое было прозвішча шляхціча: «Гамрат» і «Гармат» (на с.103 ужываюцца абодва варыянты), як нам зваць знакамітага генерал-лейтэнанта: Мілаіл Вяльгорскі (так на с. 405) ці Міхал Валегорскі (так на с. 376)? Мітрапаліта Пацея звалі не Ігнатам (як на С. 223 і 225), а Іпатам, альбо Іпаціям. А каронная канцлера лічыць Замоўскім ці ўсё ж Замойскім (с.203)? А славутага прыродазнаўцу як звалі: Жак Жылібер (с.343) ці Жан Жылібер (с.335)? Аб прычыне наўмыснага і відавочнага выкарыстання паланізмаў (Катаржына, замест Кацярына, Шымон замест Сымон ці Ваўжынец замест Лаўрэн) ужо і пытацца нялоўка...

**Кніга В. Чаропкі напісана ў наш час, для нашых сучаснікаў, — пакалення, змененага, калі не сказаць разбэшчанага, тэлевізарам, кіно, відэа...**

У кнізе сабраныя біяграмы тых, пра каго жыхар Беларусі павінен ведаць. Можна было б дадаваць, але адняць — нікога. Для характэрыстыкі некаторых са сваіх герояў аўтар суадносіць славутыя персаналіі з часам. Леў Сапега «...ішоў наперадзе свайго часу», Іосіф Руцкі «... з'яўляецца чалавекам будучыні», Казіміра Семяновіча «геній апярэдзіў час», а ў Антонія Тызенгаўза «галоўная віна была ў тым, што ён нарадзіўся не ў свой час», — аднак гэтага малавата, каб назваць аўтарскай канцэпцыяй, уласным адлікам, сваім поглядам на падзеі і асобы. У тэкстах асобных біяграм мы часта сустракаем паспешлівасць, недаказанасць, альбо той умоўны лад, які гісторыя, як вядома, не любіць. Напрыклад, з тэксту на с.110 чытач не-прафесіянал не зразумее, чаму Глінскі меў права пасылаць да Забярэзінскага па авёс каралеўскім коням, на с. 35 не патлумачана, хто такі Вайдыла, за якога Ягайла аддаў сястру Кейстута, і чаму гэты шлюб абразіў князя. В. Чаропка, якому не адымаць ліцьвінскага патрыятызму, не звярнуў увагу на таго адзінага Ягелона, які пахаваны на Радзіме, не знайшоў магчымасці паразважаць над комплексам непаўнавартасці, які ахапіў палякаў пасля таго, як над гэтым народам запанавала цалкам ліцьвінская дынастыя (хаця між іншым адзначыў, што каралева Ядзьвіга памерла бяздзетная і Ягелоны — гэта дзеці ліцьвінкі Сафіі Гальшанскай).

Кніга В. Чаропкі напісана ў наш час, для нашых сучаснікаў, — пакалення, змененага, калі не сказаць разбэшчанага, тэлевізарам, кіно, відэа... Каб сучаснік не адкінуў «Лёсы ў гісторыі» пасля першых радкоў, мова кнігі павінна быць адшліфанай да максімальнай лёгкасці чытання, факты і думкі заключаны ў зразумелыя вобразы. Чаму ж асобныя навелы-біяграмы так цяжка чытаюцца? Можа таму, што ніхто не ўзяў на сябе працу перачытаць і ўдумацца ў сутнасць такіх, напрыклад, выразаў: «... А 14 чэрвеня на рацэ Ведрашы каля Дарагабужа быў разбіты Канстанцінам Астрожскім перадавы трохтысячны атрад гетмана. Сам гетман і шмат важных паноў апынуліся ў палоне» (с.92). Канстанцін Астрожскі быў геніяльны ваяр, але каб сам сябе разбіў і ўзяў у палон?!.

**Беларускія гістарычныя пісьменнікі трапляюць у няпростую сітуацыю: наяўнасць дыяметральна супярэчлівых ацэнак**

Расказаўшы чытачам аб тым, як пажаніліся (спачатку таемна, а потым атрымалі прызнанне) кароль Жыгімонт Аўгуст і прыгажуня Барбара Радзівіл, Вітаўт Чаропка раптам піша ніжэй: «...Станіслаў Ажахоўскі быў асабістым непрыяцелям Радзівілаў, калі адгаварыў Жыгімонта Аўгуста ад шлюбу з Барбарай Радзівіл» (с.153). Гэта хутчэй за ўсё не няведанне аўтарам гісторыі, а «проста» замест слова «адгаворваў» напісалася «адгаварыў».

Часам недастатковa глыбокія веды аўтара-літаратара і адсутнасць гісторыка-рэдактара перашкаджаюць выяўленню праўды. Ведае, напрыклад, В.Чаропка аб тым, што продкі Мамонічаў былі магілёўскія купцы, і піша: «Выдалі яго (Статут Вялікага Княства) у віленскай друкарні магілёўскіх мяшчан Кузьмы і Лукаша Мамонічаў» (с.215). Мана! Лукаш і Кузьма Мамонічы былі віленскія мяшчане, жылі ў Вільні ў сваіх дамах і былі нават членамі гарадскога самакіравання, што для мяшчанаў іншых гарадоў было немагчымым. Калі сучасны пісьменнік не ўлічвае гістарычныя рэаліі, здараюцца казусы, кшталтам: «З Варшавы на чале палка ўланаў прыбыў біскуп Юзаф Красоўскі» (с.347). На чале палка можа быць палкоўнік ці іншы вайсковы, але не святар-епіскап! Здараюцца і большыя недарэчнасці, кшталтам такога: «Патрэбны былі паўстанцы Прусіі для стабілізацыі ўнутранага становішча ў Расіі, а таму іх выпусцілі на волю» (с.465). Чаму гэта Прусія так дбала аб Расіі?

А яшчэ ў кнізе В. Чаропкі і выдавецтва «Беларусь» чытач сустрэнецца з рэчамі зусім незразумелымі: Казімір Ягайлавіч «быў праўдападобны» (с.86), Ягайла «...нёс цяжар караля» (с.65). Апісваючы рэліквіі, якія знаходзіліся ў крыжы Еўфрасінні Полацкай, В.Чаропка называе «кроплі Хрыста» (с. 8). Гэта што за аптэка?

Адсутнасць рэдагавання прывяло да з'яўлення на старонках кнігі войска ў 11 мільёнаў 261 тысячу жаўнераў (с.267), — не было ў Януша Радзівіла такога войска!

Пісьменнік павінен ведаць мову, на якой піша, а рэдактар — бачыць недарэчнасці. Але чытач згаданай кнігі сустракае замест «гонар» слова «чэсць» (с.73), замест «уздыхнуў з палёгкай» — «уздыхнуў аблегчана» (с.74). Яўныя ляпсусы ад чытання адрываюць і выклікаюць смех. Чаго варта такое:

«На шчасце Казіміра, ён неўзабаве памёр» (с. 81);

«Траўгут... атрымаў загад ісці на Валынь, каб падтрымаць там тутэйшых паўстанцаў» (с. 492).

«Эмігранцкія колы абкружылі Дамейку і цягалі па розных мерапрыемствах...» (с.455).

Часам стылістычныя памылкі мяжуюць з дазволеным, збіваюць увесь аповед на нізкі стыль:

«Ён сам... хацеў... праз дачку ўлазіць ва ўнутраныя справы Вялікага княства Літоўскага» (с. 89, аб маскоўскім князі Іване III)...

Чаму я назваў гэтыя заўвагі «Папялушка выдавецтва «Беларусь»»? Ды таму, што кніга Вітаўта Чаропкі не такая ўжо благая. І калі яе першае выданне разглядаць як чарнавік, падрыхтоўчае да наступных перавыданняў, дык апранутая ў добрую моўную і вобразную адзежку Прыгажуня-гісторыя Беларусі падорыць радасць сустрэчы з яе выдатнымі асобамі — нашымі продкамі.

**Алесь Шкнай з Навагрудка, Пецярбург**

ДУХОЎНАСЦЬ

# «ДУША, УЛАДА І ДЗЯРЖАВА…»

**Сёння «Ь» прапануе гутарку паміж пісьменнікамі Зьнічом і Алесем Клышкам, людзьмі блізкімі і рознымі: першы — інак Мікалай, паслушнік Жыровіцкай абіцелі, другі — навуковец-тэхнік, супрацоўнік НДІ прыкладных фізічных праблем БДУ. Летась выйшла кніга іхняга сумоўя «Жыровіцкія камяні». Прапанаваны тэкст — частка з будучага выдання «Шлях да Жыровічаў».**



Інак Мікалай (паэт Зьніч)

***Алесь Клышка: Паразважаем аб жыцці, аб уладзе, аб лёсе чалавека. Выкарыстанне мажлівасцей чалавека і ягоных здольнасцей… Людзі, якія не вызначаліся вялікім інтэлектуальным патэнцыялам, нярэдка станавіліся святымі. Гэта мог быць і немаўля, дзіцятка Гаўрыіл, святы чалавек... Асобы са звычайным інтэлектам былі здольныя прадказваць падзеі, адказваць на пытанні, на якія ніхто не мог адказаць. Як суразмерыць такія паняцці: інтэлект, мажлівасці інтэлектуальныя і Богам наканаваны лёс чалавека?***

***Інак Мікалай:*** Брат Алесь, я закрану сёння таямніцу таямніцаў, тэму тэмаў: «Царства нябеснае ўнутры нас». На мове братоў навукоўцаў гэта гучыць праставата і грубавата, але даходліва. Творчыя мажлівасці, закладзеныя ў нас Творцам, альбо, як іншыя кажуць, прыродай, у лепшым выпадку мы скарыстоўваем на 5–10 адсоткаў, а 90–95 і болей — не. Царства нябеснае схавана ў нашым сэрцы ад нараджэння. Мы сядзім, як сабака на сене, ваўком выем ад таго, што нам цяжка жывецца, брэшам ледзьве не на ўвесь свет, які вінаваты ва ўсіх нашых няшчасцях, ды яшчэ дзёрзка запытаваем Госпада: за што нам такія нясцерпныя пакуты — індывідуальныя, сямейныя, нацыянальныя, агульналюдскія. Даруйце, браты, вось я грэшны, дурны што пень, але люблю мысліць, і дазвольце ў сувязі з гэтым выказаць некалькі думак на тэму: «Душа і ўлада», «Душа і дзяржава».

Улада — улада абсалютная, але яна выяўляецца амаль незаўважна. На першым плане свабода волі, падараваная нам самім Творцам. Улада д'ябла ў межах папушчаных самім Творцам блізка да абсалютнай, калі мы вольна альбо нявольна ёй аддаёмся. Любая зямная ўлада, папушчаная альбо благаслаўлёная Госпадам, адносная і залежыць ад меры нашага паслушніцтва. У аснове любой улады, і ў прыватнасці, дзяржаўнай, сістэма паслушніцтва бацьку, толькі якому? Бацьку Нябеснаму, бацьку памазаніку Божаму, бацьку сям'і ці бацьку-разбойніку? Дарэчы, абсалютна правільна афарыстычна і таму на першы погляд парадаксальна сказаў у свой час адзін дзяржаўны бацька: «Дзяржава — гэта я». Усе мы разбойнікі у той ці іншай меры, таму нашаму акаяннаму сэрцу і разброданаму розуму бліжэй сістэма паслушніцтва бацькам-разбойнікам, паханам, сістэма дэманакратычнага паслушніцтва, сістэма адзінства дэманакратычных сіл, дзе кожны партыйны атаман ненавідзіць сваіх дэманакратычных калег болей... Іхняе часовае імгненнае адзінства грунтуецца выключна на агульнай нянавісці і выбухае чарговым выкідам палітычнай радыяцыі ў хуткім часе пасля дэманакратычнай замены аднаго бацькі-разбойніка другім... Зямны шлях людзі праходзяць па-рознаму, кожны абірае свой накірунак, з Хрыстом ці без Хрыста. Напрыканцы жыцця валадары, якія панавалі, балявалі, мелі ўсё, апошнія хвілі сустракаюць з такім жахам, што не пазайздросціш. Але насамрэч апошнія хвіліны вырашальныя. І з чым мы прыйдзем да фінішу, як прадстанем — вось гэта галоўнае, усё астатняе забываецца… Госпаду патрэбен чалавек, як найвышэйшае яго стварэнне, як сын і сутворца. Айцец нябесны сказаў усім нам: «Богачалавек — Гасподзь Хрыстос».

Інтэлект і багадаць — гэта розныя паняцці. Інтэлект можна ўпадобіць кампутару, а багадаць — гэта тая таемная сфера нашага духу, у якой Сам Гасподзь знаходзіць прытулак. Гэта вось тое самае Царства Нябеснае, зона нашага духу, нашай душы, адкрытая дзеля багадаці Божай, для творчасці Самога Госпада. І калі мы гэтую сферу нашага духу трымаем у чысціні, трымаем адкрытай Госпаду, ён туды прыходзіць, ён пасяляецца там, і мы робімся Яго голасам, Яго сутворцам. Тады вось што я нас гаворыць і Хто ў нас гаворыць, а не наш інтэлект. Інтэлект часцей за ўсё становіцца прытулкам духаў цемрадзі, якія падкідаюць нам помыслы на пагібель душы нашай, на пагібель багадатнай сферы нашай істоты; мы прымаем свае помыслы за свае думкі, а дух ліхі часам гэтыя думкі і помыслы прыгожа афармляе, нават яны геніяльна могуць выглядаць і захапіць усю істоту нашую. І вось мы становімся цалкам у абсалютнай уладзе духаў цемрадзі.

***А.К.: — Браце Мікалай, а з якіх меркаванняў, нам невядомых, Гасподзь адкрывае Сваю багадаць на пэўных людзях, менавіта чаму на гэтым чалавеку, а не на тым. Быццам бы ў жыцці і чалавекам быў, і праведна жыў, як той Іоў Шматпакутны нёс пакуты за любоў да Госпада. Іншы атрымаў усе выгоды жыцця матэрыяльнага і не зведаў да канца жыцця ніякіх пакутаў. Адзін вернік, шчыры, адданы, самаахвярны — і не пазнаў у жыцці зямным радасці ні адной хвіліначкі. Бывалі такія прыклады. І гэта турбуе людзей: чаму аднаму так, а другому інакш, і хто размяркоўвае, і як размяркоўваецца багадаць сярод людзей...***

***І.М.:*** — Запытваць трэба не чаму Гасподзь так даў, так няроўна дзеліць, а запытваць трэба: чаму мы самі выбіраем не дары Божыя, а спакусы духа ліхога. Чаму наша свабодная воля хіліцца да злога. Найперш трэба ўсвядоміць, што мы карыстаемся свабодай выбару паміж Божай воляй і воляй духа ліхога.

***А.К.: — Я вяртаюся да пытання: чаму Гасподзь няроўна дзеліць і што ён дзеліць, на што трэба звяртаць увагу ў першую чаргу?***

***І.М.:*** — Гасподзь дзеліць роўна, ён усім роўна дае сваю любоў і свае багацці. Мы самі выбар робім, выбіраем духа ліхога, а потым пытаем, чаму Гасподзь няроўна дзеліць. Мы няроўна дзелім, мы не дзелім, мы выбіраем тое, што яўна нам на шкоду. Вось чаму мы так робім? Трэба ўсвядоміць, што пачалося гэтае няшчасце з выхаду з сістэмы паслушніцтва волі Божай нашых прабацькоў, і гэты выхад пашкодзіў нашую прыроду, нашае сэрца і розум. Калі гэта ўсвядоміць, тады мы будзем не свайму розуму давяраць (а гэта не свой, а падкінутыя помыслы), тады мы будзем выбіраць правільна. Ну, але ж тады, выбіраючы ўжо правільна, нас будзе цягнуць на тое, што некалі нам падабалася, нас будзе цягнуць на спакуснае зайздроснае сузіранне жыцця тых, хто жыве паводле духа ліхога, і Гасподзь ім часам папускае часовыя даброты на зямлі, часовыя багацці зямныя, і мы іхняе жыццё пад уладай духа ліхога прымаем за эталон жыцця, за тое, да чаго нам самім трэба імкнуцца. Вось у якое зачараванае кола трапіў наш азмрочаны розум і акаяннае сэрца, таму што мы скіраваныя на жыццё паводле правілаў духа ліхога.

***А.К.: — А сувязь пакаленняў, выхаванне. Джугашвілі скончыў духоўную семінарыю; Дзяржынскі быў прафесіянальным бандытам і рабаўнікам, таксама скончыў духоўную семінарыю. Багата ў каго з савецкіх галоўнакамандуючых былі бацькі святары, але ж яны ад іх адмовіліся і былі першымі разбуральнікамі храмаў. Што адбывалася? Дзе разарвалася сувязь выхавання, сувязь царквы, дзяржавы, сям'і і свабоды?***

***І.М:*** — Чарнышэўскі і Дабралюбаў былі сынамі святароў. Вось бунтаўшчыкі і вальнадумцы, якімі захапляліся бязбожнікі. Так ішоў працэс разцаркаўлення. Захапляліся іншаземнымі, антыправаслаўнымі, антыцаркоўнымі вучэннямі, прапагандавалі гэта, як заразу… У рэшце рэшт, гэтая зараза і просты народ кранула, і народ пачаў адыходзіць ад храма…

***А.К.: — Што сёння адбываецца на Беларусі? Якія б важныя ні былі ўсяленскія пытанні, пра якія мы разважалі, усё ж узнікае пытанне найперш пра сваё жыццё, сваёй сям'і, сваёй краіны. Што адбываецца на Беларусі ў свеце апошніх падзей, і што чакае нашых беларусаў?***

***І.М.:*** — У гэтай сувязі мне вельмі імпануюць паралелі з двух невялікіх народаў: фінаў і кубінцаў. Нехта з нашых нядаўніх палітыкаў прамовіў такі тэзіс: «фінляндызацыя Беларусі». Мне гэты тэзіс быў вельмі даспадобы, бо ў свой час мне вельмі даспадобы была ўстойлівасць фінскага жыцця на самым сутыкненні, дзе дзве звышсілы ваенна-палітычныя судакранаюцца. Вось фіны спакойна існуюць, маленькі чатырохмільённы народ існуе. Здзіўляла і радавала адначасова іхняя стабільнасць…

Гасподзь папускае на полі зямным менавіта тую сітуацыю, той збег абставін, якія ёсць той незвычайнай гульнёй, якая завецца жыццём. Але гульня нашая няпростая, ідзе яна адначасова і ў часе, і ў вечнасці. У кожнага гульца няўпынна дваіцца ў вачах. У што мы гуляем? Іерархія мэтаў гэтай гульні? Дзе нашая каманда, а дзе супрацiўная? Хто гаспадар каманды? Якія правілы гульні? Хто наш галоўны трэнер, хто выпускае ігракоў на поле альбо садзіць на лаву запасных? Хто капітан? Хто арбітр, хто можа паказаць жоўтую альбо чырвоную картку? Сітуацыя мяняецца на полі няўпынна, траўмы атрымліваем няўпынна.

У 2033 годзе споўніцца 2000 гадоў з часу ўкрыжавання і ўваскрашэння Ісуса Хрыста. Служкі антыхрыста будуць рабіць усё, каб абсмяяць, апаганіць, забыць ці мячом зваяваць вобраз Богачалавека. Антыхрысты будуць тварыць усялякія «коды да Вінчы» ды іншыя карыкатуры на Збаўцу, сектанцкія, філасофскія, тэасофскія, мастацкія і г.д. Пакаленне, якое ўвойдзе ў сілу да 2033 года, стане амаль цалкам здабычай дэмана і дэманкраты. Русь Белая не толькі цэнтр Еўропы, але і вока тайфуна ў сусветным змаганні воінстваў Хрыста і антыхрыста. Вайна гэтая сёння цалкам глабалізавалася, яна татальная, бязбачнае сутыкненне вялікіх цэсаравых воінстваў. Яна вядзецца нешматлікімі камандамі прафесіяналаў і, у асноўным, у рэжыме Штырліца.

Нацыянальныя межы — гэта сёння ўсяго толькі клетачкі шахматнай дошкі, альбо футбольнага поля. І пры ўсім падзеле душаў нашых на салістаў і харыстаў, на форвардаў і абаронцаў, на пешак і фярзёў трэба найперш памятаць, што музыку гісторыі задумвае — і творыць партытуру, і дэрыжыруе, і выпускае на сцэну і харыстаў, і салістаў, і форвардаў, і абаронцаў, і пешак, і фярзёў Сам Укрыжаваны і Уваскрослы Богачалавек у адвольнай сутворчасці з душамі нашымі. Папраўкі на нашыя свавольствы, нашыя спакушэнні духамі супрацiву нячыстымі, прадугледжаныя ў самой Задумы Творцы. Сітуацыя і на глабальных, і на нацыянальных палёх па волі Божай мяняецца няўпынна. У любую хвілю могуць быць раптоўныя кардынальныя змены. Таму зыходзіць трэба не з інерцыі некалькіх адсоткаў нашых учарашніх задумак, а з цяперашняй сітуацыі на дарозе, на полі, на сцэне, на дошцы, у паветры, у космасе, а яна, гэтая папушчаная Творцам сітуацыя, адкрываецца кожнаму…

На зямлі мы нікога не павінны баяцца. Аднак не толькі не баяцца, але найперш і любіць. І вось калі любоў і страх Божы будуць спалучаны і кожны будзе імкнуцца Божую задумку выканаць, — вось тады каманда Беларусі будзе йграць так, як яшчэ ніколі ў гісторыі не йграла. І сапраўды, Беларусь будзе адпаведная таму, што Гасподзь яе паставіў у самым цэнтры Еўропы, што Гасподзь пакрыў яе плашчаніцай сваёй бел-чырвона-белай, адзінае племя, якое мае колеры — нацыянальны сцяг. Але фактычна гэтыя колеры ўсяго хрысціянскага племені, усёй хрысціянскай Еўропы, найперш.

Беларусь — як сэрца Еўропы, якое павінна біцца роўна, рытмічна, напоўнена. І тады гэтыя токі, бел-чырвона-белыя токі пойдуць ад гэтага сэрца па ўсім хрысціянскім свеце, і ўсё хрысціянскае племя загучыць адпаведна таму, што Гасподзь аб ім задумаў. Вось за гэта, каб спраўдзілася Божая задумка, і аб усёй Белай Русі, і аб усім хрысціянскім племені, пакрытым колерамі Хрыстовай плашчаніцы...

***А.К.: — Ці не прыйшоў час, браце Мікола, вяртання Беларусі гэтага сцяга — гістарычнага, наканаванага і асвечанага. Мы маем дзяржаўны сцяг, які быў прыняты дзяржаўнымі органамі, які зацверджаны, але ці варта адмаўляцца ад Божага падарунка?***

***І.М.:*** — Можна і іначай паставіць пытанне. Ці вартыя нашыя разбойныя сэрцы, каб яны былі пакрытыя тым сцягам. Без пакаяння, без пераходу ад разбойнага, да пакаяннага стану, без вяртання блуднага сына, якім кожны з нас пакуль што з'яўляецца? Таму што спачатку трэба пакаяцца, ачысціць свае сэрцы, а потым сказаць: «Госпадзі, калі хочаш, пакрый нас зноў сваёй плашчаніцай, як дзяржайным сцягам!». Прасіць змірэнна, а не мітынгаваць, лямантаваць і патрабаваць гэтага. Вось так я думаю. А Царква і так пакрытая гэтымі колерамі, яны прысутнічаюць на аблачэнні праваслаўных Партыярхаў, яны ніколі не здымаліся…

ПАРАЛЕЛІ

# «НЕ ДОПУСКАТЬ УПОТРЕБЛЕНИЯ», АБО ЗНІШЧЭННЕ БЕЛАРУСКАЙ КНІГІ

**Літаратура і цывілізацыя — аднагодкі. Абедзве нарадзіліся падчас вынаходства фанетычнага алфавіту і пісьменства. Прадукт прафесійнай літаратуры — кніга. «Прафесійная» цывілізацыя — культура. Кніга і «культурная» цывілізацыя — аднаяйкавыя блізняты.**



Па вялікім рахунку, усе вынаходніцтвы закончыліся пасля з'яўлення кола і кнігі. Іх працяг — толькі тэхнічнае ўдасканаленне: калясніца, паравоз, «Мэрсэдэс»; манускрыпт, летапіс, кампутар… А сучасны Інтэрнэт — чым не суперэнцыклапедыя, у якой кожны можа ўпісаць і свой абзац. Як неслух-школьнік каментар на маргінэсе падручніка…

Гісторыя мастацкай кнігі становіцца гісторыяй культуры. Гісторыя ж беларускай кнігі — гісторыяй Беларусі. Без сваёй кнігі Беларусь была б ці «крэсы всходні», ці — хутчэй — «западной губернией». Хто хацеў знішчыць Беларусь, першай знішчаў ейную кнігу: ці наклады выданняў, ці кнігу «няправільна» названага праспекта, ці, урэшце, кнігі жыццяў. На кожнага беларускага кніжніка, пачынаючы ад Францыска Скарыны, было па некалькі інквізітараў, а ў часы нашыя — і цэлыя карныя аддзелы з рознымі назвамі (НКВД, Галоўліт, міністэрства інфармацыі і пад.).

Факты палення Скарынавых кніг маскоўскімі «ідэолагамі»-святарамі — вядомыя. Не быў літасцівым лёс і да працы беларускіх першадрукароў Сымона Буднага і Васіля Цяпінскага (апошняга забілі). Менш вядомы лёс «Трэнасу» Мялеція Сматрыцкага, выдадзенага ў 1610 г. Кнігу Сматрыцкага, полацкага архіепіскапа, аўтара славутай «Граматыкі», якую Міхайла Ламаносаў назваў «вратамі» сваёй вучонасці, кароль Сігізмунд, знаходзячыся з войскам пад Смаленскам, пад пагрозай штрафу (у 5 000 злотых!) забараніў прадаваць і купляць, а канфіскаваны наклад «Трэнасу» загадаў спаліць, друкарню, якая выдала кнігу, закрыць, а друкароў арыштаваць…

І нішчылі беларускую кнігу — з захаду і ўсходу. У 1697 годзе быў прыняты каралеўскі ўказ аб забароне «пісару» карыстацца ў справаводстве беларускай мовай. Забарона беларускага друку на абшарах Расейскай імперыі пачалася ў 1795 г., калі на Беларусь пашырыўся закон Пятра І (гэты «закон» быў выдадзены для Украіны ў 1720 г.). Пётр І патрабаваў, «дабы в Малой Росіи вновь никаких книг, кроме церковных прежних изданій, не печатать, а и оные церковные старые книги — с такими же церковными книгами исправливать <…>, дабы никакой розни и особого наречия в них не было». Тым жа ўказам забаранялася друкаваць па-беларуску святыя і рэлігійныя кнігі. А ў беларускай гісторыі словы «забараніць» і «зьнішчыць» — сінонімы.

Пра знішчэнні беларускіх мастацкіх кніг у наступным — ХІХ-м — стагоддзі першым сведчыў Рамуальд Зямкевіч, вядомы бібліяфіл і калекцыянер. «Пасля скасавання уніі, — пісаў ён у артыкуле «Нацыянальнасць у Вінцука Дуніна-Марцінкевіча», — кніжкі беларускія, як «Беларускі катэхізм» 1835 г., «Сялянка» Марцінкевіча, «Песні» Чачота, прызнаныя былі шкоднымі, і ўжо цераз колькі гадоў пасля таго, як іх надрукавалі, пачалі іх адбіраць і ніштожыць. Ініцыятарам быў вядомы мітрапаліт Сямашка, злы дух тагачаснай культуры і вораг беларушчыны».

У 1859 г. канфіскавалі перакладзеную В. Дунінымі-Марцінкевічам паэму «Пан Тадэвуш» А. Міцкевіча.

30 траўня 1859 г. выйшаў загад пад №1298 «Аб забароне ўкраінскага друку, напісанага польскім альфабэтам». Віленскі цэнзурны камітэт захацеў вырашыць, ці можна дазволіць друкаваць беларускія кніжкі лацінкай (у згаданым дакуменце пра беларускі друк не згадвалася), і 22 жніўня 1859 г. запрасіў тлумачэнні ў міністра народнае асветы. «Главное Управленіе Цензуры <…> 26 истекшего сентября определило: не допускать употребленія польскаго алфавита при печатаніи сочиненій на белорусскомъ наречіи; книгу «Pan Tadeusz» Марцинкевича <…> не выпускать въ светъ». Пад лістом стаяў подпіс міністра народнай асветы Кавалеўскага.

Атрымлівалася наступнае: кнігі па-беларуску не дазвалялася друкаваць ні «рускім» шрыфтам, ні лацінкай. Дата ж першай афіцыйнай забароны — 26 верасня 1859 г. Хутка — стопяцідзесяцігадовы юбілей…

Захаваліся сведчанні, што пад забарону падпалі і нелегальныя беларускія выданні часоў паўстання 1863 г. Я. Карскі ў сваіх «Беларусах» (т.ІІІ, ч.3) адзначаў, што «пасля Баршчэўскага, Рыпінскага, Чачота, Дуніна-Марцінкевіча, Каратынскага і інш. былі строгія ўрадавыя забароны ўжывання друкаванага слова на беларускай мове». Беларускае друкаванае слова мусіла выдавацца за мяжой: у Кракаве, Львове, Познані, Парыжы, Лондане. В. Дунін-Марцінкевіч «цісну» свае творы ў друкарні Бэйліса як польскія, дзеля чаго ўкладаў прадмовы да кніг па-польску — каб зблытаць цэнзараў.

«Мясцовыя ўласьці, тлумачачы па-свойму і пашыраючы на Беларусь указ Пятра І, <…> не дазвалялі друкаваць ніводнай кніжкі ў роднай мове, — зазначалі ў «Меморыі», пададзенай у 1916 г. на ІІІ Швейцарскую канферэнцыю народаў, кніжнікі Вацлаў Ластоўскі і Іван Луцкевіч. — Ад 1793-га да 1905-га года знаходзім толькі два выданні беларускія, — гэта два катэхізмы». За стагоддзе — дзве кнігі…

Насамрэч, іх было крыху больш, і гэтага не мог не ведаць аўтар працы «Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі» В. Ластоўскі. Аднак выходзілі тыя кнігі-брашуры напаўлегальна, амаль саматужна, — то як балгарская, то як лацінская. Адно каб не беларуская… ХХ стагоддзе пачыналася беларускай кніжыцай А. Ельскага «Слова абъ праклятай гарэлцы и абъ жыцьци и смерци пьяницы. Добраму Беларускаму народу, на пакрапленьня яго душы и розуму». Затым была нелегальна аддрукаваная «Свабода». На тым жа гектографе нелегальна выдаваліся літаратурныя «альманахі» «Калядная пісанка» (1903 г.) і «Велікодная пісанка» (1904 г.).

12 снежня Мікалаем ІІ быў падпісаны ўказ, які здымаў ранейшыя абмежаванні на выкарыстанне «мясцовых» моў у Расійскай імперыі…

Пра тое, як знішчаліся беларускія кнігі напрыканцы 30-х–пачатку 50-х гадоў ХХ ст., напісаў А. Лукашук. Ім быў апублікаваны і спіс кніг, якія «прадпісвалася» спаліць паводле загада №33 Галоўліта БССР (галоўнай цэнзурнай управы) ад 3 чэрвеня 1937 г. У тым спісе, што складаўся з 421 пазіцыі, былі кнігі Ф.Аляхновіча, І. Абдзіраловіча, М. Багдановіча, Ф. Багушэвіча, А. Бабарэкі, М. Гарэцкага, А. Гаруна, У. Дубоўкі, С. Дарожнага, А. Дудара, У. Жылкі, М. Зарэцкага, А. Звонака, У. Ігнатоўскага, К. Каганца, Т. Кляшторнага, Я. Купалы, Я. Лёсіка, А. Луцкевіча, В. Ластоўскага, В. Маракова, Б. Мікуліча, Я. Пушчы, Я. Скрыгана, У. Хадыкі, М. Чарота, Ядвігіна Ш. і інш. Усе кнігі — залаты кнігазбор Беларусі! — загадвалася канфіскаваць. Пазней, у 1954-м, замест тэрміна канфіскаваць прыдумалі іншы: «ачыстка». ЦК КПБ прыняў пастанову «Аб ачыстцы бібліятэк, кніжных кіёскаў, кнігарняў і базаў ад састарэлай і палітычна шкоднай літаратуры».

У 60-х гадах Галоўліт СССР рэгулярна выдаваў брашуры «Зводнага спісу кніг, якія падлягаюць выключэнню з бібліятэк і кнігагандлёвай сеткі». І пільна «клапаціўся» аб тым, каб да друкарскага варштата не даходзілі лепшыя ўзоры вольнай мастакоўскай думкі. Да прыкладу, «Мёртвым не баліць» Васіля Быкава або «Нельга забыць» Уладзіміра Караткевіча…

Думалася, «ачысткі» кніг скончацца з гарбачоўскай «галоснасцю і перабудовай». Аднак — не на Беларусі! Колішнія супрацоўнікі апарата ЦК КПБ перадалі дзеля знаёмства другі асобнік машынапісу чарговага «дакумента». Працытую:

*«Главное управление по охране государственных тайн в печати (Главлит БССР)*

*220050, ул. Урицкого, 10*

*от 30.10. 1989 г.*

***Для служебного пользования***

*Главное управление направляет «Список книг, подлежащих исключению из библиотек и книготорговой сети» для сведения и руководства.*

*Так же сообщаем, что согласно «Списку лиц, все произведния которых подлежат изъятию» (Минск, 1962), произведения нижеперечисленных авторов до распоряжения этого вопроса директивными органами остаются в спецфондах библиотек».*

І зноў паўтараліся прозвішчы Лёсіка, Смоліча, Ластоўскага, Луцкевіча, а таксама пісьменнікаў-эмігрантаў: Ант. Адамовіча, Н. Арсеньневай, Ю. Віцьбіча, Ф. Ільяшэвіча, Р. Казака-Крушыны і інш. Працягнем цытаванне цэнзарскага дакумента ўзору 1989 г.: «Приложение: Список книг на четырех листах, ДСП (для службовага карыстання), только адресату», — і пасля подпіса начальніка Галоўліта А. С. Лазоўскай падаваўся «крамольны» спіс тых кніг, якія загадвалася «ачысціць». Сярод іх — «Адвечным шляхам» І. Абдзіраловіча, «Беларускі рух ад 1917 да 1920 г.» Язэпа Варонкі, «Песні выгнання» Тодара Лебяды, «Патрэбнасць нацыянальнага жыцця для беларусаў і самаазначэнне народа» Ф. Шантыра і пад. У другой частцы немалога спісу — «Школьная карта Беларусі», «Беларуска-рускі слоўнік» М. Байкова і С. Некрашэвіча, «Хрэстаматыя па беларускай літаратуры для ІХ-Х класаў» і дзесяткі іншых. Нават — вучэбны дапаможнік «Нацыянальная палітыка камуністычнай партыі» (1933 г.).

Пэўна ж, супрацоўнікі «Галоўнага ўпраўлення па ахове дзяржаўных тайнаў у друку» дзейнічалі зладжана і лагічна. Ззаду — доўгія стагоддзі вопыту. Аднак жа якая дзяржаўная тайна адкрывалася ў забароненым зборніку ў 32 старонкі вучнёўскіх вершаў Люцынскай беларускай гімназіі — дзяцей беларусаў латвійскай дыяспары — «Ластаўка», выдадзеным у 1924 г.?! Зрэшты, як і ў іншых… Апроч адной: любові да беларушчыны. Разгадаць тую таямніцу яшчэ не змог ніводзін цэнзар, і таму выбіралі прасцейшае: нішчыць яе.

Часы мінулі, а забаронная стылістыка засталася. Засталася дагэтуль. За мастацкі тэкст і незалежную думку забараняецца газета «Свабода», працэсам са звальненнямі і ліквідацыяй заканчваецца выданне «эмігранцкай» серыі ў «Мастацкай літаратуры». Дзяржаўныя манапалісты «Белкніга» і «Белсаюздрук» не пускаюць у кнігарні і кіёскі літаратурныя выданні «Дзеяслоў» і «Arche», «няправільныя» газеты, — зноў як «палітычна шкодную літаратуру». Цэнтральныя дзяржаўныя кнігарні Мінску адмовіліся браць на рэалізацыю кнігу Васіля Быкава «Парадоксы жыцця»… Затрымліваюцца на мяжы (бо дома друкавацца «высочайшим повелением» забаронена) нумары «Народнай волі», ліквідуецца «Салідарнасць», канфіскуецца наклад кніг «Людзі СБМ» Юры Туронка і «За вольную і суверэнную Беларусь» Дзьмітры Касмовіча… Такі «кніжны мартыралог», на жаль, сёння можна працягваць і працягваць. Некаторыя чыноўнікі, найбольш аддадзеныя «ідэям рэйху», дадумваюцца да крайнасцяў: забараняць не толькі кнігі, але і іхніх аўтараў.

Стаўленне сучаснай дзяржавы да беларускай кнігі — інквізітарска-манархскае. Хачу — дазволю, хачу — не. І яшчэ — прапагандысцкае. Найперш на адпаведныя святы: першага верасня і ў Дзень беларускага кнігадрукавання (калі праводзяцца выставы, раздаюцца граматы ды ладзяцца чыноўніцкія фуршэты). Ёсць адмысловы фонд, з ласкі якога выдаюцца беларускія кнігі (насамрэч жа — выдаюцца на сродкі падаткаплацельшчыкаў). Прылюдна кіраўнікі міністэрства інфармацыі хваляцца статыстыкай і распавядаюць пра дзярждатацыі на беларускія кнігі. І ніхто не гаворыць аб тым, што ліквідаваныя былыя падатковыя прэферэнцыі ў выданні беларускамоўных твораў і што беларускамоўны друк дыхае на ладан…

Каля 96% назваў кніг беларускамоўнай мастацкай літаратуры выдаецца сёння недзяржаўнымі арганізацыямі. Чыноўнікі клапоцяцца пра ахову «цукровага» і іншых рынкаў, а наш кніжны рынак аддадзены на водкуп мацнейшай расійскамоўнай прадукцыі, зробленай у багацейшай Расіі. Падатак у нас ахоўвае ўсё: і беларускія машыны, і беларускую электроніку, і трыкатаж, а вось кнігу… Больш за тое: вока нашага памежніка натрэніравана на беларукую кнігу мацней, чым на зброю. І — ці не самае страшнае — беларуская кніга страчвае свайго роднамоўнага чытача…

Так было раней, так застаецца і сёння: хто хоча знішчыць Беларусь, першай знішчае ейную кнігу.

**А. П.**

ЛІТЗАМЕЖЖА

# ЮШЧАНКА АБАРАНЯЕ ЎКРАІНСКУЮ КНІГУ



Прэзідэнт Украіны Віктар Юшчанка выказаўся за неабходнасць карэннай змены сістэмы дзяржаўнага кнігавыдавецтва. Як паведамілі ў прэс-службе кіраўніка Украіны, В. Юшчанка заявіў аб тым у купальскія дні ў Данецку. «Я буду дамагацца фармавання ў бюджэце 2008 года 200 мільёнаў грыўнаў (каля 40 мільёнаў даляраў ЗША. — Рэд.), каб разгарнуць на радыкальна іншай аснове праграму дзяржаўных закупак, праграму фіскальнага стымулявання выпуску ўкраінскай кнігі», — сказаў В. Юшчанка.

З яго слоў, будзе выдадзены адпаведны ўказ Прэзідэнта аб змене рэжыму тэндарнай працэдуры дзяржаўнага распаўсюду кніжнай прадукцыі для школ, бібліятэк, клубаў і г.д.

На думку прэзідэнта Украіны, яшчэ адной праблемай сферы кнігавыдання ёсць значнае скарачэнне месцаў рознічнага гандлю. За апошнія 6—7 гадоў, канстатаваў В. Юшчанка, прыкладна ў чатыры разы зменшылася плошча кнігарняў у розных рэгіёнах. «Гэта, хутчэй за ўсё, тая работа, якая павінна праводзіцца на ўзроўні органаў мясцовага самакіравання. Гэта і дзяржаўная палітыка падтрымкі кнігавыдання, якую неабходна аднаўляць», — падкрэсліў В. Юшчанка (передае «УНІАН»). Ён таксама нагадаў пра недастатковае фінансаванне на сёння дзвюх ключавых дзяржаўных праграм, якія тычацца падтрымкі ўкраінскага кнігадрукавання, прынамсі, праграмы падтрымкі ўкраінскай кнігі і мовы.

Паводле В. Юшчанкі, сёння ў Украіне штогод выдаецца каля 15 тысячаў найменняў кніг агульным накладам 53—55 мільёнаў асобнікаў. Пры гэтым спажывецкая патрэба Украіны на год складае каля 250 мільёнаў кніг.

# ФЕСТЫВАЛЬ КАНСТАНЦІНА БАЛЬМОНТА

У Іванаўскай вобласці прайшоў фестываль, прысвечаны 140-годдзю са дня нараджэння Канстанціна Бальмонта. Асноўныя мерапрыемствы праходзілі ў Шуі, на радзіме паэта. Ён нарадзіўся ў Шуйскім павеце ў вёсцы Гумнішчы, вучыўся ў Шуйскай спадчынніка цэсарэвіча Аляксея мужчынскай гімназіі. Шматлікія вершы К. Бальмонта, асабліва познія, навеяныя ўспамінамі аб Шуйскай зямлі.

Фестываль прайшоў з незвычайным размахам. Было падрыхтавана і выдадзена некалькі кніг самога паэта і кніг пра яго. Сярод запрошаных — госці не толькі расійскія, але і з замежжа. З ЗША прыехала васьмідзесяцігадовая дачка Бальмонта Святлана Канстанцінаўна Шаль.

Прайшлі Бальмонтаўскія чытанні, была адчыненая мастацкая выстава, выступалі дарослыя і школьнікі...

Кульмінацыяй мерапрыемстваў стала першае ўручэнне Усерасійскай літаратурнай прэміі імя К. Бальмонта. Яе ініцыятарамі былі іванаўскія пісьменнікі. Першымі лаўрэатамі сталі паэтка з Кірава С. Сырнева ды іванаўскія літаратуразнаўцы П. Купрыяноўскі (пасмяротна) і Н. Малчанава за кнігу «Поэт Константин Бальмонт. Биография. Творчество. Судьба».

# РАСІЙСКА-ГРУЗІНСКАЕ СЯБРОЎСТВА. ЛІТАРАТУРНАЕ...

Па ініцыятыве Міжнароднага культурна-асветніцкага саюза «Рускі клуб» у Тбілісі ў Міжнароднай федэрацыі расійскамоўных пісьменнікаў прайшоў першы расійска-грузінскі фестываль паэзіі. У памяшканні Батумскага тэатра і ў Грыбаедаўскім тбіліскім тэатры чытачы далучыліся да сучаснага расійскага літаратурнага працэсу. Літаратары абмяркоўвалі праблемы перакладу і ўзаемасувязяў расійскіх і грузінскіх паэтаў. Адмысловы поспех мелі маладыя грузінскія паэты. Аднаму з іх — Шота Іаташвілі — была прысуджана літаратурная прэмія Грузіі за лепшую паэтычную кнігу.

Грузінскі бок прадстаўлялі Фрыдон Халвашы, Вахтанг Глонці, Натан Баазаў, Звіад Раціані, Зураб Ртвеліашвілі, Котэ Кубанеішвілі, Ніка Гомелаўры, Алік Дарчыашвілі і інш. Па-расійску вершы чыталі Сяргей Гандлеўскі, Аляксей Цвяткоў, Барыс Херсонскі, Алена Ісаева, Аляксандра Пятрова, Таццяна Перцава, Рыма Маркава, Генадзь Норд, Алег Цыбенка, Юрый Кобрын, Артур Макараў, Валер Наваскольцаў, Аляксей Пурын, Анэліза Алеева і інш.

Удзельнікі паэтычнага фэсту пабывалі ў Хаце-музеі Чаўчавадзе ў Кахецыі, усклалі кветкі да магілы Аляксандра Грыбаедава і Ніны Чаўчавадзе, сустрэліся са студэнтамі Тбіліскага ўніверсітэта, прадэгуставалі напоі віна-каньячнага завода «Алаверды», сустрэліся з пісьменніцкай грамадскасцю Батумі, пабывалі на прыёме ў расійскай амбасадзе ў Тбілісі.

# ДНІ ШУКШЫНА



З 19 па 22 ліпеня ў Алтайскім краі (Барнавул-Бійск-Смаленскае-Зросткі) прайшлі XXXI Усерасійскія Шукшынскія дні. Культурны форум праводзіўся пад знакам абвешчанага прэзідэнтам Расійскай Федэрацыі Года расійскай мовы. 19 ліпеня ў Барнавуле адбылося ўрачыстае адкрыццё IX Усерасійскага Шукшынскага кінафестывалю. Яму папярэднічалі афіцыйнае падвядзенне вынікаў краявога конкурсу «Ціхая мая Радзіма» па творчасці Васіля Шукшына і канцэртная праграма «Музычнае прынашэнне Шукшыну». Затым культурная праграма была перанесеная ў Бійск (другі па велічыні горад Алтайскага краю). На гары Пікет прайшла традыцыйная мастацка-публіцыстычная праграма «Людзі, любасныя людзі, дабрыдзень»...

# ДЗЕСЯТАЯ САЛЖАНІЦЫНСКАЯ ПРЭМІЯ,

## АБО ФІЛАЛОГІЯ ЯК ТВОРЧАСЦЬ

Адным з лаўрэатаў юбілейнай, дзесятай, прэміі Аляксандра Салжаніцына сёлета стаў расійскі філолаг Сяргей Бачароў. Рашэнне было прынята журы аднагалосна.

Працам Бачарова ўласцівая наступная рыса: яны — працяг самой літаратуры. Бачароў перакананы, што літаратуразнаўства — гэта таксама літаратура, а філолаг — гэта таксама пісьменнік: ён не толькі мае справу са словам іншага пісьменніка, ён і сам працуе з уласным словам, без чаго яму не можа адкрыцца тое, што ён даследуе.

Цяпер філалогію расколваюць два падыходы: стаўленне да літаратуры як да гульні і ўтылітарнае стаўленне да яе як да сродку. Калі літаратура — гульня, бессэнсоўна шукаць у ёй высокае ўтрыманне і маральны патэнцыял. Калі літаратура — сродак дасягнення мэты, дык яна ўсяго толькі службовая, дапаможная сфера, якую можна «накіроўваць», выпраўляць і нават якой кіраваць. У сваіх працах Бачароў паказвае, як ідэалагічная філалогія з яе зададзенымі нарматывамі непазбежна прыходзіць да патрабавання «правільнага» вывучэння, а таксама імкнецца «папраўляць» пісьменніка і ягоны тэкст. Галоўны чыннік мастацтва, сцвярджае Бачароў, — у самім статусе мастацтва, у межах ягонай свабоды. Калі мастацтва ўпісана ў ідэалогію, дачыненне да яго будзе ўтылітарнае, а ўнутранае імкненне чалавека да творчасці — скаванае і несвабоднае.

Аб тым, што літаратура не гульня і не сродак, не правадыр і не пасярэднік, не рух і не шлях, а мэта (у тым самім Пушкінскім сэнсе: «мэта паэзіі — паэзія»), і гаворыць Бачароў. Ён абараняе годнасць мастацтва, яго суверэннасць, яго вольны статус не тады, калі ў творчасці мала свабоды, а тады, калі яе, гэтай свабоды, бяскрайне шмат. Гэтая безаглядная воля «без тармазоў і берагоў» ёсць галоўнае выпрабаванне для мастацтва.

Любая ідэалагічная філалогія перастае быць праблемнай і становіцца тэндэнцыйнай. Адрозненне паміж праблемным і канцэптуальным, як паказаў Бачароў, вызначае нерв сучаснай літаратурнай навукі, якая, ледзь пераадолеўшы адзін стэрэатып ідэалагічнай зададзенасці, накіравалася да іншага стандарту «недаверлівага чытання», вынішчаючы з творчасці пісьменніка (якога яна каментуе, тлумачыць, інтэрпрэтуе) усё праблемнае, няўзгодненае, негарманічнае.

Атрымоўваецца, што такімі, якімі пісьменнікі-класікі былі насамрэч, яны сёння не патрэбныя канцэптуальнаму ідэалагічнаму літаратуразнаўству, як былі не патрэбныя яны і афіцыйнаму савецкаму літаратуразнаўству. Занадта шырокі расійскі пісьменнік, і філолаг-ідэолаг яго б з задавальненнем павузіў: падправіў, прымайстраваў да нормы.

Салжаніцынскі лаўрэат абвясціў тэзіс, незвычайна важны для сучаснай філалогіі і крытыкі: праблемнасць абсалютная, канцэптуальнасць падазроная. Гэты тэзіс адпавядае духу расійскай літаратуры, якая складаецца не з адказаў і рэцэптаў, правілаў ды інструкцый, а з пытанняў.

Н. К.

РЭТРАДРУК

## Часопіс «Узвышша», 1927, № 1

**Ад беларускага літаратурна-мастацкага згуртавання «Узвышша»**

«<...> «Узвышша» беларускае мастацкае літаратуры творыцца ня колькасцю поэтаў і пісьменьнікаў, якія б асьмеліліся абвясьціць сябе каманднымі высотамі, а якасьцю тэй літаратурна-мастацкай прадукцыі, якая прыносіцца ў скарбніцу беларускай мастацкай літаратуры з глыбінь сучаснасьці, узброенай ведамі, воляю, шчырым жаданьнем і энтузіязмам вялікай творчасьці. Толькі так утворыцца тое ўзвышша беларускае пралетарскае літаратуры, якое ўгледзяць вякі і народы.

Установы: Кузьма Чорны, Адам Бабарэка, Зьмітрок Бядуля, В. Шашалевіч, Сяргей Дарожны (С. Серада), М. Лужанін, К. Крапіва, П. Глебка, Ул. Дубоўка, Я. Пушча».

**Я. Плашчынскі. Кніга лірыкі як мастацкае цэлае. «Вянок» М. Багдановіча**

«<...> у жыцьці кожнага поэты ёсьць хвіліны будзённыя, празаічныя, у якія ён нічым не адрозьніваецца ад кожнага «сьмертнага», але апрача гэтых — у поэты ёсьць і ўрачыстыя хвіліны, дадзеныя толькі яму, хвіліны яго эмацыянальнага жыцьця, у якія ўся яго істота ахоплена творчым полымем, у якім ён творыць новае жыцьцё і аздабляе яго васількамі красы, бо ж яна і зьяўляецца, фактычна, канчатковай мэтай творчасьці кожнага сапраўднага поэты. <...> гэта краса не для самое сябе, не для красы, а як вялікі сацыяльны чыньнік. Мастак слова-поэта, які хоча, каб творы яго адыгралі значную ролю, павінен схіляць чало перад красой. <...> кніга лірыкі павінна зьяўляцца ня простым, не выпадковым зборам вершаў, у якім папала парадку, але, як і сам верш, нечым арганічным, суцэльным і закончаным».

## «Узвышша», 1930, № 9–10

**Рэзалюцыя агульнага сходу «Узвышша» ад 30 лістапада 1930 г.**

«...Патрабуем жорсткай кары агентам міжнароднай буржуазіі ў Савецкай Беларусі — беларускім контррэвалюцыйным нацыянал-дэмакратам. Беларускаму нацыянал-дэмакратызму ўдалося пранікнуць у шмат якія галіны гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, дзе ён разгортваў сваю контррэвалюцыйную дзейнасць <...>. Ён пранік і ў літаратурнае згуртаваньне «Узвышша». У аснове яго былых лідэраў — Бабарэкі, Пушчы і Дубоўкі ды іх малодшых пабрацімцаў ён стараўся пашырыць свой уплыў на ўсё згуртаваньне і наклаў пэўны адбітак на працу згуртаваньня <...>.

Мы вітаем дбайнага вартаўніка рэвалюцыі — АДПУ, які выкрыў контррэвалюцыйную нацдэмаўскую арганізацыю. <...>

**Літаратурнае згуртаваньне «Узвышша»:**
**М. Лужанін, Т. Кляшторны, С. Дарожны, К. Чорны, Крапіва, А. Мрый, З. Бядуля, П. Глебка, Л. Калюга».**

## АДКАЗ

«У сённяшняга афіцыйнага дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь два аўтары слоў: Міхась Клімковіч і Уладзімір Карызна. Першы памёр у 1954 г. і пахаваны на Вайсковых могілках у Мінску. Як жа адбывалася сутворчасць і што аб тым гаворыць аўтарскае права? На дзень незалежнасці 3 ліпеня праводзілася патрыятычная акцыя па супольным выкананні гімну. Мяне рэзала слова «імя» з націскам на першы склад. Правільна ж па-беларуску «імЯ»? Ды і немагчыма ў песні вымавіць «сілы гартуеМ Мы ў працавітай… сям'і»!».

**Андрэй, студэнт гістфаку БДУ**

Закон аб аўтарскім праве не дазваляе каму-небудзь пераствoрваць, папраўляць ці перапісваць мастацкі тэкст без згоды аўтара.

У 1944 г. тэкст Максіма Клімковіча (першага старшыні Саюза пісьменнікаў) быў прызнаны дзяржаўным гімнам БССР. З тога часу згаданае «імя» і перайшло ў год 2007. Як і не толькі гэтае…

На працягу апошніх гадоў публічнае ўзгадванне пра «суаўтарства» тэкста афіцыйнага дзяржаўнага гімна было розным. Так, беларускае тэлебачанне мінулай вясной транслявала перадачу «Слова пісьменніка» з удзелам сучаснага суаўтара гімна Уладзіміра Карызны. Вядучы задаў яму пытанне і пра гімн. Паэт, распавядаючы пра сваю працу над тэкстам, ані словам не згадаў пра М. Клімковіча. Тое не прамінула адзначыць PDF-выданне «Свобода» (www.vilnia.com), якое працытуем: «Магчыма, тое, што сябра СПБ (праўладнага саюза, з Саюзу беларускіх пісьменнікаў у перадачу не запрашаюць)… прамаўчаў пра свайго папярэдніка — класіка бэсэсэраўскай паэзіі, тлумачыцца забыўлівасцю паэта ці творчай рэўнасцю. Але ж і вядучы таксама не згадаў імя Клімковіча».

Маладзейшыя, пэўна, ужо не памятаюць аўтэнтычнага тэксту М. Клімковіча, таму ўспомнім — і адзначым, што праз паўстагоддзя «стала лішнім»:

*Мы, беларусы, з братняю Руссю*
*Разам шукалі к шчасцю дарог.*
*У бітвах за волю, у бітвах за долю*
*З ёй здабылі мы сцяг перамог!*
*Нас аб'яднала Леніна імя,*
*Партыя к шчасцю вядзе нас*
*ў паход.*
*Партыі слава! Слава Радзіме!*
*Слава табе, беларускі народ!..*

## КНІЖНІЦА

**Як і раней, у рубрыцы падаюцца анонсы найбольш значных беларускіх кніг, якія прайшлі экспертызу часопіса «Дзеяслоў» (№ 3 (28) за 2007 г.).**

**Бабілёнская бібліятэка: Замежная літаратура ў перакладах «Нашай Нівы»/ Эдгар Алан По, О.Генры, Яраслаў Гашак і інш. — Мінск: І. П. Логвінаў, 2007. — 270 стар. — (Кнігарня «Наша Ніва»). Наклад 1000 ас.**




Больш за дваццаць аўтараў з найвялікшых літаратураў свету па-беларуску — найлепшы падарунак аматарам прыгожага пісьменства. Зборнік можна пачынаць чытаць з любога тэксту, з любога аўтара. Праўда, думаецца, невыпадкова ў кнігі няма рэдактара: тэксты, перакладзеныя дзясяткам розных асобаў, настолькі розняцца па стылі, па мове, па музыцы, што яднае іх толькі вокладка... Аднак, можа быць, гэта і добра: аўтары ж розныя...

**Ніна Гілевіч. Слова — роднае, жывое, свабоднае: Узоры жывой народнай мовы ў вуснах беларускай вёскі 1960-х — 1970-х гадоў. Менск: «Про Хрысто», 2007. — 216 стар. Наклад 100 ас.**

Выданне законна мусіць стаць падзеяй, чынам і прыкладам — пільнасці, дбайнасці, адказнасці, прафесійнасці, чуласці. Гэта другая кніга мованазнаўчай спадчыны Ніны Іванаўны Гілевіч (калі не лічыць яе




жывых кніг: тысячаў выхаваных і адораных педагогам філолагаў і філалагіняў). Россып народных выказванняў з многіх рэгіёнаў Беларусі, выразаў, разваг, думак, якія гучаць натуральна, непадробна, запамінальна, узорна. У іх — своеасаблівым народным эскізе-рамане — і нашая ментальнасць, псіхалогія, душа, мараль, эстэтыка, этыка, і забабоннасць, і неардынарнасць, непаўторнасць і тыповасць. А да ўсяго — у пункцірах прагаворaная храналогія нашага беларускага лёсу ў стагоддзевым абсягу. Вянчае тэксты прачулая рэдактарская прадмова апекуна кнігі — уароднага паэта Беларусі Ніла Гілевіча.

**Застаемся! Сакавік 2006: Прыватнае і агульнае. — Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2007. — 284 стар.; іл. — (Кнігарня «Наша Ніва»). Наклад 1000 ас.**

Безумоўна, гэта лепшая кніга пра падзеі Сакавіка 2006 года ў Беларусі, пра выбары і Беларускую Плошчу. Той, хто быў на Плошчы, узновіць у памяці падзеі, вернецца ў хвалі волі і надзеі; той, хто быў далёка, атрымае поўнае ўражанне аб тым, што ж было на самой справе, з усімі сумневамі і непрадказальнасцю, гераізмам і здрадай…




Кніга гэтая можа стаць асновай для будучых падручнікаў і мастацкіх твораў. Аснову зборніка склалі публікацыі «Нашай Нівы» і «Архэ».

**Антон Луцкевіч. Выбраныя творы: праблемы культуры, літаратуры, мастацтва/ уклад., прадм.,камэнт., індэкс імёнаў, пер. з пол. і ням. А. Сідарэвіча. — Мінск: Кнігазбор, 2006. — 460 стар. Наклад 500 ас.**




Даўно чаканая кніга — плён шматгадовай нястомнай працы Анатоля Сідарэвіча. Важкая асоба — важкая кніга. Пад адною вокладкаю сабраная большасць тэкстаў А.Луцкевіча, прысвечаных праблемам культуры, літаратуры і мастацтва, і на нашых вачах палітычны дзяяч пераўтвараецца ў даследчыка, які «ў гісторыі айчыннай літаратурна-мастацкай крытыкі і літаратуразнаўства 1910-1930-х гг. заняў цэнтральнае месца...».

**Ядвігін Ш. Выбраныя творы. Мінск: Мастацкая літаратура, 2006. — 239 стар. Наклад 2500 ас.**




Апошні раз творы класіка і пачынальніка беларускай літаратуры Ядвігіна Ш., аўтара першага беларускага рамана «Залата», выдаваліся трыццаць гадоў таму. «Мастацкая літаратура» зрабіла добрую справу. Вось так бы і далей. Жывым класікам дарога ў выдавецтва заказаная, дык будзем хоць згадваць тых, каго даўно няма, але хто варты кніг ды кніг.

## ПАВАЖАНЫЯ СЯБРЫ!

Калі вы і надалей хочаце чытаць выпускі «ЛІТАРАТУРНАЙ БЕЛАРУСІ», вам неабходна зрабіць папярэднюю перадаплату на «НОВЫ ЧАС» (бланкі квіткоў друкуюцца ў газеце).

«ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» у такім фармаце (16 старонак) будзе з'яўляцца штомесяц у апошнюю пятніцу.

Пры жаданні вы можаце аформіць падпіску толькі на асобныя нумары з літаратурным выпускам.

Кошт аднаго нумара газеты — 500 рублёў.

Да сустрэчы!

## АКЦЫЯ

# «БУДЗЬМА РАЗАМ!»

**Грамадскае аб'яднанне «Саюз беларускіх пісьменнікаў» распачынае акцыю «Будзьма разам!» і запрашае да супрацы ўсе зацікаўленыя культурніцкія арганізацыі, аб'яднанні, установы, гурткі. Мэта акцыі — выяўленне ў рэгіёнах краіны маладых талентаў, творчая, інтэлектуальная, маральная ды арганізацыйная дапамога ім.**

Мы заклікаем адгукнуцца кіраўнікоў літаратурных аб'яднанняў універсітэтаў, гімназій і школ усіх рэгіёнаў Беларусі, а таксама маладых пачаткоўцаў. Дасылайце свае каардынаты, творы, прапановы, пытанні і просьбы на адрас: 220012, Мінск, завулак Інструментальны, д.6, пак. 214.

Пасля агульнарэспубліканскага маніторынгу вас чакаюць майстаркласы вядомых беларускіх пісьменнікаў, прафесійныя дыспуты, падтрымка, сяброўскія экскурсіі і вандроўкі, публікацыі ў друку.

Будзьма разам!

**Сакратарыят Саюза беларускіх пісьменнікаў**

**«Літаратурная Беларусь» — гэта супольны праект Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў», гэта альтэрнатыва адабранаму ў яго і цяпер падкантрольнаму штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва».**

**Гэта фармаванне незалежнай творчай думкі нацыянальнай эліты.**

**Гэта імкненне супрацьстаяць татальнаму замоўчванню вольнага мастацкага слова ў дзяржаўных СМІ.**

**Гэта свабодная трыбуна паэтаў, празаікаў, драматургаў, крытыкаў і чытачоў Беларусі.**

**Гэта напамін аб тым, што Беларусь — і дзяржаўная, і літаратурная — створана пісьменнікамі, і яна патрабуе іхняй працы і апантанасці.**

**«Літаратурная Беларусь» — новы час чытання.**

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА. Тэлефон для даведак: (8-017) 294-03-48. Мінск, вул. Фрунзе, 5, п. 307.
Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by